# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

Вучэбны дапаможнік для 9 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй прафесара, доктара філасофскіх навук
М. І. Вішнеўскага

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Мінск
"Адукацыя і выхаванне"
2009

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

УДК 3(075.3=161.3)
ББК 60я721
Г76

А ў т а р ы: М. І. Вішнеўскі, В. М. Гірына, С. А. Данілевіч, Т. М. Кавалёва, Т. М. Кузьміна, А. І. Шалашкевіч.

П е р а к л а д з рускай мовы *М. В. Супрунчука.*

Р э ц э н з е н т ы: кафедра філасофіі культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта (кандыдат філасофскіх навук, дацэнт *А. В. Бяляева*); настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай катэгорыі СШ № 15 г. Мінска *А. І. Румянцаў*; доктар палітычных навук, прафесар, загадчык кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта *С. В. Рашэтнікаў*; настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі, дырэктар Жодзінскага гістарычна-краязнаўчага музея *І. Ю. Супрановіч*.

Адукацыя і выхаванне

**Грамадазнаўства** : вучэб. дапам. для 9-га кл. агульнаадука-
Г76 кац. устаноў з беларус. мовай навучання / М. І. Вішнеўскі [і інш.] ; пад рэд. М. І. Вішнеўскага ; пер. з рус. мовы М. В. Супрунчука. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. — 208 с. : іл.
ISBN 978-985-471-304-5.

**УДК 3(075.3=161.3)**
**ББК 60я721**

**ISBN 978-985-471-304-5**

© Супрунчук М. В., пераклад на беларускую мову, 2009
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2009

Праваабладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Уводзіны

**Праблема чалавека — ключавая праблема сучаснасці.** Мы жывём у няпросты і вельмі цікавы час. На нашых вачах адбываюцца вялікія змены ў жыцці людзей. Яны закранаюць цэлыя краіны і народы. Імкліва ўдасканальваюцца сродкі сувязі, і мы ўжо прызвычаіліся размаўляць з чалавекам ці чытаць кнігу з бібліятэкі, якія знаходзяцца на іншым кантыненце. Значна выраслі магчымасці вытворчасці матэрыяльных даброт, задавальнення самых розных чалавечых патрэбнасцей. Разам з тым у жыцці людзей па-ранейшаму існуюць вельмі вострыя праблемы. Вялізныя рэгіёны пакутуюць ад голаду, галечы і цяжкіх хвароб, у многім звязаных з беднасцю. Некаторыя дзяржавы імкліва вырываюцца наперад у эканамічным і навукова-тэхнічным развіцці, іншыя ж застаюцца быццам на абочыне прагрэсу. Разрыў паміж «багатымі» і «беднымі» краінамі працягвае павялічвацца. У цэлым сучаснае развіццё чалавецтва крайне нераўнамернае і супярэчлівае.

Наша Радзіма — Рэспубліка Беларусь — параўнальна невялікая краіна. Незалежнай дзяржавай яна стала нядаўна, і мы, беларусы, шануем магчымасць самастойна выбіраць свой шлях, вызначаць сваю будучыню. Гэты выбар, бясспрэчна, не з'яўляецца адвольным ці выпадковым. Шматвяковая гісторыя беларускага народа, яго цесныя сувязі з рускім і іншымі блізкімі нам народамі ўзбагацілі нас ведамі і вопытам, якія дазваляюць больш эфектыўна будаваць сваё жыццё. Гэтыя веды і вопыт з'яўляюцца дасягненнем не толькі вучоных і спецыялістаў. Наша культура — вынік намаганняў мноства сумленных і старанных людзей, чыя дзейнасць пранізана клопатам пра агульнае шчасце, пачуццём уласнай годнасці, павагай да добрасумленнай працы і імкненнем

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Праспект Незалежнасці ў Мінску*

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

да духоўнага і культурнага росту, удасканалення. Гэтыя веды і вопыт — наша галоўнае багацце. Школа павінна перадаць іх новаму пакаленню, якое ўступае ў жыццё і заклікана яго палепшыць.

Задача курса грамадазнаўства, вывучэнне якога вы пачынаеце, заключаецца ў тым, каб паведаміць вам асноўныя, найбольш важныя для жыцця звесткі пра грамадства. Наш прадмет раскрые тыя патрабаванні, якія прад'яўляе чалавеку сучасная сацыяльная рэчаіснасць, дапаможа засвоіць правілы і нормы культуры, грамадзянскасці і правапарадку, законы эканомікі, без ведання чаго цяжка выпрацаваць свядомую і адказную грамадскую пазіцыю.

Веды, якія будуць вам прапанаваны, не з'яўляюцца нейкімі сухімі адцягненымі звесткамі. Бо грамадства — гэта людзі, аб'яднаныя сумесным жыццём. Спасцігнуць грамадства азначае зразумець жыццё людзей, выявіць яго асноўныя бакі і сувязі між імі. Безумоўна, для гэтага неабходна выкарыстоўваць некаторыя спецыяльныя

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

паняцці, выпрацаваныя навукай. Іх засваенне запатрабуе пэўных намаганняў, але галоўнае — не выпускаць з-пад увагі асноўную думку: пазнанне грамадства ёсць аднaчасова пазнанне людзьмі саміх сябе. Мноства сувязей паміж людзьмі стварае грамадства як асаблівую складана арганізаваную сістэму. Кожнага чалавека таксама можна ўявіць у якасці складанай сістэмы, якая развіваецца, змяняецца на працягу ўсяго жыцця.

Ад таго, як людзі разумеюць тое, што адбываецца, як будуюць адносіны паміж сабой, якія ставяць мэты і як рэальна дзейнічаюць для іх дасягнення, залежыць у канчатковым выніку цяперашні стан грамадства і яго будучыня. Поспехі і праблемы грамадства, у якім мы жывём, абумоўлены найперш ступенню сталасці і адказнасці людзей у ім. Менавіта таму пытанне пра сутнасць і прызначэнне чалавека — галоўнае і ў навуцы, і на практыцы. Яго немагчыма вырашыць адны́мі толькі развагамі і сухімі аб'ектыўнымі даследаваннямі. Строгая логіка павінна дапаўняцца цеплынёй чалавечай душы, саграваццa нашым пачуццём. Чалавек — гэта не прадмет, пазбаўлены перажыванняў, імкненняў і намераў, а суб'ект, які мае свядомасць і здольны ставіць перад сабой мэты на аснове разумення рэчаіснасці. Пазнаючы жыццё грамадства, мы змяняемся самі і набываем больш сталы і адказны погляд на свет.

**Навукі пра чалавека і навукі пра грамадства.** Чалавек і грамадства вывучаюцца ў розных аспектах многімі навукамі. Нават простае іх пералічэнне заняло б нямала месца. У кожнай з гэтых навук выкарыстоўваецца адмысловы паняційны апарат, назапашана шмат фактаў і абагульненняў, сфарміраваліся пэўныя традыцыі даследавання, вядуцца дыскусіі. Немагчыма і нават непатрэбна спрабаваць змясціць усё гэта ў школьны навучальны прадмет «Грамадазнаўства», які ўключае толькі зыходныя паняцці пра найважнейшыя сферы жыцця чалавека і грамадства.

Матэрыял дзевятага класа курса «Грамадазнаўства» адкрываецца тэмай, у якой сцісла характарызуецца грамадская сутнасць чалавека. Зыходная думка тут такая:

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

у жыцці грамадства навука вылучае наступныя сферы: эканамічную, сацыяльную, палітыка-прававую і духоўную. Яны ж прысутнічаюць і ў жыцці кожнага асобнага чалавека, бо ўсе мы ўключаны ў эканамічную і духоўную дзейнасць свайго грамадства, у сацыяльныя сувязі паміж людзьмі, у жыццё дзяржавы. Чалавек тут разглядаецца як асоба з пэўнай накіраванасцю, тэмпераментам і характарам. Другая тэма ўводзіць у кола пытанняў, звязаных з культурай чалавека і грамадства. Культура характарызуе своеасаблівасць чалавека, адметны спосаб яго жыцця, які адрозніваецца ад біялагічнага. Вось чаму ў гэтай тэме прыведзены некаторыя звесткі з культуралогіі. Трэцяя тэма — пра міжасабовыя зносіны. Для падлеткаў яна асабліва цікавая і павучальная. А заканчвае праграму дзевятага класа тэма пра чалавечую маральнасць.

Адбор зместу вызначаны тым, што дзевятым класам завяршаецца базавая школа і па яе заканчэнні вам трэба мець папярэднія звесткі пра агульную арганізацыю грамадскага жыцця і сутнасць чалавека. У дзесятым класе эканамічная, сацыяльная, палітыка-прававая і духоўная сферы жыцця грамадства будуць разгледжаны больш грунтоўна. У адзінаццатым класе галоўным стане пытанне пра беларускую дзяржаву і грамадства. Абапіраючыся на веды, атрыманыя ў папярэдніх класах, вы зможаце больш глыбока вывучыць канстытуцыйны лад Рэспублікі Беларусь, дзяржаўна-прававыя асновы нашага грамадства, эканамічную і сацыяльную палітыку беларускай дзяржавы, ролю і месца нашай краіны ў сучасным свеце. Веданне гэтых пытанняў — неабходная перадумова дасягнення асобаснай і грамадзянскай сталасці. Толькі сталая, духоўна багатая і сацыяльна адказная асоба здольна сваёй працай, творчым стаўленнем да справы забяспечыць росквіт нашай Радзімы.

Падручнік, які вы трымаеце ў руках, аўтары стараліся зрабіць пазнавальным, цікавым, павучальным. Галоўныя паняцці вылучаны колерам, другасныя — курсівам. Усе параграфы ўтрымліваюць пытанні і заданні, якія дапамогуць глыбей зразумець вучэбны матэрыял. Пасля

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

асноўнага матэрыялу кожнай тэмы змешчаны дадатковыя тэксты: урыўкі з дакументаў, заканадаўчых актаў, успамінаў відавочцаў і г. д. Праца з імі пашырыць вашы веды, навучыць аналізаваць, параўноўваць, рабіць высновы.

У канцы навучальнага дапаможніка змешчаны слоўнічак, дзе прыведзены асноўныя паняцці, а таксама даецца спіс літаратуры для дадатковага чытання.

### Некаторыя высновы

1. Для таго каб свядома і адказна рабіць жыццёвы выбар, вызначаць грамадзянскую пазіцыю, чалавек павінен авалодаць асноватворнымі ведамі пра жыццё грамадства. 2. Пазнанне чалавекам жыцця грамадства ёсць адначасова пазнанне ім самога сябе, сваёй сутнасці і свайго прызвання. Таму існуе цесная сувязь паміж навукамі пра чалавека і навукамі пра грамадства.

?!

***Пытанні і заданні***

1. У чым заключаецца задача вучэбнага курса «Грамадазнаўства»?
2. Як вы лічыце, ці існуе асобная навука пад назвай «грамадазнаўства»? Адказ абгрунтуйце.
3. Якія навукі, на ваш погляд, асабліва патрэбны для вывучэння сутнасці чалавека і грамадства?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# ТЭМА 1. Грамадская сутнасць чалавека

## § 1. Чалавек як асоба

**Чалавек — біясацыяльная істота.** Чалавек з'яўляецца неад'емнай часткай прыроды. Яму, як і любому іншаму біялагічнаму арганізму, уласцівы самарэгуляцыя, абмен рэчывам, энергіяй і інфармацыяй з навакольным асяроддзем. Біялагічны бок жыцця чалавека характарызуе асаблівасці будовы і функцыянавання яго арганізма, работу яго органаў пачуццяў, найпрасцейшыя псіхічныя рэакцыі. Як і іншыя жывыя істоты, чалавек можа быць здаровым ці хворым. Стан яго здароўя шмат у чым залежыць ад умоў жыцця, у тым ліку ад прыроднага асяроддзя. Чалавечая псіхіка, якая ахоплівае сукупнасць нашых унутраных станаў, з'яў унутранага свету (адчуванняў, перажыванняў, эмоцый і г. д.), таксама мае біялагічную аснову.

Прыроджаныя, ці ўнаследаваныя, якасці адбіваюцца на здольнасцях і характары чалавека як асобы. Разам з тым, у адрозненне ад жывёл, чалавек мае высокаарганізаваны мозг, мысленне і членараздзельнае маўленне. З гэтым звязаны ўменні ствараць прылады працы і ператвараць умовы, у якіх жывеш, здольнасць творча відазмяняць навакольны свет, ствараць культурныя каштоўнасці, займацца самапазнаннем і самаразвіццём, выпрацоўваць духоўныя арыенціры ўласнага жыцця. Біялагічныя бакі жыцця чалавека адчуваюць на сабе рэгулюючае ўздзеянне правіл і нормаў культуры, выпрацаваных у працэсе гістарычнага развіцця грамадства.

Прырода існуе і развіваецца па сваіх законах, якія чалавек не можа адмяніць. Аднак сваёй дзейнасцю ён стварае «другую прыроду», надбудаваную над натуральным асяроддзем пражывання. Людзі, грамадства з'яўляюцца як пераўтваральнікамі прыроды, так і творцамі, стваральнікамі культуры. Галоўная якасць чалавека — грамадская

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

(сацыяльная), і заключаецца яна ў здольнасці засвойваць дасягненні культуры, усвядомлена ўключацца ў жыццё грамадства, быць яго суб'ектам. Нагадаем: суб'ектам завуць таго, хто дзейнічае ўсвядомлена і можа адказваць за тое, што робіць.

**Паняцце асобы.** Паняцце «індывід» адносіцца да чалавека як да асобнай, адзіночнай істоты і выяўляе яго прыналежнасць да чалавечага роду. Прыкметы індывіда выяўляюць перш-наперш біялагічную своеасаблівасць чалавека (пол, узрост, рост, вагу, колер валасоў, вачэй і да т. п.). Індывідам нараджаюцца, а асобай становяцца. Асоба — гэта сацыяльны індывід, паколькі ён уключаны ў зносіны з іншымі людзьмі, у сістэму грамадскіх адносін і дзейнасці.

Слова «асоба» добра знаёма кожнаму з вас. Аб некаторых людзях можна сказаць: «яркая асоба», «вядомая асоба». Часам мы чуем іншае: «невыразная асоба» або нават «злачынная асоба». Усё гэта можна гаворыць менавіта пра



Мэры Кэсет. *Немаўля, якое спіць* (1910)

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

людзей, таму што паняцце «асоба» прымяняльнае толькі да чалавека.

Але ці можам мы назваць асобай нованароджанае дзіця? Яно бясконца дарагое сваім бацькам, пра яго клапоцяцца і яго апякуюць, але асобай яго называць, мабыць, рана. Асобай яно яшчэ павінна стаць. Для гэтага яму трэба будзе шмат чаму навучыцца, асвоіць патрэбныя для жыцця ўменні і навыкі, далучыцца да культуры і атрымаць здольнасць дзейнічаць самастойна і ўсвядомлена, адказваць за ўсё, што яно робіць. Значыць, паняцце асобы выяўляе не проста прыналежнасць да чалавечага роду, а наяўнасць у чалавека пэўных якасцей, якія сведчаць аб яго здольнасці жыць сярод людзей, выконваць адпаведныя абавязкі.

*Асоба* — гэта цэласная сацыяльная якасць чалавека. Яна заключаецца ў здольнасці чалавека быць свядомым суб'ектам адносін і дзейнасці, г. зн. у здольнасці разумець сябе і навакольных, асэнсавана дзейнічаць, удзельнічаючы ў жыцці грамадства, і адказваць за свае ўчынкі.

Кожная асоба індывідуальная. Пад *індывідуальнасцю* разумеюць адметныя біялагічныя, псіхалагічныя і сацыяльныя якасці чалавека. Да іх адносяць перш за ўсё тэмперамент, характар і здольнасці чалавека. Гэтыя якасці надаюць непаўторнасць, арыгінальнасць кожнай асобе, выяўляюцца ў яе паводзінах, зносінах з людзьмі. Так, асоба энергічная і рухавая па сваім тэмпераменце, цвёрдая, жорсткая па характары, з яркімі здольнасцямі да якоганебудзь віду дзейнасці заўважна адрозніваецца ад асобы марудлівай па тэмпераменце, спакойнай і мяккай па характары, якая звычайна дэманструе здольнасці да іншага, чым першая, віду дзейнасці. Ці, скажам, адзін чалавек запамінае складаную інфармацыю хутка і трывала, а іншы нават лягчэйшыя звесткі засвойвае марудна і з цяжкасцю. У гэтым выпадку праяўляюцца індывідуальныя адрозненні памяці.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Свядомасць і дзейнасць.** Каб быць асобай, чалавек павінен мець *свядомасць*, у тым ліку *самасвядомасць* — усведамленне таго, што ён з сябе ўяўляе.

*Свядомасць* — гэта ўласцівая чалавеку здольнасць аднаўляць рэчаіснасць у думках і вобразах, разумець тое, што адбываецца, і асэнсавана, мэтанакіравана дзейнічаць.

Мы ўсведамляем нешта ў тым выпадку, калі можам паставіць і вырашыць пытанні: што іменна адбываецца, як гэта можна расцэньваць, што ў сувязі з гэтым трэба рабіць?

Свядомасць уключае ў сябе, па-першае, пазнанне (спасціжэнне) рэчаіснасці. Дзякуючы яму ў нас фарміруюцца думкі, вобразы, якія адлюстроўваюць уласцівасці пазнаных з'яў, працэсаў. Гэтыя думкі і вобразы ідэальныя, а не матэрыяльныя, г. зн. іх нельга ні ўбачыць, ні памацаць, хоць яны і адлюстроўваюць матэрыяльны свет. Мысленны вобраз самалёта не з'яўляецца рэальным самалётам, але між імі ёсць падабенства. Свядомасць немагчымая без ведаў. Нашы веды не супадаюць з пазнанымі прадметамі, а толькі часткова і ў ідэальнай форме ўзнаўляюць іх. Найвышэйшая форма пазнання свету чалавекам — гэта навука. У працэсе развіцця яна дае ўсё больш дакладнае, правільнае адлюстраванне рэчаіснасці.

Па-другое, свядомасць прадугледжвае ацэнку чалавекам таго, што ён бачыць ці абдумвае. *Ацэньваць* азначае вызначаць сваё стаўленне да нечага, суадносіць гэты прадмет ці з'яву з нашымі ўяўленнямі пра належнае, з нашымі інтарэсамі і жаданнямі. Наша свядомасць абавязкова ўключае ў сябе каштоўнасці і ідэалы, правілы і нормы жыцця, якіх мы прытрымліваемся.

Ацаніўшы тое, што адбываецца, мы вызначаем, што можам і павінны рабіць. Свядомасць нельга аддзяліць ад жыццядзейнасці. У чыстым выглядзе, у адрыве ад дзейнасці, свядомасць выраджаецца ў пустыя мары і мроі. Гістарычна яна ўзнікла ў працэсе сумеснай дзейнасці людзей і іх зносін пры дапамозе мовы. Змяняючы, пераўтвараючы працай рэальныя ўмовы жыцця, чалавек змяняўся і ўнутрана, развівалася яго свядомасць.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Дзейнасць* — гэта характэрнае для чалавека актыўнае, мэтанакіраванае стаўленне да навакольнага свету і самога сябе.

У працэсе дзейнасці людзі перш за ўсё змяняюць навакольныя прадметы, умовы жыцця. Такую дзейнасць называюць *практычнай*. Яе аснову складае чалавечая праца. Разам з тым існуюць розныя віды *духоўнай дзейнасці*, у выніку якой пераўтвараецца чалавечая свядомасць, выпрацоўваюцца ці засвойваюцца новыя веды, ствараюцца мастацкія творы, вылучаюцца маральныя, рэлігійныя, філасофскія, палітычныя ідэі і г. д.

Чалавек як асоба праяўляе свае якасці менавіта ў дзейнасці і ў адносінах з людзьмі. Ад таго, як мы вучымся і працуем, як ставімся да іншых і да саміх сябе, да сваёй краіны, свайго народа, залежыць, у якім кірунку змяняецца, развіваецца наша асоба.

Чалавечая дзейнасць ажыццяўляецца дзякуючы таму, што ў кожнага індывіда ёсць мноства здольнасцей. Кожная спецыяльная здольнасць мае вядучыя і дапаможныя бакі. Так, вядучую ролю ў літаратурных здольнасцях адыгрываюць творчая фантазія і мысленне, яркасць і нагляднасць вобразаў памяці. Дапаможнае, хаця і вельмі важнае значэнне тут маюць адчуванне правільнасці пабудовы маўлення, сталасць эстэтычных пачуццяў. Вядучыя бакі ў матэматычных здольнасцях — уменне аналізаваць і абагульняць, а таксама гібкасць працэсаў мыслення, лёгкасць пераходу ад прамога да адваротнага ходу думак; дапаможныя — хуткасць мысліцельных працэсаў, самастойнасць і арыгінальнасць мыслення.

Здольнасці, якія развіліся, могуць змяніць і нашы інтарэсы, надаць ім новую скіраванасць. Так, многія людзі, якія паспяхова рэалізавалі сябе ў навуцы ці мастацтве, пачынаюць затым праяўляць інтарэс да жыцця грамадства ў цэлым, у тым ліку да палітычных яго аспектаў, таму што яны глыбей усведамляюць іх значнасць.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Вядомы псіхолаг Карл Роджэрс*

**Самапазнанне асобы.** У школьным узросце кожны з вас пачынае сур'ёзна ставіць перад сабой пытанні «Хто я?», «Што я магу ў гэтым жыцці?», «Кім я хачу стаць?» і інш. Звярніце ўвагу: ва ўсіх гэтых пытаннях прысутнічае займеннік «я». Ужываючы яго, мы тым самым звяртаемся да свайго ўнутранага свету, спрабуем вылучыць і прааналізаваць свае магчымасці, веды, уменні, здольнасці і шмат што яшчэ, каб зразумець, як можна іх выкарыстаць на карысць не толькі сабе, але і іншым. Такі аналіз уласнага ўнутранага свету падводзіць чалавека да ўсведамлення самога сябе. Вынікам гэтага ўсведамлення з'яўляецца вобраз уласнага «я», ці «Я-канцэпцыя», якую даследаваў К. Роджэрс (1902—1987).

Пра пачатак фарміравання «Я-вобраза» можна судзіць па фразах, якія з'яўляюцца ў маўленні 2–3-гадовага дзіцяці: «Я», «Я сам», «Я хачу». Гэта значыць, што дзіця пачынае ўсведамляць уласныя дзеянні. Яно адрознівае свае дзеянні ад дзеянняў іншых людзей. Дзіця пачынае вылучаць сябе з навакольнага асяроддзя і адрозніваць сябе ад іншых.

Цэнтрам самасвядомасці з'яўляецца «Я-канцэпцыя». *«Я-канцэпцыя»* — гэта ўяўленне чалавека пра свае паводзіны, характар, знешнасць, вартасці і недахопы. Складаецца яна з разнастайных «Я-вобразаў». «Я-ідэальнае» ўключае якасці, якія звычайна цэняцца сябрамі і бацькамі, настаўнікамі і іншымі аўтарытэтнымі людзьмі. «Я-рэальнае» і «Я-ідэальнае» неабавязкова супадаюць, між імі магчыма супярэчнасць ці неадпаведнасць. Чалавек можа так і не дасягнуць свайго ідэалу, але ўпарта імкнуцца да яго на працягу ўсяго жыцця.

Важным складальнікам «Я-канцэпцыі» з'яўляецца *самаацэнка*, г. зн. уласная ацэнка асобай сваіх якасцей, здольнасцей і ўчынкаў. Яна праяўляецца ўжо ў раннім

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

дзяцінстве і фарміруецца на аснове ацэнак, якія дарослыя даюць дзіцяці. «Ты добры хлопчык?» — пытаюць у малыша. «Добры, таму што так кажа выхавацелька» ці «Добры, таму што я слухаюся маму», — адказвае ён. У працэсе развіцця асобы ўяўленні пра сябе і адпаведныя самаацэнкі фарміруюцца шляхам параўнання сябе з іншымі людзьмі: «Я такі ж спрытны, як і мае аднакласнікі» ці «У гэтай сітуацыі я паступіў бы па-іншаму, не так, як яны» і да т. п.

Самаацэнка можа быць высокай і нізкай. І тут шмат што залежыць ад дарослых, якія выхоўваюць дзіця. Так, калі бацькі абкружаюць дзіця любоўю, клопатам, увагай, вераць у яго сілы і магчымасці, хутчэй за ўсё, у яго сфарміруецца высокая самаацэнка і пазітыўная «Я-канцэпцыя». Дзеці з нізкай самаацэнкай адрозніваюцца няўпэўненасцю, дрэнным меркаваннем пра сябе. У далейшым гэта можа перашкаджаць ім дасягнуць поспеху ў жыцці, наладзіць добрыя адносіны з людзьмі.

**Некаторыя высновы**

1. Асоба — гэта сацыяльная якасць. 2. Чалавечая індывідуальнасць характарызуецца спецыфікай фізічных асаблівасцей, асобасных уласцівасцей, псіхалагічных рыс. 3. «Я-канцэпцыя» з’яўляецца цэнтрам самасвядомасці і складаецца з шэрага «Я-вобразаў». 4. Пазітыўная самаацэнка спрыяе больш паспяховай адаптацыі асобы да зменлівых умоў жыцця.

?! ***Пытанні і заданні***

1. У якіх значэннях ужываецца слова «асоба»?
2. У чым заключаецца грамадская (сацыяльная) якасць чалавека?
3. Што такое індывідуальнасць? Прывядзіце прыклады асоб з рознымі індывідуальнымі якасцямі (з гісторыі, літаратуры, школьнага жыцця).
4. Што такое свядомасць? Як звязаны паміж сабой свядомасць і веды, свядомасць і дзейнасць? Як вы лічыце,

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ці магчыма развіццё свядомасці па-за дзейнасцю, па-за зносінамі?
5. Што такое «Я-канцэпцыя» і як яна ўплывае на жыццё чалавека?
6. Разгледзьце «Я-вобразы» свядомасці асобы, якія яна перажывае найчасцей:
«Я-рэальнае» — які я ёсць насамрэч;
«Я-ідэальнае» — якім бы я хацеў быць;
«Я-ўяўнае» — які я ў сваім марах;
«Я-фізічнае» — мой знешні выгляд;
«Я-чаканае» — якім, на маю думку, мяне ўспрымаюць навакольныя;
«Я-акадэмічнае» — які я ў навучальнай дзейнасці.
Ахарактарызуйце сябе на аснове гэтых «Я-вобразаў».

## § 2. Характар і тэмперамент чалавека

**Сутнасць характару.** Не кожны ўчынак ці намер чалавека поўна і дакладна выяўляюць яго характар. Чалавек здзяйсняе розныя ўчынкі. Многія з іх з'яўляюцца выпадковымі, неўласцівымі яму. Так, калі вы аднойчы не ўступілі месца ў аўтобусе сталаму чалавеку, гэта яшчэ не значыць, што вы праявілі непавагу да яго. Магчыма, вы кепска сябе адчувалі. Але калі ў падобных сітуацыях вы так робіце заўсёды, то гэта ўжо характэрны для вас учынак, брыдкая звычка, якая сведчыць пра нявыхаванасць.

*Характар чалавека* — гэта сукупнасць яго адносна ўстойлівых уласцівасцей, якія выяўляюцца ў дзеяннях і ўчынках.

Характар вызначаецца не толькі тым, што чалавек робіць, але і тым, я́к ён гэта робіць, якія мэты выбірае для сябе. Словы, жэсты, дзеянні, калі паставіцца да іх уважліва, расказваюць пра паводзіны ў цэлым і дазваляюць зразумець характар чалавека.

**Тыпы і рысы характару.** Кожная эпоха, кожная культура параджае свае характары. Тыповыя рысы характару, агульныя для многіх людзей, вызначаюцца тымі гістарычнымі ўмовамі, у якіх яны жывуць і дзейнічаюць.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Разам з тым характар як індывідуальная асаблівасць чалавека параджаецца спецыфічнымі, непаўторнымі сітуацыямі, у якіх праходзіць яго жыццё, ажыццяўляецца выхаванне і самавыхаванне.

Уласцівасці і ўстойлівае стаўленне чалавека звычайна называюць *рысамі* яго *характару*. Характар уключае дзве асноўныя групы рыс. Да першай адносяцца тыя, у якіх выяўляецца стаўленне чалавека да навакольнай рэчаіснасці, да іншых людзей і да самога сябе, да даручанай справы. Другая група ўключае валявыя рысы, якія вызначаюць уменне і гатоўнасць кіраваць сваімі паводзінамі.

Вядомы швейцарскі псіхолаг К. Г. Юнг (1875—1961) вылучыў два асноўныя тыпы тэмпераменту. Яны адрозніваюцца пераважнай скіраванасцю на знешні ці на ўнутраны свет чалавека. Першы тып маюць *экстраверты* (ад лац. extra — па-за, звонку і verto — паварочваю) — людзі, чые галоўныя інтарэсы звернуты на знешні свет і дзейнасць у ім. Такіх людзей адрознівае актыўнасць, таварыскасць, імкненне дасягнуць поспеху і грамадскага прызнання, пераважная ўвага да навакольных прадметаў і ўласцівасцей.

Другі тып — у *інтравертаў* (ад лац. intro — унутр і verto — паварочваю), чый галоўны інтарэс скіраваны на іх унутраны свет, на ход думак і перажыванняў. Такія людзі імкнуцца пазбягаць празмерных сустрэч, гутарак і схільныя да самазаглыблення; рэчы і знешнія прыкметы поспеху іх мала цікавяць. У «чыстым» выглядзе экстравертныя і інтравертныя характары сустракаюцца нячаста; звычайна адпаведныя рысы характару пераважаюць у тых ці іншых адносінах.

У залежнасці ад ступені развіцця валявых рыс адрозніваюць моцныя і слабыя тыпы характару. Слабахарактарнасць — адмоўная якасць, нават калі яна спалучана з добрымі намерамі і правільным разуменнем наяўных задач. Без патрэбнай настойлівасці, паслядоўнасці і ўпартасці ні адна з пастаўленых мэт так і не будзе дасягнута.

**Шляхі фарміравання характару.** Характар не даецца чалавеку поўнасцю гатовым ад прыроды. Праўда, ён пачынае

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Поль Шарль Чакарн-Маро.* Непрыемны сюрпрыз (пач. XX ст.)

праяўляцца ўжо ў маленькіх дзяцей, якія, як правіла, стараюцца ўсё рабіць па-свойму. Упартасць, уласцівая дзецям, асабліва ва ўзросце каля трох гадоў, з'яўляецца першым парасткам будучага характару. Бясспрэчна, пустая ўпартасць — непрыемная рыса, але важна тое, што ва ўпартасці дзіця падкрэслівае сваю самастойнасць. З часам яна можа развіцца ў такую важную рысу характару, як настойлівасць у дасягненні пастаўленай мэты.

Цвёрды характар азначае здольнасць чалавека супрацьстаяць знешнім уплывам, выпрацоўваць уласнае разуменне таго, што трэба рабіць, і паслядоўна дабівацца намечанага. Такі характар дазваляе чалавеку быць самастойнай асобай.

Калі ў чалавека характар склаўся, стаў цвёрдым, ён здольны ажыццяўляць самафарміраванне. Ён можа выявіць уласныя недахопы і будзе старацца пазбавіцца ад іх, адначасова ўзмацняючы тыя станоўчыя якасці, якія дадзены яму ад прыроды. Так, вядомы рускі палкаводзец

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

А. В. Сувораў ад нараджэння быў вельмі хваравіты. Загартоўваючыся і трэніруючыся, ён змог умацаваць сваё здароўе і разам з тым выхаваць у сабе мужнасць, рашучасць і вынаходлівасць, якія дазволілі яму стаць таленавітым военачальнікам.

Такім чынам, характар чалавека заснаваны на прыродных задатках і фарміруецца ў канкрэтных жыццёвых абставінах. Разам з тым галоўную ролю ў фарміраванні характару асобы адыгрывае яе свядомае і адказнае стаўленне да сябе, уменне вызначаць для сябе канкрэтныя задачы. Гэтыя задачы звязаны з вучобай, працай, наладжваннем добрых адносін з людзьмі, а таксама з развіццём сваіх здольнасцей і нястомнай працай над сабой.

Характар фарміруецца ў працэсе дзейнасці. Нашы ўчынкі ўплываюць на наш лад жыцця, на нашы звычкі. Замацоўваючыся, гэтыя звычкі становяцца рысамі характару.

Кажуць, «звычка — другая натура». Змяніць звычкі вельмі няпроста. Таму лепей не дапускаць замацавання шкодных звычак. І гэта адносіцца не толькі да курэння ці брыдкаслоўя, але і да неабавязковасці, безадказнасці, легкадумнасці, схільнасці да пустога, бессэнсоўнага марнавання часу і г. д. Мы самі такія, якія нашы звычкі. З іх шмат у чым складаецца характар, а ад яго залежыць, якім будзе наша жыццё. У гэтым сэнсе кожны чалавек — гаспадар свайго лёсу, бо ён сам вызначае свае ўчынкі, можа ўплываць на свае звычкі, а праз іх і на свой характар.

**Тэмперамент, яго роля ў жыцці чалавека.** Усе людзі адрозніваюцца пэўнымі асаблівасцямі паводзін: адны — рухавыя, энергічныя, другія — марудныя; адны — эмацыянальныя, другія — спакойныя. Падобныя прыкметы паводзін асобы называюць *дынамічнымі*. Дынаміку чалавечых паводзін можна параўнаць з цячэннем ракі. Бывае, рака нясе свае воды марудна і плаўна, яе цячэнне ледзь заўважнае. Іншая рака цячэ хутка, вада ў ёй бурліць і грукоча, ударaючыся аб камяні. Гэтак жа адрозніваюцца і дзеянні, паводзіны розных асоб, дынамічныя

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

характарыстыкі якіх шмат у чым залежаць ад тэмпераменту.

*Тэмперамент* (ад лац. temperamentum — суразмернасць, суадносіны) — гэта сукупнасць індывідуальных асаблівасцей, якія надаюць спецыфіку паводзінам і дзейнасці чалавека, характарызуюць ступень яго жыццёвай актыўнасці.

Вучэнне пра тэмперамент бярэ пачатак у далёкім мінулым. Яшчэ старажытна-грэчаскі ўрач Гіпакрат вучыў, што ў арганізме чалавека ёсць чатыры вадкасці: кроў (па-лацінску «sanguis»), слізь (па-грэчаску «phlégma»), жоўтая жоўць (па-грэчаску «cholē̓») і чорная жоўць (па-грэчаску «melas» — чорны, «cholē̓» — жоўць). Змешванне гэтых вадкасцей і перавага якой-небудзь з іх, як сцвярджаў Гіпакрат, ляжыць у аснове тыпаў тэмпераменту: сангвінічнага, флегматычнага, халерычнага і меланхалічнага.

Тэмперамент — прыроджаная характарыстыка чалавека. Яна праяўляецца ад самага нараджэння і амаль заўсёды не змяняецца на працягу жыцця. Выдатны рускі фізіёлаг І. П. Паўлаў (1849—1936) навукова растлумачыў паходжанне тэмпераменту. Па яго меркаванні, у аснове тэмпераменту ляжыць тып нервовай сістэмы, які чалавек наследуе ад сваіх бацькоў. Работа нервовай сістэмы вызначаецца перш за ўсё суадносінамі яе асноўных працэсаў — узбуджэння і тармажэння. Працэсы ўзбуджэння і тармажэння ў розных людзей неаднолькава моцныя. У залежнасці ад гэтага навуковец вылучыў два тыпы нервовай сістэмы: моцны і слабы. Важную ролю адыгрываюць і такія асаблівасці нервовай сістэмы, як яе ўраўнаважанасць ці неўраўнаважанасць, а таксама рухавасць ці інертнасць. У залежнасці ад суадносін гэтых прыкмет і адрозніваюцца тыпы тэмпераменту.


*І. П. Паўлаў*

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Характарыстыка тыпаў тэмпераменту

| Тып тэмпера- менту | Характарыстыка тыпу тэмпераменту |
|---|---|
| 1 | 2 |
| Сангвінік | Чалавек рухавы, вясёлы, таварыскі. Лёгка сыходзіцца з людзьмі. У вялікай кампаніі незнаёмых людзей адчувае сябе як рыба ў вадзе. Яго адрознівае дабрыня, жаданне прыйсці на дапамогу. Ён актыўны, энергічны, лёгка прыстасоўваецца да новых умоў жыцця. Ахвотна бярэцца за справу, але можа не давесці яе да канца. Напружаная разумовая і фізічная праца яго хутка стамляе. І. П. Паўлаў называў яго: «Гарачы прадуктыўны дзеяч», але толькі тады, калі шмат цікавых спраў. У адваротным выпадку ён становіцца сумным і млявым |
| Халерык | Чалавек хуткі, парывісты, з вялікай жыццёвай энергіяй. І. П. Паўлаў так вызначаў гэты тэмперамент: «Баявы, задорны тып, які лёгка раздражняецца». Яго пачуцці ўспыхваюць хутка і ярка, але гэтак жа хутка патухаюць. Настрой часта змяняецца. У адносінах з людзьмі халерыкі бываюць запальчывыя, нястрыманыя, крыклівыя. Чалавек з такім характарам за справу бярэцца страсна, з захапленнем, але сіл хапае ненадоўга, і тады нічога яму не пад сілу. Не любіць выконваць работу, якая патрабуе працяглай канцэнтрацыі ўвагі, спакойнага, маруднага тэмпу |
| Флегматык | Чалавек спакойны, марудны; ён нікуды не спяшаецца. Яго пачуцці, эмоцыі стрыманыя; яго цяжка «вывесці з сябе». Рухі і міміка невыразныя; не любіць новых знаёмстваў, для яго важнейшыя зносіны з аднымі і тымі ж людзьмі. Ён настойлівы і ўпарты працаўнік. І. П. Паўлаў яго так і назваў: «Упарты працаўнік жыцця» |

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Заканчэнне табліцы*

| 1 | 2 |
|---|---|
| Меланхолік | Чалавек вельмі чуллівы, крыўдлівы, лёгка ранімы. Голас ціхі. Рухі невыразныя. Плача ціха. Рэдка смяецца на ўвесь голас. Калі ён перажывае, то доўга, моцна і глыбока. Цяжка пераносіць няўдачы, крыўды. Ён стрыманы і на вецер слоў не кідае, даражыць добрымі адносінамі з навакольнымі. Добра спраўляецца з малацікавай, манатоннай работай, захоўвае пры яе выкананні высокую працаздольнасць. У звыклых, спакойных абставінах працуе вельмі прадуктыўна, але дрэнна прыстасоўваецца да ўсяго новага. Пры самых нязначных цяжкасцях у яго апускаюцца рукі. І. П. Паўлаў гаварыў пра яго так: «Меланхолік губляецца ў новых умовах жыцця» |

Такім чынам, мы ахарактарызавалі тыпы тэмпераменту. Цяпер вы лёгка зможаце вызначыць як уласны тэмперамент, так і тэмперамент блізкіх вам людзей.

Між тым далёка не ўсе людзі з’яўляюцца «чыстымі» прадстаўнікамі нейкага аднаго з асноўных тэмпераментаў. У большасці з іх асаблівасці аднаго тэмпераменту спалучаюцца з характэрнымі прыкметамі іншага. У адных жыццёвых сітуацыях у чалавека выяўляецца, напрыклад, сангвінічны тып, а ў другіх — флегматычны. Ці, скажам, чалавек можа быць халерыкам, але імкнуцца дзейнічаць як сангвінік.

У кожным тыпе тэмпераменту ёсць станоўчыя і адмоўныя бакі. Даследаванні псіхолагаў паказалі, што высокіх вынікаў у сваёй дзейнасці могуць дабівацца людзі з рознымі тэмпераментамі. Пры любым тэмпераменце існуе і небяспека развіцця непажаданых рыс асобы. Напрыклад, у халерыка можа з’явіцца нястрыманасць, рэзкасць паводзін, у сангвініка — легкадумнасць, непаслядоўнасць у справах, у меланхоліка — празмерная замкнёнасць,

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

сарамлівасць, у флегматыка — пасіўнасць, млявасць, абыякавасць.

Не варта апраўдваць тэмпераментам тое, што з'яўляецца вынікам нявыхаванасці. Напрыклад, нястрыманым і бестактоўным можа быць чалавек любога тэмпераменту. І ў любым выпадку ад гэтых якасцей трэба пазбаўляцца. Таму важна знайсці прымяненне станоўчым бакам свайго тэмпераменту і навучыцца абмяжоўваць ці пераадольваць звязаныя з ім адмоўныя рысы.

## Некаторыя высновы

1. Характар праяўляецца ва ўчынках і дзеяннях. 2. У залежнасці ад таго, скіравана ўвага чалавека пераважна на знешні свет ці на ўнутраны, адрозніваюць два тыпы характару — экстраверты і інтраверты. 3. Валявы чалавек здольны пераадольваць адмоўныя рысы свайго характару, не дапускаючы ўзнікнення шкодных звычак. 4. Ад тэмпераменту залежыць своеасаблівасць паводзін і дзейнасці чалавека, ступень яго жыццёвай актыўнасці.

**?!** ***Пытанні і заданні***

1. Што мы разумеем пад характарам чалавека? Ці любая асаблівасць чалавека можа лічыцца рысай яго характару?
2. У чым заключаюцца адрозненні паміж моцным і слабым характарам?
3. Якія асноўныя рысы характару экстраверта і інтраверта?
4. Працягніце пералік казачных персанажаў і вызначце іх тэмперамент: Снежная Каралева — флегматык, Маленькая Разбойніца — ... , Папялушка — ... , Дзюймовачка — ... , Чарапаха Тарціла — ... .
5. Ахарактарызуйце асноўныя тыпы тэмпераменту. Як уплываюць іх асаблівасці на выкананне работы?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## § 3. Скіраванасць асобы

**Матывы.** У жыцці мы здзяйсняем мноства ўчынкаў, выконваем розныя віды дзейнасці. Усё гэта — праявы актыўнасці асобы. У аснове актыўнасці ляжаць розныя матывы. *Матыў* (франц. motif ад лац. movere — рухаць) ёсць тое, дзеля чаго чалавек выконвае тыя ці іншыя дзеянні.

Важна вызначыць, куды скіравана актыўнасць, на што яна арыентавана. Так, многія навучэнцы пасля заканчэння школы нацэльваюць сябе на паступленне ў ВНУ. Аднак у аснове адной і той жа мэты ў іх могуць быць розныя матывы. Для аднаго — гэта жаданне стаць добрым спецыялістам, для другога — прэстыжнасць прафесіі ці ВНУ, для трэцяга — атрыманне дыплома аб вышэйшай адукацыі. Як бачым, мэта знешне адна і тая. Аднак калі яна дасягнута, то ва ўчарашніх школьнікаў, якія сталі студэнтамі, актыўнасць будзе мець розную скіраванасць. Адны будуць імкнуцца да глыбокага авалодвання ведамі і ўменнямі, патрэбнымі для працы па спецыяльнасці, іншыя не захочуць асабліва напружвацца, спадзеючыся на «можа быць». Калі ў працэсе вучобы матыў, які яе накіроўвае, не зменіцца, то некаторым студэнтам давядзецца пакінуць ВНУ.

*Скіраванасць асобы* — гэта сукупнасць устойлівых матываў, якія арыентуюць дзейнасць і паводзіны асобы ў розных сітуацыях.

Так, можа здарыцца, што пасля заканчэння школы вы выберацe пэўную прафесію, а вашы бацькі не пагодзяцца з такім выбарам, таму што яны бачаць вашу будучыню паіншаму. Калі нягледзячы на гэта вы працягнеце імкнуцца да дасягнення пастаўленай мэты, то ва ўстойлівай лініі паводзін выявіцца скіраванасць вашай асобы.

Да ўстойлівых матываў адносяць перакананні, інтарэсы, устаноўкі.

*Перакананне* — гэта цвёрдая ўпэўненасць асобы ў чым-небудзь, якая схіляе яе дзейнічаць у адпаведнасці са сваімі поглядамі, меркаваннямі пра важнае і няважнае, годнае і

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ганебнае. Калі вы здольныя выконваць свае абяцанні, дзейнічаць так, як лічыце патрэбным і правільным, актыўна адстойваеце сваю праўду, даказваючы яе словам і справай, гэта значыць, што вашы перакананні адпавядаюць вашым паводзінам і накіроўваюць іх. Калі ж вашы словы і справы разыходзяцца, калі вы намячаеце адно, а робіце зусім іншае, то ваша сістэма перакананняў няўстойлівая, неэфектыўная, вы не заўсёды можаце растлумачыць прычыны сваіх учынкаў і рашэнняў. У выніку ваша дзейнасць і паводзіны ў цэлым становяцца незразумелымі для навакольных. Атрымліваецца, што вы не ведаеце, чаго хочаце дасягнуць і наколькі тое, што вы абвяшчаеце ў якасці сваіх намераў, сапраўды важна для вас. Толькі разабраўшыся ў сабе і ўлічыўшы меркаванне навакольных пра тое, што вы гаворыце і робіце, вы зможаце выпрацаваць дзейсныя перакананні.

**Інтарэсы і патрэбнасці.** У працэсе практычнай дзейнасці, а таксама ў пазнанні навакольнага свету важную ролю адыгрываюць чалавечыя інтарэсы. *Інтарэс* (ад лац. interest — важна) — гэта рэальная прычына, якая ўсведамляецца намі і накіроўвае пазнавальную і практычную дзейнасць. Успомніце сітуацыі, у якіх вы сутыкаліся з нечым новым, незвычайным. Пытанне, якое вы адразу ставіце перад сабой («Што гэта?» ці «Што такое?»), і ёсць праява інтарэсу да таго, што прыцягвае вашу ўвагу. Калі ж у вашым жыцці ўзнікла практычная праблема, то, усвядоміўшы яе, вы зараз жа праяўляеце інтарэс да шляхоў і сродкаў яе вырашэння.

Вы калі-небудзь задумваліся над тым, чаму людзі выбіраюць розныя прафесіі? Напэўна, тут важныя і парады бацькоў, і жаданне быць падобным да аўтарытэтнага для вас чалавека, і прэстыжнасць прафесіі. Уплывае таксама спецыяльны інтарэс да пэўнага віду дзейнасці.

*Спецыяльны інтарэс* — гэта ўнутраная цяга да якой-небудзь канкрэтнай дзейнасці. Ён можа перарасці ў схільнасць прафесійна займацца абранай справай. Увогуле інтарэсы з'яўляюцца вельмі важнай крыніцай развіцця здольнасцей. Яны накіроўваюць нашу ўвагу, стымулююць

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

актыўнасць, робяць жыццё асэнсаваным і яркім, тады як іх адсутнасць перашкаджае развіццю і рэалізацыі здольнасцей.

Нашы інтарэсы могуць быць «эгацэнтрычнымі», г. зн. накіраванымі пераважна на ўласную асобу (ад лац. ego — я, centrum — цэнтр). Эгацэнтрычны інтарэс характарызуецца тым, што чалавека хвалюе не столькі якасць, выніковасць яго працы, колькі ўражанне, якое ён стварае, дэманстрацыя сваёй перавагі, дасягненне лідэрства. Зусім іншы характар мае пазнавальны інтарэс, інтарэс да новых з'яў жыцця, імкненне да новых уражанняў, да стварэння новых карысных рэчаў.

У аснове інтарэсаў ляжаць *патрэбнасці*. Патрэбнасць разумеецца як неабходнасць нечага, адсутнасць чагосьці важнага, неабходнага ў жыцці. Мы не заўсёды дакладна ўсведамляем свае патрэбнасці. У тым выпадку, калі мы іх усвядомілі, г. зн. разабраліся ў тым, што нам сапраўды неабходна, патрэбнасці ператвараюцца ў інтарэсы.

Нашы інтарэсы могуць быць накіраваны на задавальненне матэрыяльных патрэбнасцей, перш за ўсё тых з іх, якія звязаны з забеспячэннем неабходных умоў жыццядзейнасці. Мы зацікаўлены ў атрыманні добраўпарадкаванага жылля, якасным і збалансаваным харчаванні і г. д. Але ўсе мы разумеем, што ў жыцці важныя не толькі разнастайныя матэрыяльныя выгоды. Дакладней сказаць, выкарыстанне многіх з іх не звязана з вострай жыццёвай неабходнацю, хутчэй, яно служыць інтарэсам самасцвярджэння (напрыклад, мець дарагі аўтамабіль) ці самарэалізацыі, развіцця сваіх здольнасцей. Так, музыканту патрэбны інструменты, нярэдка вельмі дарагія; заняткі некаторымі відамі спорту таксама патрабуюць добрага і дарагога рыштунку, інвентару.

Разам з матэрыяльнымі нашу дзейнасць накіроўваюць інтарэсы сацыяльныя і духоўныя. Яны могуць быць сканцэнтраваны ў якойсьці адной галіне; усё астатняе ў гэтым выпадку менш цікавае і робіцца як бы механічна. Але яны могуць быць і размеркаваны паміж рознымі відамі дзейнасці. Тады можна казаць пра рознабаковасць асобы, маючы на ўвазе багацце яе інтарэсаў. Праўда, тут узнікае

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

небяспека таго, што інтарэсы становяцца павярхоўнымі, таму што глыбока і грунтоўна займацца рознымі справамі звычайна не ўдаецца.

Інтарэсы асобы могуць адрозніваецца па ступені іх устойлівасці і глыбіні. Устойлівы і глыбокі інтарэс да якой-небудзь справы дазваляе спадзявацца на значныя вынікі. Калі ў выдатнага англійскага фізіка І. Ньютана (1643—1727) спыталі, як яму ўдалося адкрыць закон сусветнага прыцягнення, адказ быў такі: “Я думаў над гэтым пастаянна на працягу многіх гадоў”.

На працягу жыцця інтарэсы могуць змяняцца. Гэта звязана не толькі са ступенню задавальнення патрэбнасцей. Асоба — актыўны суб’ект дзейнасці. Чым шырэйшая сфера ведаў чалавека, чым вышэйшыя яго дасягненні, чым актыўней ён удзельнічае ў грамадскім жыцці, тым дынамічнейшыя і разнастайнейшыя яго інтарэсы, тым больш насычана і цікава працякае яго жыццё.

**Устаноўкі.**

*Устаноўка* — гэта стан гатоўнасці чалавека здзейсніць што-небудзь, схільнасць да актыўных дзеянняў у пэўнай сітуацыі.

Устаноўка асобы моцна ўплывае на вынікі дзейнасці. Напрыклад, для спартсмена, які ўдзельнічае ў адказных спаборніцтвах, вельмі важнае значэнне мае ўстаноўка на дасягненне найвышэйшага рэзультату, на перамогу, для вучня на ўроку — настроенасць на ўважлівае стаўленне да выканання заданняў, успрыманне новага матэрыялу. Як толькі гэта ўстаноўка губляецца, эфектыўнасць працы на ўроку рэзка зніжаецца.

Наша ўстаноўка ўплывае на настрой, у якім мы нешта робім; адбіваецца яна і на зносінах з навакольнымі. Калі дзейнічае ўстаноўка на добразычлівыя, прыязныя адносіны, то людзі гэта адразу ж адчуваюць і звычайна самі пачынаюць ставіцца да вас прыхільна. Устаноўкі на выкананне пэўнай дзейнасці ці дасягненне якогасьці выніку цесна звязаны з нашым мінулым вопытам, які быццам падказвае, што і як трэба рабіць. Такая падказка неабавязкова ясна сфармулявана, канкрэтна выяўлена

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



В. І. Сурыкаў. *Пераход Суворава цераз Альпы* (1899)

ў словах, але яна неабходна для ўзнікнення гатоўнасці дзейнічаць.

**Самавыхаванне.** Калі чалавек імкнецца жыць асэнсавана, паўней рэалізаваць свае здольнасці, ён можа свядома рухацца па шляху асобаснага самаразвіцця. Стаць лепшымі хочуць, напэўна, усе людзі, але сістэматычна займаюцца самавыхаваннем нямногія. Чаму гэта адбываецца? Для працы над сабой чалавеку неабходна пэўная гатоўнасць, звязаная з наяўнасцю такіх якасцей, як мэтанакіраванасць,

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

самакрытычнасць, патрабавальнасць да сябе, самавалоданне і ўспрымальнасць да выхавання.

*Мэтанакіраванасць* прадугледжвае наяўнасць жыццёвай мэты, уменне падпарадкаваць свае ўчынкі і дзеянні яе дасягненню.

*Самакрытычнасць* забяспечвае аб'ектыўную самаацэнку. Калі чалавек дакладна ведае, што ў яго характары станоўчае, а што адмоўнае і ад чаго трэба пазбавіцца, ён больш абгрунтавана выбірае мэту, вызначае праграму самавыхавання.

*Патрабавальнасць да сябе* дапамагае перавесці заўвагі, указанні, парады, якія робяць іншыя людзі, ва ўласныя патрабаванні да паводзін; яна выклікае патрэбнасць стаць лепшым.

*Самавалоданне*, якое называюць яшчэ *вытрымкай* ці *стрыманасцю*, патрабуецца для таго, каб не панікаваць і не мітусіцца, быць валявой асобай. А *ўспрымальнасць да выхавання* азначае здольнасць правільна зразумець і прыняць выхаваўчыя ўздзеянні педагогаў, бацькоў, іншых аўтарытэтных для вас людзей, уменне выкарыстаць наяўныя ўмовы для свайго духоўнага росту, самаўдасканальвання.

Для паспяховага самавыхавання неабходна маральная і валявая гатоўнасць. Належыць быць максімальна добразычлівым да патрабаванняў педагогаў, парад і пажаданняў бацькоў добрасумленна вучыцца.

Самавыхаванне заклікана забяспечыць пераемнасць культуры, працоўнага вопыту і маральных каштоўнасцей народа. Яшчэ ў дзяцінстве з казак чалавек даведваецца пра дабро і зло, пра багатыроў і мудрацоў. Так ствараецца *ідэал* — уяўленне пра найвышэйшую ступень дасканаласці. Ідэал — важны фактар самавыхавання.

У свеце, які ўвесь час змяняецца, толькі той знаходзіць сваё месца ў жыцці, паспяхова рэалізуе сябе, хто безупынна змяняецца сам, удасканальвае свае сілы і здольнасці. Самавыхаванне — гэта спосаб забеспячэння ўзгодненасці паміж працэсамі развіцця грамадства і фарміраваннем уласнай асобы. Самавыхаванне перш за ўсё неабходна самому чалавеку для канструктыўнага сацыяльнага і асобаснага самавызначэння і самасцвярджэння, каб не разгубіцца

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ў цяжкай сітуацыі, не спакусіцца фальшывымі каштоўнасцямі, а правільна выбраць жыццёвыя арыенціры і стаць дастойным грамадзянінам сваёй краіны.

**Некаторыя высновы**

1. Найбольш важныя разнавіднасці ўстойлівых матываў — гэта перакананні, інтарэсы, установкі. 2. Інтарэс да якога-небудзь віду дзейнасці шмат у чым вызначае выбар прафесіі. 3. Хто жыве асэнсавана, той працуе над сабой, выпрацоўвае якасці, значныя для канструктыўнага сацыяльнага і асабістага самавызначэння і самасцвярджэння.

?! ***Пытанні і заданні***

1. Што разумеюць пад скіраванасцю асобы?
2. Які ўплыў аказваюць здольнасці і характар асобы на яе скіраванасць?
3. На канкрэтных прыкладах пакажыце ўзаемасувязь інтарэсаў і патрэбнасцей.
4. Якую ролю адыгрываюць перакананні ў жыцці чалавека?
5. Растлумачце, якая сувязь існуе паміж перакананнямі і інтарэсамі. Прывядзіце прыклады такой сувязі.
6. Якога чалавека вы б назвалі выхаваным?
7. Ахарактарызуйце якасці, неабходныя чалавеку для работы над сабой.
8. Важную ролю ў паспяховым самавыхаванні асобы адыгрываюць такія яе якасці, як мэтанакіраванасць, самакрытычнасць, патрабавальнасць да сябе, самавалоданне. Праілюструйце кожную з названых рыс канкрэтнымі прыкладамі.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

## § 4. Духоўны свет чалавека

**Паняцце духоўнасці.** Кажучы пра духоўны свет людзей, мы маем на ўвазе ўсю сукупнасць з'яў чалавечай свядомасці: думкі і пачуцці, эмацыянальныя станы і валявыя імкненні, інтарэсы і схільнасці, веды і прадузятасці.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У працэсе гістарычнага развіцця фарміруецца духоўнае жыццё грамадства і чалавека. Чалавек не проста прыстасоўваецца да знешніх умоў, а стварае новае: спачатку ў сваім мысленні і фантазіі, а затым ужо ў рэчаіснасці. Для таго каб нешта зрабіць па-чалавечы — узважана, разумна, адказна, трэба спачатку ўлічыць усе абставіны, набыць неабходныя веды і ўменні, прадумаць наступствы, г. зн. зрабіць адпаведныя змены ў самім сабе, у сваім духоўным свеце, у свядомасці.

*Духоўнасць* — гэта абагульненая характарыстыка каштоўнасных арыенціраў як асобнага чалавека, так і грамадства, у якім ён жыве.

Узроўні духоўнасці адрозніваюцца тым, у якой ступені людзі ўсведамляюць неабходнасць выконваць не толькі законы прыроды, але і нормы грамадскага жыцця, у тым ліку правілы маральнасці, замацаваныя ўяўленні пра прыгожае і агіднае, пра ўзвышанае і нізкае.

Духоўнасць уключае веды, але не зводзіцца да іх, бо тут вельмі важна, якім мэтам служаць набытыя веды, ці адпавядаюць гэтыя мэты патрабаванням гуманізму, захавання нашага прыроднага асяроддзя пражывання, міру і добразычлівасці ў адносінах паміж людзьмі, краінамі і народамі. Само па сабе веданне ўласцівасцей і законаў прыроды не вызначае мэт нашай дзейнасці: іх мы выбіраем, кіруючыся наяўнымі ўяўленнямі пра годнае і ганебнае, дапушчальнае і недапушчальнае. Высокая духоўнасць мае сваёй умовай высокую маральнасць. Нізкі ўзровень маральнасці, эгаістычнасць і антыгуманнасць мэт, да якіх імкнецца чалавек, азначаюць нізкі ўзровень духоўнасці.

Маральнасць — гэта толькі адна са сфер духоўнасці грамадства і асобы. Высокія маральныя мэты не могуць быць дасягнутыя, калі чалавек, які імкнецца да іх, не мае патрэбных ведаў і ўменняў. Значыць, важнае значэнне для развіцця духоўнасці мае навука. Цэласнасць і гарманічнасць духоўнага свету людзей недасягальныя і без мастацтва, якое развівае нашы пачуцці, вобразнае ўспрыманне свету, здольнасць адрозніваць сапраўдныя

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



М. В. Несцераў. *Святая Русь* (1901—1906)

і ўяўныя каштоўнасці. На працягу тысячагоддзяў своеасаблівым захавальнікам чалавечай духоўнасці выступала рэлігія. Канфлікты рэлігіі і навукі ў асноўным засталіся ў мінулым. Калі навука даследуе законы і ўласцівасці навакольных прадметаў і з'яў, то рэлігія заклікае чалавека падпарадкавацца нейкай вышэйшай сіле, выконваць яе прадпісанні. Для многіх людзей гэты заклік азначае шлях да духоўнага росту.

Духоўнасць асобы выяўляецца ў яе ўчынках і дзеяннях, у стаўленні да сябе, да людзей, да навакольнага свету ў цэлым.

Разважаючы пра духоўнасць, кожны з нас задае сабе пытанні: што такое чалавек, у чым яго прызванне, абавязак і сэнс жыцця? Вырашэнне іх звязана з фарміраваннем нашага светапогляду.

**Светапогляд, яго роля ў жыцці людзей.** Чалавек — мыслячая істота, якая ўсведамляе сябе і навакольную рэчаіснасць. Чалавек здольны выявіць сваё разуменне і ацэнку таго, што адбываецца, больш ці менш дакладна сфармуляваць свае мэты. Кажучы самому сабе «Я ведаю,

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

што...», «Я хачу, каб...», «Я павінен...», чалавек у думках вылучае сябе з навакольнага свету. У яго свядомасці выбудоўваюцца адносіны «Я і іншыя людзі», «Я і прырода», «Я і навакольны свет у цэлым». Ва ўсіх гэтых мысленных, уяўных адносінах прысутнічае нейкае паняцце ці вобраз сябе (Я), а таксама паняцце ці вобраз знешняй рэчаіснасці, з якой чалавек звязаны і ў адрыве ад якой не можа жыць.

Для таго каб быць свядомым суб'ектам сваёй жыццядзейнасці, быць асобай, духоўнай істотай, кожны з нас павінен выпрацаваць пэўны светапогляд.

*Светапогляд* — гэта абагульненае разуменне чалавекам самога сябе, навакольнага свету і сваёй сувязі са светам, якое складаецца з найважнейшых перакананняў.

Светапогляд кожнай асобы ўтрымлівае адказы на тры асноўныя пытанні: «Што я ўяўляю з сябе як чалавек?», «Што ўяўляе з сябе навакольны свет — людзі і прырода, якія іх галоўныя характарыстыкі?», «Як я магу і павінен ставіцца да навакольнага свету і да самога сябе, што я ўвогуле магу і павінен рабіць?»

Кожны чалавек вырашае для сябе гэтыя пытанні на працягу ўсяго свядомага жыцця, удакладняючы на аснове вопыту і ведаў нейкія іх бакі, моманты. Штосьці са светапоглядных перакананняў асобы пацвярджаецца яе вопытам і ўсё больш замацоўваецца ў свядомасці; некаторыя ж светапоглядныя ўяўленні дэманструюць неабгрунтаванасць і перастаюць лічыцца важнымі. Чалавек самастойна выбудоўвае свой светапогляд.

Светапогляд не проста спалучае розныя веды чалавека пра свет і самога сябе, ён мае перадумовай цвёрдае перакананне ў правільнасці і высокай каштоўнасці гэтых ведаў. Менавіта асноватворныя веды і каштоўнасныя ідэі, стаўшы глыбокімі, прынцыповымі перакананнямі асобы, утвараюць у сукупнасці яе светапогляд.

У паўсядзённым жыцці нам часта даводзіцца акрэсліваць сваё стаўленне да таго, што адбываецца, рабіць выбар з

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

некалькіх варыянтаў паводзін, удакладняць жыццёвыя задачы і вызначаць сярод іх самыя важныя, прыярытэтныя. А для гэтага патрэбны нейкія падставы. Многія праблемы мы пераадольваем амаль неўсвядомлена, таму што яны падобныя да тых, з якімі мы ўжо сустракаліся і для якіх выпрацавалі прымальную схему вырашэння. Тут мы дзейнічаем звыклым чынам. Іншыя ж з'яўляюцца новымі, незвычайнымі. Для іх вырашэння мы звяртаемся да нашых асноватворных уяўленняў ці ідэй пра тое, як увогуле павінен паводзіць сябе чалавек у той ці іншай сітуацыі. Пры гэтым мы выкарыстоўваем тыя веды пра навакольны свет, якія лічым надзейна вызначанымі і якім давяраем. Гэта і азначае зварот да найважнейшых перакананняў, якія складаюць наш светапогляд.

Жыццёвы сэнс светапогляду заключаецца ў тым, каб накіроўваць нашы ўчынкі і думкі, узбройваць нас арыенцірамі, якія дазваляюць правільна дзейнічаць у важных сітуацыях. Наш светапогляд ёсць тое, чым мы рэальна кіруемся ў жыцці. Праўда, мы далёка не заўсёды дакладна ўсведамляем, у чым жа на самай справе заключаецца наш светапогляд. Паспрабуйце самі вызначыць свае найважнейшыя, асноватворныя перакананні, і вы ўбачыце, што зрабіць гэта вельмі няпроста.

Мы ясна ўсведамляем тое, што новае, незвычайнае і патрабуе спецыяльнай увагі. Але ў склад светапогляду ўваходзяць такія перакананні, уяўленні, ідэі, якія даўно прыняты намі ў якасці бясспрэчных і сталі ўспрымацца як звыклыя і відавочныя. Многія звыклыя рэчы могуць быць вельмі важнымі, але на іх мы амаль не звяртаем увагі — менавіта з прычыны іх звыкласці.

Так і з нашым светапоглядам. Яго прызначэнне заключаецца не ў тым, каб быць яркім, «карцінным» і забаўляць нас усё новымі і новымі ўражаннямі. Наадварот, ён «паводзіць сябе» вельмі сціпла і звычайна не выпінаецца ў нашай свядомасці на першы план. Разам з тым ён пастаянна ўказвае нам, што мы можам і чаго не можам дасягнуць; што мы павінны рабіць, а чаго мы рабіць не маем права, таму што гэта супярэчыць нормам жыцця і недастойна высокага звання чалавека.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Светапогляд — гэта ўнутраны рэгулятар, які абагульняе наш мінулы вопыт і накіроўвае ўсе нашы значныя ўчынкі і дзеянні. Дапусцім, нешта важнае вы робіце па звычцы, амаль не задумваючыся. Але вы ўсё ж можаце задаць пытанне: а чаму вы гэта робіце менавіта так, а не інакш? І калі вы будзеце старанна дашуквацца вытокаў і асноў, то абавязкова выявіце якое-небудзь з вашых светапоглядных перакананняў.

**Шляхі развіцця духоўнага свету і фарміравання светапогляду асобы.** Мы ўжо казалі пра тое, што асобаю не нараджаюцца, а становяцца. Гэта станаўленне пачынаецца яшчэ ў дзяцінстве, калі дзіця раптам гаворыць пра сябе: «Я», — і тут жа дадае: «Я хачу...» Услед за жаданнямі, якія дэманструюць інтарэсы і патрэбнасці, асоба пачынае ўсведамляць свае магчымасці, а таксама разнастайныя правілы, абмежаванні, прадпісанні, што рэгулююць яе дзеянні. Дзіця вучыцца перадаваць у словах эмоцыі і пачуцці, настроі, спадзяванні, прыярытэты і г. д. У яго паступова фарміруецца пэўнае *светаадчуванне*, звязанае з пераважным настроем, агульным пачуццёва-эмацыянальным успрыманнем таго, што адбываецца.

Па меры развіцця пазнавальнай дзейнасці ў дзіцяці складваюцца ўяўленні пра ўласцівасці і сувязі рэчаў, пра пэўную ўпарадкаванасць усяго, што ёсць навокал. Дарослыя дапамагаюць яму разабрацца ў гэтай упарадкаванасці. Так паступова закладваюцца асновы і перадумовы *светаразумення*. А потым дзіця прыходзіць у школу і пачынае паслядоўна асвойваць розныя вучэбныя прадметы, набываць веды, якія адлюстроўваюць працяглы пазнавальны вопыт чалавецтва. У працэсе выхавання яно засвойвае агульныя правілы паводзін, нормы і каштоўнасці чалавечага жыцця. Вывучаючы гісторыю, літаратуру, іншыя гуманітарныя прадметы, хлопчык ці дзяўчынка пашырае веды пра свет чалавечых узаемаадносін, пра арганізацыю сумеснага (грамадскага) жыцця людзей.

У працэсе станаўлення асоба не проста ўбірае гатовыя веды і ўражанні — яна так ці інакш асэнсоўвае, па-свойму

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

парадкуе іх. У грамадстве, у культуры існуюць узоры светапоглядных абагульненняў, з якімі чалавек знаёміцца пры атрыманні адукацыі. Такія ўзоры яшчэ ў далёкім мінулым прымалі форму міфа і рэлігіі. Рэлігія адыгрывае важную ролю ў жыцці многіх нашых сучаснікаў. Рэлігійны светапогляд заснаваны на веры ў рэальнасць звышнатуральных сіл, якія кіруюць светам. Гэта вера не дапускае сумненняў у правільнасці некаторых зыходных сцвярджэнняў, названых до́гматамі. Існуе і нерэлігійная форма шырокіх светапоглядных абагульненняў, якая абапіраецца на выкарыстанне агульных паняццяў і выкананне правіл лагічнага мыслення, — гэта філасофія. Яна цесна звязана з канкрэтнымі навукамі аб прыродзе, грамадстве і чалавеку.

Вы ведаеце, што існуюць розныя рэлігійныя вучэнні пра свет, пра жыццё, пра чалавека і Бога. Філасофскіх вучэнняў нямала. Важна азнаёміцца з рознымі формамі светапогляду, глыбока прадумаць іх, каб удакладніць і ўзбагаціць уласную светапоглядную пазіцыю, забяспечыць умовы свайго духоўнага росту.

У кожнага чалавека, які склаўся як асоба, ёсць уласны светапогляд. Светапогляд — гэта аснова, духоўны стрыжань асобы. Менавіта ён найбольш шырока і поўна раскрывае, які ўзровень нашай духоўнасці, якія мы ў сапраўднасці, бо ён з’яўляецца асновай нашых думак, пачуццяў і ўчынкаў, арганізуе наша жыццё.

На працягу жыцця светапогляд, увесь духоўны свет асобы зазнае значныя змяненні. Яны звязаны з асаблівасцямі кожнага ўзросту, з характарам новых праблем і з тым, як мы іх успрымаем і вырашаем.

### Некаторыя высновы

1. Асноўныя сферы духоўнасці грамадства — гэта маральнасць, навука, мастацтва, рэлігія. Духоўнасць мае перадумовай зацікаўленасць асобы ў найвышэйшых каштоўнасцях і праяўляецца ў яе ўчынках у адносінах да людзей, навакольнай прыроды.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

2. Асновай светапогляду асобы з'яўляюцца яе глыбокія і трывалыя перакананні, заснаваныя на ведах. 3. Прызначэнне светапогляду ў тым, каб накіроўваць нашы ўчынкі і думкі, даваць нам арыенціры для дзейнасці. 4. Светапогляд асобы фарміруецца ў працэсе яе станаўлення і далейшага развіцця. Ён убірае ў сябе як вопыт асобы, так і абагульнены вопыт іншых людзей, выпрацаваныя чалавецтвам веды пра свет.

?! ***Пытанні і заданні***

1. Што вы разумееце пад духоўнасцю? Што ўключае ў сябе духоўны свет чалавека?
2. Чым адрозніваюцца ўзроўні духоўнасці? Прывядзіце прыклады ўчынкаў чалавека, якія сведчаць пра высокі і нізкі ўзровень духоўнасці.
3. Што ўплывае на фарміраванне духоўнага свету чалавека? Якога чалавека можна назваць духоўна багатым?
4. Што такое светапогляд? Ці можа ў розных людзей быць аднолькавы светапогляд?
5. Нямецкі філосаф І. Кант адзначаў, што наш розум павінен вырашыць тры пытанні: «Што я магу ведаць?», «Што я павінен рабіць?», «На што я магу спадзявацца?» Першае з іх — пра пазнанне, другое — пра маральнасць, трэцяе — пра веру. Усе гэтыя пытанні можна, па словах Канта, аб'яднаць у пытанні пра тое, што такое чалавек. Як вы лічыце, чаму І. Кант вылучыў менавіта гэтыя тры пытанні?

## § 5. Узаемасувязь чалавека і грамадства

**Паняцце грамадства.** Са словам «грамадства» мы пастаянна сустракаемся ў паўсядзённым жыцці. Яно часта ўжываецца ў сродках масавай інфармацыі, у выступленнях навукоўцаў і публіцыстаў. На ўроках гісторыі размова ішла пра антычнае, сярэднявечнае, буржуазнае, сучаснае грамадства і г. д.

Слова «грамадства» шматзначнае. Яно паходзіць ад слова «грамада», якое азначае «мноства, вялікая маса;

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

супольнасць». Пад грамадствам у гэтым сэнсе разумеецца пэўная група людзей, якія аб'ядналіся для зносін і сумеснага выканання якой-небудзь дзейнасці. Тут яго можна замяніць словамі «арганізацыя», «саюз», «аб'яднанне», «таварыства» (аб'яднанне кнігалюбаў, арганізацыя аховы жывёл, акцыянернае таварыства і інш.).

Калі маюць на ўвазе канкрэтны этап гістарычнага развіцця чалавецтва, кажуць пра першабытнае грамадства, грамадства эпохі Асветы, сучаснае грамадства. Блізкае да гэтага выкарыстанне паняцця «грамадства» для характарыстыкі якаснай своеасаблівасці той ці іншай арганізацыі грамадскага жыцця («традыцыйнае грамадства», «грамадства спажывання», «інфармацыйнае грамадства»). У шырокім сэнсе грамадства — гэта частка матэрыяльнага свету, якая адасобілася ад прыроды і ўзаемадзейнічае з ёю.

*Грамадства* — гэта сукупнасць адносін паміж людзьмі, якія складваюцца і развіваюцца ў працэсе сумеснай дзейнасці.

Разважаючы пра грамадства, важна ўдакладняць, у якім канкрэтна значэнні ўжыта гэта слова.

**Асноўныя падыходы да вывучэння грамадства.** У працэсе развіцця навуковых ведаў склалася некалькі асноўных падыходаў да даследавання і тлумачэння грамадства. Першы падыход — *натуралістычны*. Ён звязаны з развіццём прыродазнаўства ў XVII—XVIII стст. Абапіраючыся на прыродазнаўчыя погляды, многія мысліцелі мінулага сцвярджалі, што грамадства ёсць своеасаблівы працяг прыроды. Тып грамадскага ладу лічыўся вынікам уплыву на жыццё людзей геаграфічнага асяроддзя і іншых прыродных фактараў. У XVIII ст. гэты пункт погляду адстойваў французскі мысліцель Ш. Мантэск'ё (1689—1755). У Найноўшы час названай думкі прытрымліваўся рускі гісторык Л. М. Гумілёў (1912—1992). Гэты падыход праяўляецца таксама ў разуменні грамадства як асаблівага жывога арганізма.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Культурна-гістарычны падыход* да вывучэння грамадства характэрны для канца XIX — пачатку XX ст. Яго станаўленне звязана з развіццём такіх навук, як гісторыя, культуралогія, антрапалогія. У рамках гэтага падыходу выяўляюцца адрозненні прыродных і грамадскіх працэсаў. Жыццё грамадства тут разглядаецца як сфера ўплыву маральных, эстэтычных і іншых духоўных каштоўнасцей, якія складаюць аснову культуры. Стваральнікам тэорыі культурна-гістарычных тыпаў грамадскага жыцця быў рускі вучоны М. Я. Данілеўскі (1822—1885).



*М. Я. Данілеўскі*

Асаблівае значэнне мае пытанне пра цэласнасць грамадства. Некаторыя мысліцелі меркавалі, што грамадства з'яўляецца простай сумай людзей — яго членаў — і ўтвараецца ў выніку складання здольнасцей, паводзін, дзеянняў множства індывідаў-атамаў. Гэты падыход узнік у філасофіі Новага часу. Так лічылі, напрыклад, англійскія філосафы XVII ст. Т. Гобс і Дж. Лок. Іншыя ж навукоўцы разглядалі грамадства як адзінае цэлае і сцвярджалі, што яго нельга звесці проста да сумы індывідаў. Гэты пункт погляду больш плённы, таму што людзі на самай справе ніколі не бываюць адасобленымі «атамамі». Але такі падыход выклікаў яшчэ адно складанае пытанне: у чым заключаецца гэтая еднасць людзей, на чым грунтуецца цэласнасць грамадства?

Многія мысліцелі (нямецкі філосаф XIX ст. Г. Гегель і інш.), адказваючы на такое пытанне, шукалі аснову цэласнасці і еднасці грамадства ў яго духоўным жыцці. Гэты падыход да разумення грамадства можна назваць *ідэалістычным*. Гісторыя тут часта разглядаецца як працэс руху да нейкага ідэалу, найвышэйшай духоўнай мэты.

Існуе і *матэрыялістычны падыход* у разуменні грамадскага жыцця. Напрыклад, нямецкія мысліцелі XIX ст.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Карл Маркс*

К. Маркс (1818—1883) і Ф. Энгельс (1820—1895) лічылі, што яго асновай з’яўляецца дзейнасць людзей па задавальненні сваіх матэрыяльных патрэбнасцей. Такой дзейнасцю выступае матэрыяльная вытворчасць. Не адмаўляючы існавання ў грамадскім жыцці ідэйных ці духоўных матываў, матэрыялістычны падыход грунтуецца на тым, што рэальнае матэрыяльнае жыццё людзей вызначае іх свядомасць.

Матэрыялістычны і ідэалістычны падыходы да разумення асновы грамадскага ладу шмат у чым дапаўняюць адзін аднаго, таму што ў нашым жыцці сапраўды ёсць як матэрыяльныя, так і духоўныя бакі, пабуджальныя прычыны дзейнасці, і яны цесна звязаны паміж сабой.

**Асноўныя формы ўзаемасувязі чалавека і грамадства.** Грамадства ўтвараюць людзі, якія ўступаюць у пэўныя зносіны паміж сабой і выконваюць розныя віды дзейнасці, патрэбныя для грамадства як цэлага.

Вытворчая дзейнасць скіравана перш за ўсё на стварэнне прадметаў, патрэбных для жыцця, на змяненне прыроднага асяроддзя і наданне яму карысных людзям якасцей. Яе яшчэ называюць эканамічнай дзейнасцю. Уключаючыся ў вытворчасць, чалавек робіць свой уклад у эканамічны дабрабыт іншых людзей. Разам з тым дастатак кожнага з іх паасобку шмат у чым залежыць ад агульнай эфектыўнасці эканомікі. Для яе забеспячэння ў грамадстве складваецца падзел працы, ажыццяўляецца мноства розных вытворчых працэсаў, якія абслугоўваюцца банкаўскай, транспартнай і іншымі сістэмамі. Важную ролю тут адыгрывае і навука, без якой у нашы дні немагчымы ні тэхнічны, ні ў цэлым эканамічны прагрэс. Сучасная эканамічная дзейнасць заснавана на ведах, атрыманых перш за ўсё навуковым шляхам. Навуковае даследаванне

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

стварае веды, г. зн. духоўную каштоўнасць, але без яго ў нашы дні ўжо немагчыма эфектыўна выпрацоўваць матэрыяльныя даброты. Мы, па сутнасці, уступаем у стадыю «грамадства ведаў», калі адукаванасць людзей і іх здольнасць ствараць новае становяцца галоўным эканамічным рэсурсам.

Навука — гэта духоўная дзейнасць. Іншымі відамі духоўнай дзейнасці з'яўляюцца мастацтва, рэлігія, мараль. Іх вынікі — не рэчы, а веды, мастацкія вобразы, духоўныя ідэалы, уяўленні пра свяшчэннае, пра фундаментальныя асновы жыцця. Кожны чалавек — гэта не толькі матэрыяльная, але і духоўная істота. Ён неадрыўны ад духоўнага жыцця грамадства, членам якога з'яўляецца.

У працэсе жыццядзейнасці чалавек уваходзіць у склад розных аб'яднанняў. Ён — член сям'і, вытворчага калектыву ці творчага саюза; належыць да нейкага ўзроставага слоя, да групы людзей з пэўнай адукацыяй, да нацыянальнай супольнасці; можа належаць да таго ці іншага рэлігійнага аб'яднання.

Галіну грамадскага жыцця, звязаную з узаемаадносінамі розных груп людзей, называюць сацыяльнай сферай.

Грамадству неабходна кіраванне. Яго ажыццяўляюць перш за ўсё дзяржаўныя ўстановы. Дзеянні людзей падпарадкаваны юрыдычным нормам, якія вызначае дзяржава. Кожны чалавек з'яўляецца грамадзянінам сваёй дзяржавы і ўключаны ў яго палітыка-прававое жыццё. Гэта яшчэ адна сфера жыцця грамадства — палітыка-прававая.

Названыя сферы жыцця — эканамічная, духоўная, сацыяльная, палітыка-прававая — важныя для кожнага чалавека. Усе людзі так ці інакш удзельнічаюць у іх функцыянаванні. Безумоўна, чалавек не можа адначасова быць прафесіяналам у многіх відах спецыялізаванай дзейнасці. Але для таго каб быць паўнавартасным членам грамадства, трэба, акрамя авалодання пэўнай спецыяльнасцю, ведаць таксама агульную арганізацыю сумеснага жыцця людзей, яго нормы і правілы, законы.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Сацыялізацыя асобы.** Сацыялізацыяй называюць працэс засваення чалавекам сукупнасці ведаў, нормаў паводзін, звычак, якія дазваляюць яму жыць у грамадстве ці, як кажуць, быць паўнавартасным членам грамадства.

Грамадская сувязь пранізвае ўсё жыццё кожнага чалавека ад нараджэння. Нованароджаны — бездапаможная істота, і бацькі з любоўю і клопатам даглядаюць яго. У гэтым і заключаецца іх грамадскі абавязак — бо грамадства працягвае існаваць дзякуючы таму, што на змену бацькам прыходзяць іх дзеці. Значыць, дзяцей трэба выхоўваць і навучаць, прывіваць ім веды, уменні і навыкі, патрэбныя для самастойнага жыцця ў адпаведнасці з правіламі, запытамі і культурнымі традыцыямі грамадства. Сям'я і школа — гэта самыя першыя, зыходныя формы сувязі чалавека і грамадства. Яны адпавядаюць дзяцінству і вучнёўству як пачатковым этапам жыцця. Бясспрэчна, сувязь з сям'ёй не перарываецца і ў далейшым, ды і вучоба звычайна не абмяжоўваецца толькі школай. Чалавек павінен атрымаць прафесію і кваліфікацыю для таго, каб ён мог уключыцца ў грамадскі працэс вытворчасці, стаць паўнапраўным удзельнікам грамадскага жыцця.

Разважаючы пра іншых людзей як асоб, мы звычайна «прымерваем» на сябе выказаныя ацэнкі ці патрабаванні. Разбіраючыся ў самім сабе, ацэньваючы свае асобасныя рысы, чалавек намячае дзеянні па развіцці сваіх станоўчых якасцей ці моцных бакоў, ліквідацыі недахопаў. З кагосьці ён бярэ прыклад, а да некага ўвогуле не хоча быць падобным. Іншыя людзі — гэта нібы люстэрка, у якім мы спрабуем разгледзець свае ўласныя рысы. Вельмі важна, аднак, як мы ставімся да іншых людзей і да саміх сябе. Англійскаму пісьменніку XIX ст. У. Тэкерэю належаць словы: «Свет — гэта люстэрка, і яно вяртае назад кожнаму чалавеку адлюстраванне яго ўласнага твару. Нахмурце бровы, і яно верне вам нядобразычлівы погляд, смейцеся разам з ім, і яно будзе вашым радасным і добрым кампаньёнам».

У працэсе сацыялізацыі чалавек вучыцца выконваць розныя ролі — у сям'і, у школе, пры сустрэчы з незнаёмымі

Адукацыя і выхаванне
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

людзьмі і г. д. Чалавек паважае сябе ў залежнасці ад таго, як ставяцца да яго іншыя людзі, аўтарытэтныя для яго. Гэту павагу трэба заслужыць правільнымі паводзінамі, адказным выкананнем сваіх абавязкаў, сталасцю станоўчых асобасных якасцей. Чалавек не можа заставацца абыякавым да таго, што ўяўляе менавіта ён, г. зн. якой асобай з'яўляецца. Разважаючы і дзейнічаючы, назапашваючы жыццёвы вопыт, ён змяняецца як асоба.

### Некаторыя высновы

1. Натуралістычны падыход да тлумачэння грамадства характарызуе яго як асаблівую частку прыроды. Тут падкрэсліваецца ўплыў прыроды на грамадства. 2. Культурна-гістарычны падыход указвае на адрозненні грамадскіх працэсаў ад прыродных. Асаблівае значэнне надаецца духоўным каштоўнасцям, якія былі выпрацаваны ў ходзе гісторыі і належаць да асноў культуры. 3. Ідэалістычны падыход да грамадскага жыцця тлумачыць яго на падставе развіцця свядомасці, прызнання галоўнай ролі духоўных, ідэальных з'яў. 4. Матэрыялістычнае разуменне грамадскага жыцця прадугледжвае, што яго асновай з'яўляюцца матэрыяльная вытворчасць, эканамічная дзейнасць. 5. Жыццё грамадства ўключае ў сябе эканамічную, духоўную, сацыяльную і палітыка-прававую сферы, якія і з'яўляюцца асноўнымі формамі сувязі чалавека і грамадства. 6. У працэсе сацыялізацыі чалавек засвойвае веды, вопыт, звычкі, патрэбныя для паўнавартаснага жыцця ў грамадстве.

### ?! *Пытанні і заданні*

1. У якіх значэннях ужываецца слова «грамадства»? Чым можна растлумачыць разнастайнасць значэнняў гэтага слова?
2. Назавіце і ахарактарызуйце асноўныя падыходы, якія склаліся ў даследаванні і тлумачэнні грамадства. У чым сутнасць рознагалосся іх прыхільнікаў? Ці можна, на ваш погляд, пазбавіцца гэтага рознагалосся?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

3. У якіх формах ажыццяўляецца сувязь чалавека і грамадства?
4. Што такое сацыялізацыя? Якія веды і ўменні вы лічыце самымі важнымі для станаўлення грамадства? Аргументуйце свой пункт гледжання.
5. Ці абмяжоўваецца сацыялізацыя асобы толькі дзяцінствам і перыядам вучобы ў школе? Паясніце сваё меркаванне прыкладамі.

## § 6. Чалавек і гісторыя

**Сутнасць гістарычнага працэсу.** З часоў старажытнагрэчаскага гісторыка Герадота і да нашых дзён вядуцца дыскусіі пра сэнс, мэты і накіраванасць гістарычнага працэсу. Важна таксама ўсвядоміць, што верна: гістарычныя падзеі адбываюцца неўпарадкавана або ў гісторыі чалавецтва існуе ўпарадкаванасць, заканамернасць, веданне якой дазваляе рабіць строгія навуковыя высновы пра мінулае і нават прадбачыць будучыню? Вывучаючы гісторыю, неабходна не толькі фіксаваць факты, але і пранікаць у сутнасць людскіх мэт і задум, разумець, ці закранаюць гэтыя змяненні асновы нашага жыцця.

*Гістарычным працэсам* называецца часавая паслядоўнасць падзей у жыцці грамадства, якая з'явілася вынікам дзейнасці многіх пакаленняў людзей.

Паняцце *гісторыя* адлюстроўвае той факт, што заўважаныя намі формы грамадскага жыцця некалі ўзніклі з-за пэўных прычын, а затым, моцна змяняючыся, становяцца, па сутнасці, іншымі. Гістарычнасць грамадскага жыцця азначае, што ў ім адбываюцца ўстойлівыя незваротныя змены — такія, дзякуючы якім «жыццё немагчыма павярнуць назад».

Гістарычныя змяненні, як паказвае навука, маюць накіраванасць. Гэта значыць, што ў жыцці грамадства дзейнічаюць заканамерныя тэндэнцыі, якія праяўляюцца праз шматлікія грамадскія падзеі, учынкі асобных людзей,

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



В. В. Волкаў. *Мінск, 3 ліпеня 1944 года* (1946—1953)

дзеянні грамадскіх груп, мас людзей і накіроўваюцца перш за ўсё іх інтарэсамі. Інтарэсы гэтыя бываюць вельмі разнароднымі, нават супярэчлівымі. Таму важна высветліць: існуе адзіная «логіка гісторыі», г. зн. агульная для ўсіх краін і народаў паслядоўнасць асноўных этапаў гістарычнага развіцця, ці ж ніякай адзінай схемы развіцця не існуе?

**Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння грамадства.** Важную ролю ў навуковым даследаванні гістарычнага працэсу адыграла матэрыялістычнае разуменне гісторыі, распрацаванае К. Марксам. На думку К. Маркса, у гісторыі грамадства адна адну змяняюць сістэмы сацыяльна-эканамічных (вытворчых) адносін паміж людзьмі, якія з'яўляюцца асновай усіх іншых відаў грамадскіх адносін.

Грамадствы, дзе сцвердзілася адна і тая ж сацыяльна-грамадская сістэма, адносяцца да адзінага гістарычнага тыпу. Такі тып называецца *грамадска-эканамічнай фармацыяй*.

Сусветная гісторыя, калі кіравацца тэорыяй К. Маркса, ёсць працэс развіцця і змены грамадска-эканамічных

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

фармацый. У гісторыі чалавецтва вылучаюцца першабытна-абшчынная, рабаўладальніцкая, феадальная, капіталістычная фармацыі, на змену якім прыходзіць камуністычная фармацыя. Менавіта ёй, паводле К. Маркса, належыць будучыня. Каштоўнасць гэтай схемы ў тым, што гістарычны працэс тут атрымлівае адзінае, тэарэтычна паслядоўнае вытлумачэнне. Разам з тым канкрэтныя даследаванні паказалі, што ў такую схему заканамернай змены грамадска-эканамічных фармацый кепска змяшчаецца гісторыя Усходу.

У гісторыі розных народаў шмат своеасаблівага, непаўторнага, якое не апісваецца ніякай універсальнай схемай. Таму ў некаторых гісторыкаў і філосафаў узнікла перакананне ў тым, што адзінай лініі заканамернага развіцця ўсяго чалавецтва не існуе. Розныя народы, кожны з адметнай культурай ці цывілізацыяй, праходзяць свой, самабытны шлях гістарычнага развіцця. Гэту ідэю ўвасабляе тэорыя культурна-гістарычных тыпаў, распрацаваная М. Я. Данілеўскім, а таксама *цывілізацыйны падыход да гісторыі*. Ён прапанаваны, у прыватнасці, англійскім філосафам і гісторыкам Арнольдам Тойнбі (1889—1975).

Паводле А. Тойнбі, *цывілізацыя* — гэта ўстойлівая супольнасць людзей, аб'яднаных духоўнымі (перш за ўсё рэлігійнымі) традыцыямі, падобным ладам жыцця, геаграфічнымі і гістарычнымі рамкамі.

А. Тойнбі вылучаў шумерскую, вавілонскую, мінойскую, элінскую (грэчаскую), кітайскую, індускую, ісламскую, заходнюю, праваслаўную хрысціянскую і некаторыя іншыя цывілізацыі.

Рухальнымі сіламі гісторыі, згодна з А. Тойнбі, з'яўляюцца выклік, кінуты цывілізацыі звонку (нявыгаднае геаграфічнае становішча, адставанне ад іншых цывілізацый, ваенная агрэсія), і адказ цывілізацыі на выклік, які даецца ў дзейнасці таленавітых, творчых асоб.

Цывілізацыя складаецца з творчай меншасці і інертнай большасці. Творчая меншасць вядзе за сабой інертную

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



Арнольд Тойнбі

большасць, каб даць адказ на выклікі, кінутыя цывілізацыі. Але калі творчая энергія меншасці заканчваецца, цывілізацыі не могуць далей доўга існаваць. Як і людзі, цывілізацыі нараджаюцца, дасягаюць сталасці і затым пачынаюць згасаць.

Вучэнне А. Тойнбі, як і іншыя шмат у чым падобныя да яго канцэпцыі гістарычнага працэсу як жыццёвага цыкла пэўных цывілізацый ці культур, не адказвае, аднак, на пытанне пра тое, куды ў канчатковым выніку рухаецца чалавецтва ў ходзе гістарычнага развіцця, а таксама пра сувязі паміж гісторыямі розных цывілізацый ці культур.

**Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі**

| Падыход | Вартасці | Недахопы |
|---|---|---|
| Фармацыйны | Дазваляе ўбачыць тое агульнае, што было ў гістарычным развіцці розных народаў, паказаць гісторыю людскога грамадства як адзіны працэс, вызначыць пэўныя законы гістарычнага развіцця грамадства, прапанаваць перыядызацыю сусветнай гісторыі і гісторыі асобных народаў | Большасць працэсаў палітычнага, духоўнага, ідэйнага, культурнага парадку не можа быць без скажэнняў і спрашчэнняў вытлумачана з чыста эканамічных пазіцый; паслядоўнае выкарыстанне фармацыйнага падыходу ў нечым перасоўвае на задні план ролю чалавечага фактара; недастатковая ўвага надаецца своеасаблівасці, непаўторнасці гісторыі асобных грамадстваў і народаў |

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Заканчэнне табліцы*

| Падыход | Вартасці | Недахопы |
|---|---|---|
| Цывілізацыйны | Дазваляе ўсебакова вывучаць гісторыю канкрэтных грамадстваў і народаў, арыентуе на вывучэнне такіх бакоў грамадскага жыцця, як каштоўнасці, нацыянальныя асаблівасці, духоўнае жыццё, псіхалогія і інш. | Пры паслядоўным прымяненні вядзе да таго, што становіцца немагчымым погляд на сусветную гісторыю як на адзіны заканамерны працэс гістарычнага развіцця чалавецтва ў цэлым; стварае магчымасць адасобленага разгляду народаў і грамадстваў |

**Удзельнікі гістарычнага працэсу.** Хто ж з'яўляецца асноўным удзельнікам гістарычнага працэсу? Хто, так бы мовіць, рухае гісторыю? Вядомы рускі пісьменнік М. М. Карамзін (1776—1826) лічыў, што «гісторыя ў нейкім сэнсе ёсць свяшчэнная кніга народаў: галоўная, неабходная; зярцала іх быцця і дзейнасці; скрыжаль адкрыццяў і правіл; запавет продкаў патомкам; дапаўненне, тлумачэнне сучаснасці і прыклад будучыні». Гэта можна зразумець так, што галоўнае ў гісторыі — дзейнасць народных мас і той вопыт, які яны з яе здабываюць.

Аднак народ кожнай краіны складаецца з розных грамадскіх груп, класаў з неаднолькавымі інтарэсамі. Калі яны дзейнічаюць згуртавана і ў згодзе, то становяцца самастойнымі і актыўнымі ўдзельнікамі гістарычнага працэсу. Пры гэтым кожны асобны чалавек выступае як прадстаўнік пэўнай супольнасці людзей (сацыяльнай групы, класа, нацыі і г. д.).

Ход гістарычных падзей, абумоўлены дзейнасцю грамадскіх груп, класаў і народных мас, у цэлым можа мець як эвалюцыйны, так і рэвалюцыйны характар.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Эвалюцыя* (ад лац. evolutio — разгортванне) — гэта паступовыя і разам з тым істотныя змяненні ў грамадскім жыцці.

*Рэвалюцыя* (ад фр. revolution — карэнны пераварот) — рэзкі, скачкападобны пераход да новага якаснага стану грамадства.

У грамадазнаўстве рэвалюцыя часта разумеецца як адносна хуткаплынны радыкальны палітычны пераварот, звязаны з гвалтоўнымі дзеяннямі, — у супрацьлегласць рэформам, г. зн. паэтапным, планамерным змяненням.

Рэвалюцыя ніколі не з'яўляецца рэзультатам змовы адзіночак. Яна можа ўзнікнуць толькі ў выніку прымнажэння аб'ектыўных перадумоў, з-за якіх пачынаюць рухацца вялікія сацыяльныя сілы і ўзнікае рэвалюцыйная сітуацыя. Рэвалюцыі заўсёды папярэднічае эвалюцыйны перыяд развіцця, калі нарастаюць праблемы і супярэчнасці, якія пільна патрабуюць вырашэння. Рэвалюцыя адбываецца таму, што прымальныя для большасці людзей вырашэнні гэтых праблем не былі знойдзены.

Выберуць удзельнікі гістарычнага працэсу шлях рэфармавання сістэмы грамадскіх адносін, паступовага іх змянення ці стануць на шлях рэвалюцыйнага насілля і крутой ломкі наяўнай арганізацыі грамадства, — шмат у чым гэта залежыць ад настрою думак, умення і жадання людзей прыходзіць да згоды, прадбачыць вынікі сваіх дзеянняў. Рэформы, як і рэвалюцыі, таксама патрабуюць вялікіх намаганняў і нават мужнасці. Рэфарматараў звычайна крытыкуюць за маруднасць, непаслядоўнасць, недастатковую эфектыўнасць пераўтварэнняў. Аднак рэфарматарскі шлях змянення грамадскага жыцця ўсё ж менш разбуральны і не выклікае такой злосці і жорсткасці ва ўдзельнікаў гістарычнага працэсу, як гэта характэрна для гвалтоўнага, рэвалюцыйнага, шляху.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Такім чынам, тлумачэнне гісторыі — гэта раскрыццё прычын, якія прымусілі ўдзельнікаў гістарычнага працэсу дзейнічаць менавіта так, а не інакш.

**Роля асобы ў гісторыі.** У гісторыі дзейнічае мноства людзей. Некаторыя з іх пакінулі ў ёй значны след, наклалі свой адбітак на ход гістарычных падзей і іх вынікі. Дзякуючы чаму гэта аказалася магчымым?

Асобны чалавек, стаўшы на чале дзяржавы, палітычнай партыі, народнага руху, можа значна паўплываць на ход падзей грамадскага жыцця ў тым выпадку, калі ён лепш за іншых разумее наспелыя грамадскія праблемы, ясна бачыць тыя сацыяльныя слаі, якія закліканы іх вырашыць, і прытым сам мае задаткі лідэра, арганізатара, здольнага згуртаваць людзей і весці іх за сабой. Пад *харызмай* (па-грэчаску charisma — міласць, ласка, божы дар) разумеюць выключную адоранасць чалавека. Харызматычным лідэрам называюць таго, хто ў якасці прарока, прапаведніка ці палітычнага дзеяча мае незвычайную здольнасць уздзейнічаць на людзей, пераконваць іх у правільнасці таго шляху, які ён прапаноўвае.

Любая, нават самая яркая і таленавітая асоба дзейнічае ў пэўных умовах і не здольная адмяніць іх па сваёй волі. Спецыфічныя рысы асобы палкаводца, палітычнага лідэра, творцы новай рэлігіі, выдатнага навукоўца ці мастака ўплываюць на форму працякання адпаведных працэсаў. Але нават геній не здольны ажыццявіць тое, што супярэчыць законам прыроды ці радыкальна разыходзіцца з гістарычным досведам людзей, іх імкненнямі, спадзяваннямі і магчымасцямі.

Гістарычная асоба лепш за іншых здольная вызначыць наяўныя магчымасці, улавіць тэндэнцыі, якія фарміруюцца ў грамадскім жыцці, у эканоміцы, культуры, і ўзначаліць рух па рэалізацыі гэтых магчымасцей. Выдатны вынаходнік спалучае разам тыя ідэі, якія быццам луналі ў паветры, і надае ім ясную, пераканаўчую форму, што дазваляе паспяхова рэалізаваць творчую задуму. Так працаваў, напрыклад, амерыканскі вынаходнік

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Т. А. Эдысан (1847—1931). Выдатны палітык кажа людзям тое, да чаго яны звычайна ўжо ўнутрана гатовы, і аб'ядноўвае іх для вырашэння задачы, важнасць якой яны здольныя зразумець і прыняць. Прыкладам можа служыць першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка.

Вялізны ўклад у гістарычны працэс уносяць не толькі дзяржаўныя дзеячы, але і геніяльныя асобы, працаўнікі навукі, тэхнікі, філасофіі, літаратуры, мастацтва, рэлігійнай думкі. Чалавецтва заўсёды будзе шанаваць імёны Платона і Арыстоцеля, Леанарда да Вінчы і Рафаэля, Ньютана і Мендзялеева, Шэкспіра і Пушкіна, Бетховена і Чайкоўскага. Іх творчасць пакінула вельмі глыбокі след у гісторыі сусветнай культуры.

**Некаторыя высновы**

1. Пры вывучэнні гісторыі важна не толькі зафіксаваць факты, але і зразумець інтарэсы і мэты ўдзельнікаў гістарычнага працэсу. 2. У навуцы склаліся два асноўныя падыходы да асэнсавання гістарычнага працэсу: фармацыйны і цывілізацыйны. 3. Ход гістарычных падзей можа мець як эвалюцыйны, так і рэвалюцыйны характар. 4. Творцамі гісторыі і галоўнымі ўдзельнікамі гістарычнага працэсу з'яўляюцца народныя масы. 5. Геніяльнасць гістарычнай асобы заключаецца ва ўменні вызначыць наяўныя магчымасці, улавіць наспеслыя змяненні ў грамадстве і ўзначаліць рух па ператварэнні гэтых магчымасцей у рэальнасць.

?! ***Пытанні і заданні***

1. На думку М. В. Ламаносава (1711—1765), навукоўцы, паэта і філасофа, гісторыя «дае гасударам прыклады праўлення, падданым — пакорнасці, воінам — мужнасці, суддзям — правасуддзя, малодшым — старэйшых розум, сталым людзям — асаблівую цвёрдасць у парадах, кожнаму —

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

незласлівую забаву, з невымоўнаю карысцю спалучаную». А ў чым карысць ад вывучэння гісторыі бачыце вы?

2. Падбярыце прыклады да пададзеных значэнняў слова «гістарычны»:

   а) гістарычны — які адносіцца да часу, ад якога захаваліся рэчавыя помнікі;

   б) гістарычны — важны для гісторыі, знамянальны, які ўвайшоў у гісторыю;

   в) гістарычны — які рэальна існаваў, нявыдуманы;

   г) гістарычны — які апісвае падзеі мінулага ў іх паслядоўным развіцці.

3. Расійскі гісторык В. В. Ключэўскі (1841—1911) бачыў у гісторыі настаўніцу, якая «вучыць нават тых, хто ў яе не вучыцца; яна правучвае іх за неадукаванасць і пагарджанне...». Як вы гэта разумееце? Прывядзіце прыклады.

## § 7. Рэальны гуманізм

**Ідэя гуманізму.** Лацінскае слова humanus азначае «чалавечны».

*Гуманізм* — гэта светапоглядная ідэя, якая сцвярджае годнасць і самакаштоўнасць чалавека, яго свабоду і правы на шчасце.

Сучасны гуманізм зарадзіўся ў эпоху Адраджэння, калі ў Італіі, а потым у іншых краінах узнік рух, скіраваны супраць духоўнага ўсеўладства царквы. Гуманісты гэтай эпохі абвяшчаюць чалавека найвышэйшай з усіх жывых істот, сцвярджаюць, што ён здольны пазнаваць свет і заклікаюць ствараць новае, атрымліваць асалоду ад жыцця і духоўна ўдасканальвацца.

Перадумовы такога разумення прызначэння чалавека і яго месца ў свеце ўзніклі яшчэ ў антычнасці. У Старажытнай Грэцыі сфарміравалася перакананне ў тым, што свабодныя людзі павінны не толькі многае ведаць пра сябе і пра свет у цэлым, але і ўмець кіраваць

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

сабой, быць гарманічна развітымі. У Сярэднія вякі пытанню прызначэння чалавека таксама надавалася вялікая ўвага. Праўда, гэта прызначэнне бачылі ў служэнні Богу, у пакорлівасці і падпарадкаванасці розуму веры. Эпоха Араджэння і эпоха Асветы напоўненыя заклікамі вызваліць чалавечы розум ад духоўных ланцугоў. Свабода чалавека звязвалася пры гэтым з правам на прыватную ініцыятыву і прадпрыемлівасць, з апорай на ўласны розум пры арганізацыі як асабістага, так і грамадскага жыцця.

Лічачы сябе цэнтрам светабудовы, чалавек пакараў прыроду, ствараючы для гэтага магутную тэхніку і развіваючы навуку. Адваротным бокам навукова-тэхнічнага прагрэсу стала раскраданне прыродных рэсурсаў і забруджванне навакольнага асяроддзя. Новы час — гэта перыяд перамогі духу прадпрымальніцтва і разам з тым нарастання сацыяльнай няроўнасці; гэта эпоха рэвалюцый і разбуральных войнаў. Трагічныя падзеі XX ст. наглядна паказалі, што ўсеахопнае змяненне матэрыяльных аспектаў жыцця, развіццё вытворчасці і навукі, умацаванне ваеннай моцы дзяржаў зусім не гарантуюць гуманізацыю грамадскіх зносін. У нашы дні, як і ў эпоху Адраджэння, востра стаіць пытанне пра сапраўдны, рэальны гуманізм.

Гуманізаваць трэба перш за ўсё дзейнасць дзяржавы. Яе магутнасць не павінна быць звязана толькі з гонкай узбраення і ваеннымі сутыкненнямі, якія маюць трагічныя вынікі і пагражаюць чалавечаму шчасцю. Нястрымная пагоня за прыбыткам таксама спрыяе дэгуманізацыі, г. зн. абесчалавечванню грамадскага жыцця, уносіць у яе нестабільнасць, выклікае крызісы і робіць чалавека бездапаможным «вінцікам» велізарнай і бяздушнай эканамічнай сістэмы. Эканоміка, якая выкарыстоўвае найноўшыя дасягненні навукі і тэхнікі, павінна быць нацэлена на карысць чалавека. Таму важна вывучаць рэальны вопыт стварэння ўмоў, спрыяльных для развіцця чалавека і грамадскага прагрэсу.

**Асноўныя палажэнні ідэалогіі беларускай дзяржавы.** *Ідэалогія беларускай дзяржавы* — гэта сукупнасць ідэй і

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ідэалаў, якія адлюстроўваюць нацыянальна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, характарызуюць асноўныя мэты сучаснага развіцця беларускага грамадства. Дзяржаўная ідэалогія павінна спрыяць устойліваму сацыяльна-эканамічнаму і духоўнаму развіццю Рэспублікі Беларусь, умацаванню грамадскай згоды.

Ідэалогія беларускай дзяржавы ахоплівае асноўныя сферы грамадскага жыцця — эканамічную, палітыка-прававую, сацыяльную і духоўную. У кожнай з гэтых сфер яна вызначае самыя важныя задачы практычнай дзейнасці і шляхі аб'яднання нашага грамадства з мэтай умацавання краіны, яе пастулальнага развіцця. Беларусаў аб'ядноўвае любоў да бацькаўшчыны, імкненне забяспечыць яе эканамічны дабрабыт, сапраўдны дэмакратызм, абарону правоў чалавека, нацыянальную бяспеку, росквіт беларускай культуры.

Прававой асновай ідэалогіі беларускай дзяржавы з'яўляецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь; сацыяльна-эканамічнай асновай — беларуская эканамічная мадэль, арыентаваная на павышэнне ўзроўню і якасці жыцця людзей шляхам інавацыйнага развіцця, якое падтрымліваецца дзяржавай. Да духоўных каштоўнасцей, што аб'ядноўваюць нашых суайчыннікаў, адносяцца ўзаемапавага людзей з рознымі перакананнямі і вераваннямі, калі яны не супярэчаць закону, а таксама грамадзянскасць і патрыятызм. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь — заканадаўчая аснова практычнага, дзейснага гуманізму.

Гуманістычную сутнасць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь найвыразней раскрывае артыкул 2, які абвяшчае:

«Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы.

Дзяржава адказная перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы. Грамадзянін адказны перад дзяржавай за няўхільнае выкананне абавязкаў, якія ўскладзены на яго Канстытуцыяй».

У раздзеле II Канстытуцыі, які называецца «Асоба, грамадства, дзяржава», падрабязна выкладзены найважнейшыя правы і свабоды грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ




*Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь*

У ім адзначаецца, што кожны грамадзянін нашай краіны мае права на годны ўзровень жыцця. Пры гэтым дзяржава абараняе жыццё чалавека ад любых супрацьпраўных замахаў.

Дзяржава гарантуе правы і свабоды людзей, замацаваныя ў Канстытуцыі і законах краіны, а таксама прадугледжаныя яе міжнароднымі абавязацельствамі. У шэрагу эканамічных, сацыяльных і культурных правоў асаблівае значэнне мае права на працу, якая з'яўляецца найбольш годным спосабам самасцвярджэння чалавека. Гэта прадугледжвае права на выбар прафесіі і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй і з улікам грамадскіх патрэбнасцей.

Велізарнае значэнне мае таксама права на адукацыю, якое гарантавана даступнасцю і бясплатнасцю агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Канстытуцыя

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

гарантуе нашым грамадзянам права на ахову здароўя, на сацыяльнае забеспячэнне ў выпадках, прадугледжаных законам.

Кожнаму грамадзяніну гарантуецца права на ўласнасць і яе недатыкальнасць, калі гэта ўласнасць набыта законным спосабам.

Канстытуцыя абвяшчае права кожнага чалавека захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць і недапушчальнасць знявагі нацыянальнай годнасці. Усе людзі маюць права карыстацца роднай мовай і выбіраць мову зносін.

Гарантуецца права кожнага чалавека самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, а таксама свабода думкі і перакананняў. Да найважнейшых асабістых, грамадзянскіх і палітычных правоў адносяцца таксама свабода і недатыкальнасць асобы, якія могуць быць абмежаваны толькі ў выпадках і ў парадку, вызначаным законам. Гарантуецца свабода сходаў, мітынгаў і г. д., свабода аб'яднанняў, права грамадзян на ўдзел у вырашэнні дзяржаўных пытанняў.

Гэтым і некаторым іншым асноватворным правам адпавядаюць абавязкі: выконваць Канстытуцыю, законы краіны, паважаць яе нацыянальныя традыцыі, гісторыка-культурную і духоўную спадчыну, абараняць сваю Радзіму.

**Сацыяльная арыентаванасць беларускай эканомікі.** Беларуская эканамічная мадэль прадугледжвае пастаянны клопат аб павышэнні ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва. Самы важны сродак дасягнення гэтай мэты — заработная плата. Яна становіцца галоўным фактарам, які стымулюе працоўную актыўнасць грамадзян.

*Узровень жыцця* абумоўлены перш за ўсё памерамі даходаў. *Высокая якасць жыцця* азначае, што чалавек не толькі атрымлівае дастойную заработную плату, але і адчувае сацыяльную абароненасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні, мае магчымасці для рэалізацыі свайго духоўнага патэнцыялу.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Сацыяльная палітыка беларускай дзяржавы прадугледжвае падтрымку тых людзей, якія з-за рэальных прычын не могуць удзельнічаць у грамадскай вытворчасці (пенсіянеры, дзеці, інваліды) ці знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Вельмі важна, што ў Беларусі ўдалося не дапусціць значнага росту беспрацоўя. Тым, хто часова не мае працы, выплачваецца дапамога, а таксама даецца магчымасць прайсці перападрыхтоўку, асвоіць новыя прафесіі, запатрабаваныя на рынку працы.

У краіне планамерна развіваецца сфера сацыяльнага абслугоўвання. Створана сетка ўстаноў, якія дапамагаюць старым, інвалідам, дзецям без апекі бацькоў. Удасканальванне пенсійнай сістэмы скіравана на забеспячэнне больш высокага ўзроўню жыцця пенсіянераў. Пенсіі перыядычна павышаюцца.

Паспяхова рэалізуецца праграма «Дзеці Беларусі». У ёй намечаны шэраг канкрэтных мер па аказанні дапамогі дзецям-інвалідам і дзецям-сіротам, прафілактыцы дзіцячай злачыннасці і наркаманіі, распрацоўцы і выпуску высакаякаснага дзіцячага харчавання, сацыяльнай падтрымцы беларускай сям'і. Сем'ям з дзецьмі выплачваецца дзяржаўная дапамога.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гг. у краіне намечана стварэнне каля паўтары тысячы аграгарадкоў. Кожны аграгарадок — гэта добраўпарадкаваны населены пункт з усімі неабходнымі аб'ектамі вытворчай і сацыяльнай інфраструктуры для забеспячэння камфортнага жыцця сельскіх працаўнікоў.

Паслядоўна ажыццяўляюцца таксама праграмы развіцця малых і сярэдніх гарадоў. Сёння ў Рэспубліцы Беларусь больш за 180 малых гарадоў, у якіх жывуць сотні тысяч чалавек. Людзям тут патрэбны стабільная і перспектыўная праца, належны заробак. Прадпрыемствы ў малых гарадах тэхнічна пераасншчаюцца, перапрафілююцца на вытворчасць запатрабаванай рынкам канкурэнтаздольнай прадукцыі. У выніку будзе забяспечана выраўноўванне якасці жыцця людзей на ўсёй тэрыторыі краіны.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Утульны, цёплы дом ці кватэра — важны фактар якасці жыцця як асобнага чалавека, так і яго сям'і. Па размаху будаўніцтва жылля Рэспубліка Беларусь лідзіруе ў СНД. У нашай краіне забяспечаны канстытуцыйныя правы грамадзян на бясплатнае медыцынскае абслугоўванне і даступную медыцынскую дапамогу, якую аказваюць больш за 700 бальніц, каля 2000 амбулаторна-паліклінічных устаноў.

У Рэспубліцы Беларусь больш за 22 тысячы спартыўных збудаванняў. Прыхільнікамі здаровага ладу жыцця, удзельнікамі спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых і турыстычных мерапрыемстваў з'яўляюцца больш за трэць людзей актыўнага працаздольнага ўзросту.

У краіне функцыянуе болей як 9 тысяч устаноў культуры. Паспяхова ажыццяўляецца рэканструкцыя і тэхнічнае пераасначшчэнне ўсіх дзяржаўных тэатраў і цыркаў. Асаблівая ўвага надаецца развіццю адукацыі. Беларусь па праве ганарыцца сваёй агульнаадукацыйнай школай, сістэмай прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. Большасць выпускнікоў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў атрымлівае дзве і больш прафесіі. Гэта вельмі дапамагае ім пры ўладкаванні на працу. Установы адукацыі поўнасцю забяспечваюць патрэбнасці краіны ў рабочых, служачых і спецыялістах.

## Некаторыя высновы

1. Ідэалогія беларускай дзяржавы выражае гістарычны вопыт нашага народа і раскрывае асноўныя мэты сучаснага развіцця беларускага грамадства. 2. Гуманістычная сутнасць беларускай дзяржавы вызначана ў Канстытуцыі краіны — прававой аснове яе ідэалогіі. 3. Ключавая характарыстыка беларускай эканамічнай мадэлі — сацыяльная скіраванасць. 4. Клопат пра чалавека, абарона яго свабод, правоў і годнасці асобы — вызначальныя рысы рэальнага гуманізму.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## ?! *Пытанні і заданні*

1. Абапіраючыся на матэрыялы курса гісторыі, ахарактарызуйце погляды гуманістаў эпохі Адраджэння.
2. Як вы лічыце, ці можна казаць пра хрысціянскі гуманізм?
3. Якія пагрозы рэальнаму гуманізму, на ваш погляд, існуюць у сучасным свеце?
4. У чым асноўны змест ідэалогіі беларускай дзяржавы?
5. Ахарактарызуйце асноўныя правы і свабоды грамадзян, выкладзеныя ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
6. У чым выяўляецца сацыяльная арыентаванасць беларускай эканомікі?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Практыкум

1. У кнізе, складзенай паслядоўнікамі старажытнакітайскага мысліцеля Лаа-цзы (IV—III ст. да н. э.), ёсць такі тэкст.

«Ян Чыжу сказаў: «Чалавек падобны на неба і зямлю і, як і яны, хавае ў сабе прыроду пяці рухальных пачаткаў. Чалавек — самая разумная сярод усіх істот, надзеленых жыццём. І ў той жа час пазногці і зубы чалавека недастаткова дужыя, каб забяспечыць яму ахову і абарону; мускулы і скура недастаткова крэпкія, каб абараняць яго і адбіваць удары; ногі недастаткова хуткія, каб унесці ад небяспекі. У чалавека няма ні поўсці, ні пёраў, якія б баранілі яго ад холаду і спёкі, і, каб пракарміцца, ён вымушаны разлічваць не на сілу, а на розум. Таму чалавек высока цэніць розум і з пагардай ставіцца да сілы, бо розум забяспечвае яго існаванне, а агідная сіла чыніць гвалт над знешнімі рэчамі».

Растлумачце, як розум чалавека кампенсуе недахоп сілы і прыродных сродкаў абароны. Ці згодны вы з тым, што чалавека характарызуе перш за ўсё розум, а не сіла?

2. Нямецкі філосаф Людвіг Феербах (1804—1878) пісаў:

«У чым жа заключаецца сутнасць чалавека, якую ён усведамляе? Якія адметныя прыкметы сапраўды чалавечага ў чалавеку?

Розум, воля і сэрца.

Дасканалы чалавек мае сілу мыслення, сілу волі і сілу пачуцця. Сіла мыслення ёсць святло пазнання, сіла волі — энергія характару, сіла пачуцця — любоў. Розум, любоў і сіла волі — гэта дасканаласці. У волі, мысленні і пачуцці заключана найвышэйшая, абсалютная сутнасць чалавека як такога і мэта яго існавання».

Чаму, на ваш погляд, Л. Феербах менавіта так вызначыў сутнасць чалавека?

3. Даследчыкі адзначаюць, што традыцыйна ў беларускай сям'і для выхавання дзяцей выкарыстоўваўся перш за ўсё станоўчы прыклад маці, бацькі і старэйшых членаў сям'і, а таксама наступныя метады:

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

• унушэнне маленькім дзецям розных правіл і патрабаванняў з дапамогай калыбельных песень, забаў, казак, напоўненых бацькоўскай любоўю;

• уключэнне дзяцей з самых ранніх гадоў у гаспадарча-працоўную дзейнасць, гутаркі і сустрэчы са старэйшымі і равеснікамі;

• удзел бацькоў і старэйшых членаў сям'і ў выбары дзецьмі адказных рашэнняў;

• падтрымка дзяцей з мэтай выхавання пачуцця ўласнай годнасці і такіх маральных якасцей, як дабрыня, працавітасць, стараннасць, паслушэнства, павага да старэйшых членаў сям'і і да іншых людзей;

• намёк (прамы ці ўскосны) — этычны і карэктны спосаб паказу дзецям іх недахопаў і пралікаў у паводзінах і дзейнасці;

• папрок — перадача бацькамі як словам, так і поглядам, жэстамі, мімікай незадаволенасці ўчынкамі і паводзінамі дзяцей;

• выпрабаванне як спосаб праверкі падрыхтаванасці дзяцей да самастойнага працоўнага жыцця, да выканання маральных правіл і нормаў жыцця свайго народа;

• благаславенне — комплекс бацькоўскіх настаўленняў, павучэнняў, перасцярог, наказаў і просьбаў для дзяцей у самыя адказныя перыяды іх жыцця (пераход да самастойнай працоўнай дзейнасці, служба ў арміі, жаніцьба ці замужжа).

Ахарактарызуйце гэтыя метады з пункту гледжання іх дзейснасці, важнасці для далейшага жыцця дзяцей, гуманнасці. Якія з названых метадаў выкарыстоўваюцца ў вашай сям'і?

4. Пазнаёмцеся з асноўнымі палажэннямі Канвенцыі аб правах дзіцяці: Дзяржавы — удзельнікі Канвенцыі паважаюць права дзіцяці на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі (арт. 14), права дзіцяці на свабоду аб'яднанняў і свабоду мірных сходаў (арт. 15) пры ўмове выканання прынятых у грамадстве законаў, права дзіцяці на адпачынак і вольны час, права ўдзельнічаць у гульнях і забаўляльных мерапрыемствах, што адпавядаюць яго ўзросту, і свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці, займацца мастацтвам

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

(арт. 31); права на абарону ад эканамічнай эксплуатацыі і ад выканання любой работы, якая можа быць небяспечнай для яго здароўя ці служыць перашкодай для атрымання ім адукацыі альбо наносіць шкоду яго здароўю і фізічнаму, разумоваму, духоўнаму, маральнаму і сацыяльнаму развіццю (арт. 32).

Як гэтыя палажэнні рэалізуюцца ў Рэспубліцы Беларусь?

5. Супастаўце наступныя выказванні і знайдзіце падабенства і прынцыповыя адрозненні ў падыходах да вызначэння сутнасці гісторыі:

- М. Г. Чарнышэўскі (1828—1889): «Можна не ведаць, не мець схільнасці да вывучэння матэматыкі, грэчаскай ці лацінскай моў, хіміі, можна не ведаць тысячы навук і ўсё-такі быць адукаваным чалавекам; але не любіць гісторыі можа толькі чалавек, зусім не развіты разумова».
- Р. В. Пляханаў (1856—1918): «Гісторыя — велізарныя могілкі: мёртвых у ёй больш, чым жывых. Але гэтыя велізарныя могілкі, на якіх спачывае мінулае, ёсць у той жа час калыска, у якой ляжыць будучыня. Таму, хто «памятае сваяцтва», не пашкодзіць часам прайціся па гэтых могілках: тое, што было, аблягчае разуменне таго, што будзе».
- Р. Ю. Віпер (1859—1954): «Не гісторыя вучыць разумець і будаваць жыццё, а жыццё вучыць тлумачыць гісторыю. Такую гісторыю мы самі перажываем... Нашы суджэнні пра мінулае, нашы гістарычныя меркаванні даводзіцца ўвесь час пераглядаць, крытыкаваць і браць пад сумненне, замяняць адны палажэнні іншымі, часам адваротнымі. Гісторыя з настаўніцы стала вучаніцай жыцця...»
- Сучасны публіцыст У. Б. Кобрын: «Калі б людзі атрымлівалі вопыт з гісторыі, то наўрад ці за Першай сусветнай вайной адбылася Другая. Наўрад ці пасля гітлераўскага генацыду маглі ўзнікнуць неафашысцкія арганізацыі. Катаклізмы дзяржаўнага ці сусветнага маштабу часам нібыта абвяргаюць агульнапрынятыя ўстаноўкі пра карысць, сэнс і прызначэнне гісторыі...»

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

6. Рускі філосаф Л. П. Карсавін (1882—1952) лічыў, што суб'ектам гісторыі з'яўляецца ўсё чалавецтва, якое выступае як рэальная «сімфанічная асоба», што існуе ў культурах, народах, класах, групах, аж да канкрэтнай індывідуальнасці.

Як вы разумееце гэта сцвярджэнне?

7. У «Слоўніку рускай мовы» С. І. Ожагава каля 1500 слоў азначаюць уласцівасці асобы. Як бы вы растлумачылі гэты факт? Правядзіце ў класе конкурс «Хто назаве больш уласцівасцей асобы?». Высветліце, якіх слоў больш — пра станоўчыя ці адмоўныя рысы чалавека, пра яго цялесныя ці духоўныя якасці.

8. Прааналізуйце наступныя выказванні пра чалавека:

• «Чалавек становіцца чалавекам толькі праз мову» (В. Гумбальт);

• «Чалавек адрозніваецца ад усіх іншых стварэнняў здольнасцю смяяцца» (Д. Адысан).

• «Чалавек робіць тое, што яму кажуць. Большасць жывёл — не» (Э. Берн).

• «Чалавек — адзіная жывёліна, паводзіны якой у значнай ступені абумоўлены думкай» (Дж. Колінгвуд).

Якія з гэтых выказванняў падаюцца вам найбольш пераканаўчымі? Чаму?

9. Згодна з фармацыйным падыходам, гістарычны працэс разглядаецца як заканамерны, вызначаны ў канчатковым выніку эканамічнымі фактарамі, універсальны, стадыяльны, прагрэсіўны. На падставе ўжо вывучанага гістарычнага матэрыялу пацвердзіце ці абвергніце гэтыя палажэнні.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Урок абагульнення

1. Якія ўмовы неабходныя для таго, каб стаць асобай?

2. У чым, на ваш погляд, заключаецца роля сям'і ў жыцці чалавека і грамадства?

3. Назавіце і ахарактарызуйце асноўныя формы ўзаемасувязі чалавека і грамадства.

4. Што такое гістарычны працэс?

5. Як вы разумееце сувязь мінулага, сучаснага і будучыні ў гісторыі краін і народаў? Прывядзіце прыклады.

6. Абапіраючыся на веды па гісторыі, літаратуры, іншых прадметах, прывядзіце прыклады для характарыстыкі ролі народа ў гістарычным працэсе.

7. Ці вернае сцвярджэнне, што светапогляд можа мець не толькі канкрэтная асоба, але і сацыяльная група, нацыя, гістарычная эпоха? Растлумачце сваё меркаванне, пацвердзіце яго прыкладамі.

8. Расійскі гісторык В. В. Ключэўскі (1841—1911) сцвярджаў, што веданне мінулага — «не толькі патрэбнасць здольнага думаць розуму, але і істотная ўмова свядомай і карэктнай дзейнасці», таму што гэта дае той вакамер становішча, той нюх хвіліны, якія засцерагаюць чалавека «як ад коснасці, так і ад паспешлівасці». І далей ён дае параду: «Вызначаючы задачы і кірунак сваёй дзейнасці, кожны з нас павінен быць хоць трохі гісторыкам, каб стаць свядомым і добрасумленна дзейным грамадзянінам».

Якое значэнне маюць гэтыя думкі В. В. Ключэўскага для нашых дзён?

9. Слова «цывілізацыя» і вытворныя ад яго могуць азначаць:

а) выхаванасць, уменне паводзіць сябе на людзях («гэта быў зусім цывілізаваны малады чалавек, з выдатнымі манерамі і абыходжаннем»);

б) стадыю грамадскага развіцця, наступную пасля дзікасці і варварства;

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

в) стан грамадства, які прызнае каштоўнасці міру, эканамічнага росквіту, волі, закону («у цывілізаваным грамадстве няма месца гвалту, злачыннасці, зневажанню закону, непавазе правоў чалавека»);

г) сукупнасць праяў культуры («антычная цывілізацыя — унікальная культура, якая ляжыць у аснове еўрапейскай культуры наступных эпох»);

д) сукупнасць унікальных эканамічных, сацыяльных, палітычных, духоўных, маральных, псіхалагічных, каштоўнасных і іншых структур, якія адрозніваюць адну гістарычную супольнасць людзей ад іншых («эканоміка, сістэма ўлады, каштоўнасці, лад жыцця і псіхалогія людзей Сярэднявечча адрознівалі гэтую цывілізацыю ад антычнай або сучаснай»).

Якія з гэтых значэнняў маюць непасрэднае дачыненне да характарыстыкі гістарычнага працэсу? Выкарыстайце дадзеныя палажэнні пры аналізе канкрэтных грамадстваў, вядомых вам.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Тэма 2. Культура чалавека і грамадства

## § 8. Роля культуры ў жыцці грамадства

**Паняцце культуры.** Слова «культура» знаёмае кожнаму з нас. Яно мае шмат значэнняў і шырока выкарыстоўваецца ў літаратуры, сродках масавай інфармацыі, паўсядзённым жыцці. Многія грамадскія і дзяржаўныя дзеячы раз-пораз указваюць на заняпад культуры, заклікаюць да яе адраджэння і пад'ёму, патрабуюць стварыць спрыяльныя ўмовы для яе развіцця.

Розныя людзі ўкладаюць у паняцце культуры неаднолькавы сэнс. Адны прыраўноўваюць культуру да адукаванасці, другія бачаць у культуры збор назапашаных каштоўнасцей духоўнага жыцця, трэція вызначаюць культуру перш за ўсё па дасягнутым узроўні маральнага развіцця людзей. У паўсядзённым маўленні гэта слова звязана таксама з уяўленнямі пра палацы і паркі культуры, пра культуру абслугоўвання і культуру побыту, пра музеі, тэатры, бібліятэкі, нарэшце, пра фізічную культуру. Аднак змест паняцця «культура» значна разнастайнейшы і багацейшы. Акрамя таго, гэта паняцце прайшло такі ж доўгі шлях развіцця, як і сама гісторыя чалавецтва.

Слова «культура» (ад лац. cultura — апрацоўка зямлі; выхаванне, адукацыя, развіццё) з'явілася ў Старажытным Рыме і выкарыстоўвалася ў некалькіх значэннях. Адно з іх — «спосаб выхавання чалавека-грамадзяніна, дастойнага члена грамадства». Гэта разуменне супадала са старажытнагрэчаскім «пайдэя» — «выхаванне ў адпаведнасці з традыцыямі народа, з яго жыццёвымі правіламі». Гуманістычная і дэмакратычная скіраванасць пайдэі дазволілі еўрапейскай культуры заняць адно з вядучых месцаў у свеце. У Сярэднявеччы культура абазначала ўменне вытлумачваць і разумець тэксты Святога Пісьма. Пры гэтым галоўнай задачай было спасціжэнне Бога і чалавечага лёсу, які залежыць ад Бога.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Па меры назапашвання ведаў пра грамадскае жыццё і шматстайнасць працэсаў у ім узнікалі новыя азначэнні культуры. Адна з такіх спроб была зроблена ў эпоху Асветы. У XVIII ст. слова «культура» стала шырока выкарыстоўвацца для абазначэння спецыфічнага ладу жыцця чалавека, які адрозніваецца ад прыроднага быцця. Асветнікі разумелі культуру як сродак узвышэння чалавека, удасканалення духоўнага жыцця і маральнасці.

У сучаснай культуралогіі (навуцы пра культуру) існуюць два асноўныя падыходы да разумення культуры.

Прыхільнікі *антрапалагічнага падыходу* (ад грэч. ánthrōpos — чалавек) лічаць культурай усю сукупнасць вынікаў чалавечай дзейнасці, свет рэчаў, якія створаны людзьмі і супрацьстаіць прыродзе. Гэты свет створаны чалавекам для сваіх мэт і выражае адрозненне чалавечай жыццядзейнасці ад натуральных, біялагічных формаў жыцця. Неабходна таксама ўлічваць якасную своеасаблівасць гістарычных формаў дзейнасці людзей, якія ствараюць культуру на розных этапах грамадскага развіцця, у рамках пэўных эпох, нацыянальных супольнасцей і г. д.

З пункту гледжання *каштоўнаснага падыходу* культура разумеецца як сукупнасць самых лепшых, самых значных тварэнняў чалавека. Праўда, нярэдка іх каштоўнасць адносная. Так, для спецыялістаў, якія ствараюць ядзерную зброю, атамная бомба ўяўляе высакаякасны вынік. Але для большасці людзей цвярозага розуму яна — сродак знішчэння ўсяго жывога і сапраўды каштоўнага і таму не можа лічыцца каштоўнасцю культуры. Акрамя таго, каштоўнасны падыход звужае сферу культуры, адносячы да яе толькі станоўчыя рэзультаты дзейнасці людзей. Аднак такія негатыўныя з’явы, як злачыннасць, рабства, наркаманія, на жаль, суправаджаюць чалавечае жыццё, і культуру той ці іншай краіны немагчыма зразумець, калі іх ігнараваць.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Падсумоўваючы, можна даць наступнае азначэнне:

***Культура*** **— гэта спецыфічны чалавечы спосаб жыцця, што ўключае працэс і вынікі чалавечай дзейнасці, сістэму нормаў і каштоўнасцей, сімвалаў і ідэалаў, якія разглядаюцца ў кантэксце гістарычнай эпохі.**

Культура з'яўляецца складанай, шматпланавай з'явай. Яна пранізвае ўсе сферы жыцця і дзейнасці грамадства і чалавека. Культура — гэта і матэрыяльныя, і духоўныя каштоўнасці чалавека; яна характарызуе своеасаблівасць нацый і народаў; з'яўляецца ядром, асновай, «душой» грамадства.

У сваіх тварэннях чалавек увасабляе мэты, жаданні, імкненні. Культура выражае той сэнс, які мы ўкладаем ва ўсё, што робім. Пэўны сэнс маюць творы мастацтва, навуковыя даследаванні, навучанне, правілы этыкету, паводзіны чалавека і да т. п.

Створаныя прадметы не толькі выконваюць характэрныя для іх функцыі, але і маюць пэўнае дадатковае значэнне. Так, асноўная функцыя аўтамабіля — служыць сродкам перамяшчэння. Разам з тым для многіх гэта яшчэ і пытанне прэстыжу. Каб зразумець сэнс гістарычных помнікаў, неабходна вывучыць тую культуру, творам якой яны з'яўляюцца. Напрыклад, турысты, наведваючы Егіпет, могуць палюбавацца знешнім выглядам пірамід, навукоўцы — даследаваць іх фізіка-хімічны склад, памеры і г. д. Зразумець жа іх прызначэнне немагчыма без вывучэння гісторыі і культуры Старажытнага Егіпта. Вось чаму так важна ведаць сусветную гісторыю і гісторыю сваёй краіны.

Прадметы і з'явы культуры ўтрымліваюць вопыт чалавецтва. Універсальным знакавым сродкам захавання і перадачы вопыту з'яўляецца слова. Вуснае і пісьмовае маўленне дазваляюць перадаць практычна любы сэнс таму, хто валодае гэтай сістэмай знакаў.

Сярод знакаў асобнае месца займаюць сімвалы — знакі, якія служаць умоўным абазначэннем якога-небудзь вобраза

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ці ідэі. Напрыклад, помнік героям, палеглым у баях за Радзіму, служыць сімвалам патрыятызму народа. Без вывучэння адпаведных сістэм знакаў немагчыма авалодаць і дасягненнямі культуры. Далучаючыся да культуры, мы расшыфроўваем яе знакі і сімвалы, спасцігаючы, такім чынам, сэнс таго, што адбываецца.

Культура ўключае ў сябе вынікі чалавечай дзейнасці, *штучна* створаныя чалавекам прадметы і з'явы, якія прынята называць артэфактамі (ад лац. arte — штучны, factus — зроблены). Да іх належаць не толькі выробленыя чалавекам рэчы ды сродкі і спосабы дзеянняў, якія ён адкрыў і выкарыстоўвае, але і тыя змены, якія ён ажыццяўляе ў сваім фізічным і духоўным абліччы.

**Функцыі культуры**. Культура выконвае ў жыцці чалавека і грамадства цэлы шэраг функцый.

*Адаптыўная (прыстасавальная) функцыя* культуры заключаецца ў тым, што менавіта культура дазваляе людзям прыстасавацца да разнастайных прыродных умоў. Дзякуючы прыстасавальным магчымасцям культуры чалавек змог засяліць практычна ўсе куткі Зямлі — ад Паўночнага Запаляр'я да Антарктыды, прывык да разнастайных асаблівасцей клімату, рэльефу, расліннага і жывёльнага свету. Так, на Японскіх астравах, у зоне павышанай сейсмаактыўнасці, людзі здаўна будавалі дамы на лёгкім драўляным каркасе, абцягнутым паперай; эскімосы ж майстравалі свае жыллё са снегу і выдатна перажывалі ў ім халодныя палярныя зімы.

Яшчэ адна важная функцыя культуры праяўляецца ў накапленні, захаванні, сістэматызацыі і перадачы інфармацыі. Яе можна назваць *функцыяй гістарычнай пераемнасці*. Парушэнне гэтай функцыі тоіць у сабе сур'ёзную небяспеку для грамадства. Разрыў культурнай пераемнасці можа прывесці новыя пакаленні да страты сацыяльнай памяці, зрабіць іх людзьмі без роду, без племені.

*Каштоўнасная функцыя* культуры заключаецца ў тым, што яна фарміруе ў чалавека каштоўнасныя патрэбнасці і арыентацыі. Засвоеныя культурныя каштоўнасці да-

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

зваляюць адрозніваць значнае і нязначнае ў жыцці, берагчы тыя элементы культуры, якія гарманізуюць і ўдасканальваюць жыццё, і адмаўляцца, пазбаўляцца ад таго, што вядзе да дэградацыі асобы. Для грамадства ж захаванне каштоўнасцей культуры — залог стабільнага развіцця.

*Нарматыўная функцыя* культуры звязана з рэгуляваннем грамадскага жыцця. Яе выкананне абапіраецца на мараль і права і спрыяе засваенню людзьмі сукупнасці нормаў і правіл, якія рэгламентуюць іх паводзіны і дзейнасць.

*Камунікатыўная функцыя* культуры (ад лац. communicatio — раблю агульным; звязваю; гутару) забяспечвае ўзаемадзеянне паміж людзьмі і супольнасцямі, вядзе да выяўлення ўсяго каштоўнага, што назапашана чалавецтвам, дазваляе абменьвацца культурнымі здабыткамі, спрыяе працэсам інтэграцыі культур. Асабліва нагляднай яна становіцца ў сучасным свеце, калі на нашых вачах ствараецца адзіная культурная прастора ўсяго чалавецтва.

Пералічаныя вышэй асноўныя функцыі культуры ў рэальным жыцці цесна звязаны. І, зразумела, яны не вычэрпваюць усяго прызначэння культуры.

*Асноўнае прызначэнне культуры* — рабіць чалавека Чалавекам. Развіццё культуры дае магчымасць палегчыць працу і зрабіць яе творчай, узбагаціць розум і пачуцці. Спасціжэнне культуры — важная ўмова самаўдасканальвання і самаразвіцця асобы.

**Матэрыяльная і духоўная культура.** Культура мае вельмі складаную будову, уключае ў сябе мноства элементаў. Неапаўторнае іх спалучэнне стварае своеасаблівасць нацыянальных культур, а таксама «малых культурных светаў» — субкультур (маладзёжная, прафесійная і г. д.). (Падрабязней пра субкультуру мы пагаворым у наступным параграфе.)

Да элементаў *духоўнай культуры* адносяць правілы паводзін, эталоны, рытуалы, міфы, ідэі, сімвалы, мову, веды і інш. Духоўная культура ўключае ў сябе пазнавальную (інтэлектуальную), маральную, мастацкую, прававую, педагагічную, рэлігійную і іншыя формы жыцця людзей.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Капліца-пахавальня Паскевічаў у Гомелі* (1870—1889)

Жылыя дамы, прылады працы і хатнія рэчы, адзенне і вайсковая тэхніка, транспарт, камп'ютэры і многае іншае, створанае рукамі чалавека, з'яўляюцца элементамі *матэрыяльнай культуры*. У матэрыяльную культуру ўваходзяць: культура працы і матэрыяльнай вытворчасці, культура побыту, культура месца жыхарства (дома, вёскі, горада), культура стаўлення да ўласнага цела (правілы гігіены і г. д.), фізічная культура.

Матэрыяльная і духоўная культура цесна звязаны паміж сабой. Правесці мяжу між імі бывае складана. Напрыклад, тэхнічная ідэя па ўдасканаленні халадзільніка ці тэлевізара ўвасабляецца ў новых вырабах. Гэтым самым яна атрымлівае матэрыяльную форму і становіцца прадметам матэрыяльнай культуры. Калі ж ідэі пісьменніка, скульптара ці мастака не рэалізуюцца ў кнізе, скульптуры ці карціне, яны застануцца толькі агульнай задумай. Некаторыя віды мастацкай дзейнасці

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

адначасова належаць і да матэрыяльнай, і да духоўнай культуры. Напрыклад, архітэктура — гэта і мастацтва, і будаўніцтва. Мастацтва кіно і мастацтва фатаграфіі сталі магчымымі толькі дзякуючы адпаведным тэхнічным вынаходніцтвам.

Каштоўнасці матэрыяльнай культуры, як правіла, маюць пэўную цану, а таксама часавыя межы спажывання. Яны могуць «маральна састарэць», вытворчае абсталяванне зношваецца, будынкі руйнуюцца і г. д. Наадварот, каштоўнасць дасягненняў духоўнай культуры можа і не мець часавых рамак. Напрыклад, каштоўнасць жыцця, здароўя, кахання і сяброўства, ісціны і дабра прызнаюць на працягу ўсяго існавання чалавецтва.

## Некаторыя высновы

1. Культура з'яўляецца ядром, асновай, «душой» грамадства. Яна пранізвае ўсе сферы жыцця і дзейнасці чалавека. 2. Прыхільнікі антрапалагічнага падыходу лічаць культурай усё, што стварыў чалавек, прыхільнікі каштоўнаснага — толькі сукупнасць найлепшых тварэнняў чалавека. 3. Прадметы і з'явы культуры захоўваюць вопыт чалавецтва, адлюстроўваюцца ў знаках і сімвалах. 4. У культуры вылучаюць матэрыяльны і духоўны бакі, якія цесна звязаны.

## *Пытанні і заданні*

1. Чаму, на ваш погляд, паняццю «культура» нельга даць аднназначнае азначэнне?
2. Чым культура адрозніваецца ад прыроды?
3. Якую ролю адыгрывае культура ў жыцці грамадства?
4. Якога чалавека, на ваш погляд, можна назваць чалавекам высокай культуры?
5. Якое меркаванне пра суадносіны матэрыяльнага і духоўнага ў культуры ілюструе выказванне «Рукапісы не гараць, але кнігі растрэпліваюцца»? Ці згодны вы з гэтым меркаваннем?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## § 9. Грані культуры

**Элітарная і масавая культура.** У залежнасці ад узроўню развіцця культуры вылучаюць дзве яе формы — элітарную і масавую.

*Элітарная культура* — гэта культура прывілеяваных груп грамадства.

Яна характарызуецца духоўным арыстакратызмам і каштоўнасна-сэнсавай самадастатковасцю. Ствараюць яе прадстаўнікі прывілеяванай часткі грамадства (эліты) ці па іх замове прафесійныя творцы.

Культурную эліту грамадства трэба адрозніваць ад сацыяльнай арыстакратыі. Культурная эліта ў канчатковым выніку жыве для народа, а арыстакратыя ўзвышаецца над ім і звычайна адгароджваецца ад яго. Прадстаўнікі культурнай эліты бяруць на сябе адказнасць за найвышэйшае культурнае развіццё грамадства, у якім яны жывуць. Яны не баяцца працы і нават рызыкуюць дабрабытам, а часам і жыццём, адстойваючы свае ідэалы і творчую незалежнасць. Такім быў вялікі рускі паэт А. С. Пушкін, які шчыра жадаў быць «мілым народу», але не імкнуўся зліцца з ім і страціць сваю індывідуальнасць.

Нястомны творчы пошук, творчая свабода і імкненне да стварэння найвышэйшых каштоўнасцей культуры — вось адметныя рысы культурнай эліты. Як правіла, культурная эліта апераджае ўзровень успрымання яе сярэднеадукаваным чалавекам. Таму асабліва цяжкі лёс прадстаўнікоў культурнай эліты на пераломах гістарычных эпох, калі ўзмацняецца непрыманне любога іншадумства.

Элітарная культура знаходзіцца ў своеасаблівай апазіцыі адносна масавай культуры. Прадстаўнікі культурнай эліты спрабуюць разбурыць стэрэатыпы і шаблоны масавай культуры.

*Масавая культура* — гэта культура, арыентаваная на масавае штодзённае спажыванне.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*І. Я. Рэпін. Беларус* (1892)

Масавая культура ярка праявіла сябе ў ЗША на рубяжы XIX і XX ст. Вядомы амерыканскі палітолаг Збігнеў Бжэзінскі любіў паўтараць фразу: «Калі Рым даў свету пра́ва, Англія — парламенцкую дзейнасць, Францыя — культуру і рэспубліканскі нацыяналізм, то сучасныя ЗША далі свету навукова-тэхнічную рэвалюцыю і масавую культуру».

Масавая культура не дэманструе тонкі густ. Яе прадукцыя прызначана для спажывання масай, якая складаецца з сярэдніх, пасрэдных людзей. Яе прадстаўнік — чалавек без ясна акрэсленай індывідуальнасці, таму масавая культура даступная і зразумелая для ўсіх, незалежна ад узроўню адукацыі, узросту і нацыянальнасці. Распаўсюджванне масавай культуры непазбежна прыводзіць да зніжэння ўзроўню культуры ў цэлым, бо яна прыстасоўваецца да неразвітога, непатрабавальнага густу масавага чалавека. Газеты, кінематограф, радыё, тэлебачанне, камп'ютэрныя сеткі адразу ж пасля свайго з'яўлення ператварыліся ў механізмы распаўсюджвання і функцыянавання масавай культуры.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

З дапамогай сродкаў масавай камунікацыі і інфармацыі ў творцаў масавай культуры з'явілася магчымасць лёгка маніпуліраваць свядомасцю мільёнаў людзей. У адрозненне ад элітарнай культуры яна мае большую аўдыторыю, а ў адрозненне ад народнай — прадукты масавай культуры заўсёды маюць свайго аўтара. Аднак у масавай культуры няма традыцый, яна не звязана ні з якой пэўнай рэлігіяй ці інтарэсамі якогасьці аднаго сацыяльнага класа. Густы, якія выражае і абслугоўвае масавая культура, настолькі зменлівыя, што традыцыі не паспяваюць сфарміравацца. Таму ўзоры масавай культуры хутка губляюць актуальнасць, выходзяць з моды. Пры гэтым чым больш прымітыўныя і агульнадаступныя культурныя дасягненні, тым больш яны значаць для масы. У выніку развіцця масавых формаў культур абясцэньваецца высокая духоўнасць, расхістваюцца ці нават разбураюцца маральныя асновы.

Асноўнымі спосабамі ажыццяўлення сучаснай масавай культуры з'яўляюцца: сродкі масавай інфармацыі; масавыя палітычныя рухі; рэклама; мода; індустрыя фарміравання іміджу і паляпшэння фізічных даных індывіда (культурызм, аэробіка, турызм, фітнес, сфера медыцынскіх паслуг і фармацэўтычных сродкаў змянення знешнасці, полу і г. д.); індустрыя вольнага часу, якая ўключае ў сябе мастацкую культуру (прыгодніцкую, фантастычную, «бульварную літаратуру», асобныя жанры кіно, карыкатуры, коміксы ў выяўленчым мастацтве, поп-музыку, спорт як відовішча і інш.). У сучасным свеце масавая культура ахоплівае практычна ўсе сферы жыцця грамадства.

**Народная і прафесійная культура.** Народная культура ўключае казкі, песні, танцы, міфы і легенды. Яе ствараюць ананімныя творцы без прафесійнай падрыхтоўкі, іх імёны, як правіла, невядомыя. Народную культуру таксама называюць аматарскай. Яна пачала складвацца ў ранні перыяд гісторыі чалавецтва, які папярэднічаў з'яўленню першых дзяржаў. Народная культура ўвабрала ў сябе самыя старажытныя ўяўленні пра свет, рэлігійныя догмы і рытуалы. Усё гэта адлюстравалася ў фальклоры.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Фальклор* (ад англ. folk — народ, lore — веды) — гэта народная творчасць, мастацтва, якое стварае народ.

Важную ролю ў развіцці народнай культуры адыграла гумарыстычнае ўспрыняцце навакольнага свету. На гэтай аснове развіліся і існуюць такія віды фальклору, як народны анекдот, байка, сатырычная песня, казка, скамароства.

Асаблівае значэнне ў краінах Захаду набылі карнавалы — масавыя тэатралізаваныя гулянні. Дзякуючы карнавальным шэсцям людзей у масках сярэднявечнае грамадства здымала ўнутранае напружанне, падтрымліваўся класавы мір. Менавіта ў фальклоры ляжаць вытокі многіх сучасных відаў мастацтва. Народная культура стала асновай для фарміравання галоўных каштоўнасцей, прынцыпаў і традыцый сучаснай нацыянальнай культуры.

Адрозніваюць штодзённую і прафесійную культуру. Усе асноўныя віды чалавечай дзейнасці зарадзіліся ў нетрах штодзённага жыцця, але з цягам часу вылучыліся і аформіліся ў спецыялізаваныя прафесіі.

*Прафесійная культура* звязана з дзейнасцю асобных устаноў, прадпрыемстваў, спецыялістаў па арганізацыі матэрыяльнай і духоўнай вытворчасці. Па меры развіцця мастацтва, навукі і тэхнікі прафесіі пераўтварыліся ў самастойныя галіны дзейнасці са сваімі правіламі, традыцыямі і г. д. У сувязі з гэтым спатрэбілася максімальная канцэнтрацыя намаганняў спецыялістаў для вырашэння канкрэтных задач, іх адмысловая падрыхтоўка для дасягнення патрэбнага майстэрства. Калі мастак змог сам зарабіць сабе на жыццё толькі жывапісам, вучоны — навуковай дзейнасцю, інжынер — стварэннем і ўдасканаленнем тэхналогій, машын і механізмаў, тады і з'явіліся адпаведныя разнавіднасці прафесійнай культуры.



Слуцкі пояс

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У цяперашні час вынікі, атрыманыя дзякуючы прафесійнай культуры, не з'яўляюцца ўласнасцю выключна прафесіяналаў. У сучасным свеце звычайнаму чалавеку не абысціся без дасягненняў мастацтва, навукі і тэхнікі. Яны трывала ўвайшлі ў наша жыццё і для многіх людзей сталі штодзённасцю.

**Субкультура і контркультура.** Ва ўсіх грамадствах існуе мноства сацыяльных груп, якія маюць розныя культурныя каштоўнасці, традыцыі і г. д.

Сукупнасць каштоўнасцей, вераванняў, традыцый і звычаяў, якіх трымаецца большасць членаў грамадства, называецца *дамінуючай*, ці *пануючай*, *культурай*.

Сістэму нормаў і каштоўнасцей, якія адрозніваюць асобную сацыяльную групу ад большасці грамадства, называюць *субкультурай*.

Субкультура фарміруецца пад уплывам такіх фактараў, як сацыяльны статус, нацыянальная прыналежнасць, рэлігія, месца жыхарства. Каштоўнасці і нормы субкультуры ўздзейнічаюць на станаўленне асобы членаў адпаведнай групы. Прыкладам можа служыць уплыў на чалавека маладзёжнай субкультуры.

Часам большасць грамадства ставіцца да той ці іншай субкультуры з неадабрэннем ці недаверам. Гэта праблема можа ўзнікнуць нават і з паважанымі ў прынцыпе субкультурамі ўрачоў, навукоўцаў ці ваенных.

Ад дамінуючай культуры субкультура адрозніваецца мовай, поглядамі на жыццё, манерамі паводзін яе носьбітаў. Гэтыя адрозненні могуць быць выяўлены вельмі моцна, нават калі субкультура не супрацьстаіць дамінуючай культуры.

Субкультура, якая не проста арозніваецца ад дамінуючай культуры, але супрацьстаіць ёй, знаходзіцца ў канфлікце з дамінуючымі каштоўнасцямі і нормамі, мае назву *контркультура* (ад лац. contra — супраць).

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Контркультура звязана з адмаўленнем ці разбурэннем прынятых у грамадстве каштоўнасцей, нормаў і правіл. Часам гэта праяўляецца ў вандалізме — бессэнсоўным жорсткім разбурэнні таго, што стварылі людзі і што з'яўляецца набыткам культуры. Можна вылучыць наступныя яго віды:

1) матэрыяльны вандалізм — разбурэнне і апаганьванне цэркваў, святых месцаў, помнікаў культуры, каштоўных прыродных аб'ектаў;

2) духоўны вандалізм — разбурэнне веры, якая ўкаранілася ў душах людзей;

3) сістэмны вандалізм — разбурэнне сталых сістэм каштоўнасцей, адукацыі, выхавання, грамадскіх сувязей.

Вядома такая разнавіднасць контркультуры ў заходнім грамадстве, як багема. Найбольш яркі прыклад — хіпі 60-х гадоў XX ст. Яны вялі асацыяльны і амаральны лад жыцця і нярэдка заяўлялі, што пратэстуюць тым самым супраць вайны. Каштоўнасці контркультуры могуць быць прычынай працяглых канфліктаў у грамадстве, якія цяжка вырашыць. Часам гэтыя каштоўнасці і перакананні паступова пранікаюць у пануючую культуру і змяняюць яе. Так, доўгія валасы, мудрагелістасць у мове і адзенні, ужыванне наркотыкаў, характэрныя для хіпі, з часам шырока распаўсюдзіліся ў заходнім грамадстве.

Контркультура, бывае, нясе ў сабе не толькі адмоўны, але і пэўны станоўчы змест. Яна часта выражае пратэст супраць негатыўных з'яў у грамадстве. Аднак разам са шкодным яна вынішчае і карыснае, ператвараючыся часам у антыкультуру — нецярпімую і злосную крытыку любой культуры.

**Культура ў штодзённым жыцці.** Культура арганізуе чалавечае жыццё. Ва ўсіх сферах грамадства яна ў значнай меры ажыццяўляе тую ж функцыю, якую ў жыцці жывёл выконваюць генетычна запраграміраваныя паводзіны. Чалавек не можа існаваць без далучэння да той ці іншай культуры, яе каштоўнасцей, традыцый, ідэалаў.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Далучаючыся да культуры, дзіця ператвараецца ў паўнацэннага члена грамадства. Культура пранізвае ўсё штодзённае жыццё чалавека. У ёй можна вылучыць наступныя сферы:

1) *культура працы*: адказнае стаўленне да сваіх працоўных абавязкаў з'яўляецца асновай плённага развіцця асобы;

2) *культура побыту*: удасканальваючы свой побыт, чалавек пераўтварае сябе, робіць лепшым, прыгажэйшым свой невялікі кавалачак навакольнага свету;

3) *культура адпачынку*: адпачываючы ад працы, чалавек займаецца развіццём душы, далучаючыся да дасягненняў выяўленчага мастацтва, літаратуры і г. д.;

4) *фізічная культура*: цела чалавека — гэта важная частка нашага свету, а клопат пра яго — складальнік нашага клопату пра свет у цэлым.

Усе сферы культуры звязаны паміж сабой і цесна ўзаемадзейнічаюць. Яны з'яўляюцца цэласнай прасторай чалавечага жыцця. Так, ад характару працы і яе выніковасці залежыць арганізацыя побыту; з побытавымі ўмовамі звязана структура адпачынку, а ад скіраванасці на пэўны тып адпачынку залежыць узровень развіцця фізічнай культуры чалавека.

**Некаторыя высновы**

1. Элітарная культура ствараецца прадстаўнікамі творчай эліты і супрацьстаіць нізкаму густу і каштоўнасцям масавай культуры. 2. Народная культура ўяўляе з сябе аснову развіцця сучаснай нацыянальнай культуры. 3. Прафесійная культура развілася дзякуючы неабходнасці канцэнтрацыі намаганняў спецыялістаў на рашэнні канкрэтных задач пэўнага тыпу — навуковых, інжынерных і г. д. 4. У штодзённым жыцці культура праяўляецца ў сферах працы, побыту, адпачынку; важна і фізічная культура.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

### ?! *Пытанні і заданні*

1. Па меркаванні сучаснага іспанскага філосафа Х. Артэгі-і-Гасета, ёсць два тыпы людзей: 1) тыя, «хто строгі і патрабавальны да сябе, бярэ на сябе працу і абавязак», і 2) тыя, «хто задаволены сабой, хто жыве без намаганняў, не стараючыся сябе выправіць ці палепшыць, хто плыве па цячэнні». Каго з іх вы аднесяце да эліты, а каго — да прадстаўнікоў «масы»?
2. Якая, на ваш погляд, роля культурнай эліты ў грамадстве?
3. Назавіце асноўныя праяўленні масавай культуры.
4. Выдатны рускі філосаф М. М. Бахцін (1895—1975) параўноўваў сярэдневяковы карнавал з выманнем затычкі з віннай бочкі, дзякуючы чаму яе не разрывае газ, які там сабраўся. Як вы гэта разумееце?
5. Ці з'яўляецца субкультура неанацыстаў контркультурай у сучасным грамадстве? Прывядзіце прыклады контркультур.
6. Ці можна сказаць, што масавая культура — гэта форма страты чалавекам асобаснай культуры? Адказ абгрунтуйце.

## § 10. Пераемнасць у развіцці культуры

**Культура як механізм сацыяльнага наследавання.** Кожная культура прадугледжвае перадачу сацыяльнага вопыту, які ўвасабляецца ў ведах і спосабах працоўнай дзейнасці, звычаях і традыцыях, асноўных сімвалах і духоўных каштоўнасцях. Дзякуючы пераемнасці вопыту людзі авалодваюць дасягненнямі мінулага і атрымліваюць магчымасць, абапіраючыся на гэты фундамент, развіваць культуру далей.

Каб выкарыстаць назапашанае прадметнае і духоўнае багацце, новае пакаленне людзей павінна зразумець яго сэнс і прызначэнне, прымяніць яго да сваіх жыццёвых абставін. Так, у Старажытным Рыме была распрацавана дэтальная сістэма прававых нормаў, якія рэгулявалі розныя бакі жыцця людзей, асабліва маёмасныя адносіны. Рымскае права вывучаецца ў юрыдычных ВНУ і ў нашы дні.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Думкі і ўяўленні, прадстаўленыя ў знакавых сістэмах, што захоўваюць культурны набытак, калі аддзяляюцца ад чалавека, набываюць самастойнае, пазаасобаснае існаванне. Яны становяцца *сацыяльнай інфармацыяй*, носьбітам якой і з'яўляецца культура грамадства. Культура стварае спецыфічна чалавечы механізм наследавання духоўнага і практычнага вопыту. Дзякуючы ёй становіцца магчымым гістарычнае развіццё, якое заснавана на назапашванні і памнажэнні інфармацыі, патрэбнай людзям.

**Функцыі мовы ў культуры.** Культура ўключае ў сябе мноства знакаў і знакавых сістэм. Пры дапамозе іх ствараюцца культурныя «тэксты», у якіх адлюстроўваецца патрэбная людзям інфармацыя. «Тэкст» тут — не толькі пісьмовае паведамленне, але і любы аб'ект, які нясе важную інфармацыю. Ім могуць быць рэчы, звычай, танец, мастацкі твор. Напрыклад, для археолага залатыя ўпрыгажэнні, знойдзеныя пры раскопках, з'яўляюцца прадметамі старажытнай культуры. Яны цікавяць яго іменна як носьбіты гістарычнай інфармацыі, а для злачынца, які пераплаўляе іх у злітак і прадае, яны не больш як сродак нажывы.

Самай важнай з чалавечых знакавых сістэм з'яўляецца натуральная мова. Любая з некалькіх тысяч ранейшых ці сучасных натуральных моў — гэта знакавая сістэма, якая гістарычна склалася і з'яўляецца асновай культуры свайго народа. Ніякая іншая знакавая сістэма не можа зраўнавацца з ёй па сваім значэнні ў культурным наследаванні.

*Мова* — гэта спосаб выражэння думак, сродак зносін людзей, паказчык узроўню развіцця культуры грамадства і універсальны сродак афармлення, захавання і перадачы культурнай спадчыны, а таксама стварэння новых культурных каштоўнасцей.

Людзі, якія гутараць на адной мове, здольны разумець адно аднаго таму, што прытрымліваюцца адных і тых жа нормаў, якія вызначаюць будову маўлення. Разам з тым моўныя нормы не з'яўляюцца абсалютна жорсткімі. Яны дастаткова гібкія і зменлівыя, каб даць прастору

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

фантазіі і забяспечыць прыстасаванне мовы да ўсяго новага, што ўзнікае ў культуры. Кожная прынцыпова новая ідэя патрабуе адпаведных моўных сродкаў для яе тлумачэння. Так увайшлі ў мову многія навуковыя тэрміны, напрыклад, «кванты», «гены», «хвалі імавернасці» і інш.

Вынаходніцтва знакавых сістэм запісу інфармацыі — адно з самых буйных дасягненняў чалавечай думкі. Бяспісьменныя мовы маглі забяспечыць перадачу інфармацыі толькі таго аб'ёму ведаў, які фіксаваўся ў фальклоры і абмяжоўваўся магчымасцямі памяці жраца ці казачніка. Пісьменнасць жа дазваляе грамадству захоўваць і перадаваць інфармацыю, колькасць якой нашмат пераўзыходзіць аб'ём памяці асобнага чалавека. Тэксты, дакументы зберагаюцца ў архівах, бібліятэках, якія робяць назапашаныя веды даступнымі для таго, хто ўмее чытаць. Дзякуючы пісьменнасці становяцца магчымымі зносіны між людзьмі на вялікай адлегласці і ў розны час.

Па тым, як чалавек гаворыць, можна вызначыць узровень яго культурнага развіцця, індывідуальныя асаблівасці, характар. Маўленне чалавека — гэта яго «візітная картка».

Структура мовы разам з тым характарызуе псіхалагічныя асаблівасці народа. Напрыклад, англійская культура прадугледжвае, што чалавек можа адкрыта і недвухсэнсоўна выказваць уласнае меркаванне, і гэта адлюстроўваецца ў структуры і адметнасцях англійскай мовы. Японская культура, наадварот, абмяжоўвае магчымасць непасрэднага і адкрытага выяўлення чалавекам сваіх пачуццяў і жаданняў. Яна не заахвочвае таксама абмеркаванне пачуццяў і думак іншага чалавека. Пра іх суразмоўца павінен здагадацца. Гэтаму дапамагаюць пэўныя формы паводзін, блізкія да рытуалу.

Менавіта мова служыць асноўным сродкам перадачы культуры. Важнай асаблівасцю роднай мовы з'яўляецца тое, што на ёй практычна немагчыма развучыцца гаварыць, калі яе асноўны слоўнікавы склад, правілы маў-

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

лення засвоены ў дзіцячым узросце. Мова адыгрывае найважнейшую ролю ў набыцці і парадкаванні вопыту людзей. Як і ўся культура ў цэлым, яна назапашвае агульнапрынятыя значэнні. Перадумова зносін з дапамогай мовы — разуменне ўжытых слоў і выказванняў. Агульная мова яшчэ і падтрымлівае згуртаванасць, адзінства грамадства. Яна дапамагае людзям узгадняць свае дзеянні праз пераконванне, ухваленне ці асуджэнне.

Паміж людзьмі, якія размаўляюць на адной мове, амаль аўтаматычна ўзнікае не толькі ўзаемаразуменне, але і пэўнае спачуванне. У мове адлюстроўваюцца агульныя веды пра традыцыі грамадства, правілы арганізацыі паўсядзённага жыцця. Паколькі мова спрыяе фарміраванню адчування групавой еднасці, краіны на стадыі развіцця, у якіх існуюць племянныя дыялекты, вялікую ўвагу надаюць выпрацоўцы адзінай нацыянальнай мовы. Без гэтага цяжка дамагчыся згуртавання нацыі, змагацца з племяннной раз'яднанасцю.

Хоць мова з'яўляецца магутнай згуртавальнай сілай, яна здольная і разлучаць людзей. Група, якая выкарыстоўвае пэўную мову, нярэдка лічыць усіх, хто размаўляе на ёй, сваімі, а людзей, што гавораць на іншых мовах ці дыялектах, — чужымі. Напрыклад, моўныя адрозненні адыгралі важную ролю ва ўзнікненні пэўнай адчужанасці паміж англічанамі і французамі ў Канадзе.

Мова забяспечвае існаванне і развіццё ўсіх формаў праяўлення культуры — працоўнай дзейнасці, рэлігіі, філасофіі, адукацыі, навукі, тэхнікі, мастацтва і г. д. Разнастайнасць моў, уласцівых розным культурам, дазваляе кожнаму народу унікальным спосабам выяўляць не толькі свой гістарычны вопыт, але і агульначалавечыя каштоўнасці і сэнсы. Таму уніфікацыя моў, звядзенне ўсёй іх шматстайнасці да нейкага адзінага стандарту проста недапушчальныя.

З-за вядучай ролі мовы ў сацыяльным наследаванні культуры адной з галоўных задач грамадства з'яўляецца заўсёдны клопат пра выкананне граматычных правіл і захаванне яснай, выразнай, чыстай мовы. Без гэтага наша

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



Пітэр Брэйгель Старэйшы. *Вавілонская вежа* (каля 1563)

маўленне становіцца незразумелым, неразборлівым, яго сэнс няправільна ўспрымаецца.

**Культурная традыцыя.** У развіцці культуры ёсць дзве тэндэнцыі — да захавання назапашанага і да стварэння новага. Першая з гэтых тэндэнцый адлюстравана ў традыцыях.

*Традыцыя* (ад лац. traditio — перадача) — гістарычна выпрацаваныя веды, вопыт, формы і правілы паводзін, норавы, звычаі, абрады, якія пераходзяць ад пакалення да пакалення.

Кожная традыцыя нясе на сабе адбітак свайго часу. Але, аказаўшыся плённай, яна не памірае, а становіцца неабходнай і наступным пакаленням людзей. Такія традыцыі А. С. Пушкін назваў «разумнай даўнінай».

Не ўсё, што мы атрымалі ў спадчыну ад мінулага, называецца традыцыяй. Напрыклад, мы не спасылаемся на традыцыю, калі ўжываем розныя карысныя рэчы даўняга

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

паходжання ці калі трымаемся правіл маралі, граматычных нормаў мовы і г. д. Спасылка на традыцыю ці на працяглую гісторыю дарэчная тады, калі карыснасць пэўнай часткі спадчыны не зусім відавочная ці можа быць аспрэчаная. Калі ў грамадстве існуюць супрацьлеглыя інтарэсы, то і адпаведныя ім традыцыі ставяцца пад сумненне. Яны ацэньваюцца як прагрэсіўныя ці рэакцыйныя, спрыяльныя ці шкодныя для развіцця.

Спрэчка пра традыцыі абвастраецца ў пераломныя гістарычныя эпохі, калі сутыкаюцца погляды традыцыяналістаў, што апраўдваюць і абараняюць мінулы вопыт як каштоўны сам па сабе, і радыкалаў, што адмаўляюць традыцыі і аспрэчваюць залежнасць ад мінулага. Такая спрэчка вялася пры пераходзе ад феадалізму да капіталізму ў Заходняй Еўропе. Жыццё сярэдневяковага грамадства рэгулявалася традыцыямі. Прыхільнікі радыкальных пераўтварэнняў заклікалі разлічваць на ўласны розум і адкідаць усё, што перашкаджае прагрэсу. У сферы палітычнай ідэалогіі гэта адлюстравалася ў дыскусіі паміж кансерватарамі і лібераламі.

Жыццё, аднак, паказала, што нават самыя гарачыя, непрымірымыя радыкалы становяцца кансерватарамі пасля таго, як прыходзяць да ўлады. Устаноўлены імі новы грамадскі лад патрабуе абароны, таму пачынаюць ствараецца новыя традыцыі, складаюцца новыя легенды, шануюцца новыя героі. Без апоры на традыцыю, без пераемнасці ў культуры грамадства не можа існаваць і развівацца.

**Некаторыя высновы**

1. Асноўная функцыя культуры — парадкаванне, захаванне і перадача сацыяльнага вопыту. 2. Разнастайнасць моў нацыянальных культур — аснова дынамічнага развіцця сусветнай культуры. 3. Традыцыі захоўваюць тое, што адпавядае інтарэсам пэўных сацыяльных груп. Таму ўзнікаюць дыскусіі

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

аб прагрэсіўнасці ці рэакцыйнасці тых ці іншых традыцый. 4. Неабходна з павагай ставіцца да культурнай традыцыі свайго і іншых народаў, таму што на яе аснове развіваецца ўсё новае ў кожнай культуры.

?! ***Пытанні і заданні***

1. Уладзімір Высоцкі (1938—1980) пісаў:

   Чысціню, прастату ў даўніне мы бяром,
   Сагі, казкі — з гісторыі цягнем, —
   Таму, што дабро застаецца дабром –
   У мінулым, будучым і ў сучасным!

   Пракаменціруйце гэтыя радкі паэта.
2. Якія з забытых традыцый мінулага, на ваш погляд, нам карысна было б аднавіць?
3. М. П. Акімаў пісаў: «А калі б здарылася так, што насуперак усім законам гісторыі будучае пакаленне засвоіла б сабе ўсе густы папярэдняга, то гэта была б катастрофа. Для ўсіх пакаленняў».
   Ці згодныя вы з такой высновай? Аргументуйце свой адказ.
4. Дапусцім, што ўсе народы свету перайшлі на адзіную мову. Як бы гэта адбілася на развіцці культуры?

## § 11. Творчы характар культуры

**Паняцце творчасці.** Пераемнасць і наватарства пранізваюць усё культурнае жыццё грамадства. Прадстаўнікі кожнага новага пакалення займаюцца не толькі засваеннем, але і наватарскай перапрацоўкай культурных дасягненняў мінулага, стварэннем новых культурных каштоўнасцей, ці, інакш кажучы, творчасцю.

*Творчасць* — гэта чалавечая дзейнасць па стварэнні прынцыпова новых матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

Творчасць заўсёды мае перадумовай пэўнае адмаўленне ад старога і стварэнне культурных навацый. Але ў розных

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

культурах скіраванасць і характар творчасці могуць істотна адрозніваецца. Заходняя мадэль творчасці арыентавана галоўным чынам на змяненне чалавекам знешняга наваколля, прывядзенне свету ў адпаведнасць уласнай задуме творчай асобы. На Усходзе ў асяроддзі гуманітарна адукаваных людзей пераважае ўнутраная творчасць, калі творца пераўтварае сам сябе. Яе мэта — пераўтварэнне ўласнага духоўнага свету. Прыкладам можа служыць індыйская ёга, будыйская і даоская медытатыўныя практыкі. У выніку такога падыходу, нягледзячы на ўсё багацце культуры, усходнія грамадствы ў Новы час прадэманстравалі адчувальнае тэхнічнае і тэхналагічнае адставанне ад краін Захаду.

Хто ж з'яўляецца суб'ектам творчага працэсу? Магчымы два асноўныя адказы на такое пытанне. Гэта ці народ, ці пэўная асоба. Ужо ў Старажытнай Грэцыі народ быў галоўнай сілай стварэння культуры. Пра гэта сведчыць, напрыклад, дэмакратычны лад Афін, разнастайнасць і яркасць міфаў і багацце фальклору. Аднак і грэкі, і рымляне адрознівалі populus (народ) і яго частку, якая выраджалася — vulgus (цёмная маса). Далёка не ўсе людзі складаюць народ у высокім значэнні гэтага слова, народ як творчую сілу. Народы, якія дасягнулі гістарычнай велічы, могуць пры пэўных абставінах страціць яе, ператварыўшыся ў ганебную масу. Так адбылося з немцамі ў трыццатыя — саракавыя гады мінулага стагоддзя, калі да ўлады прыйшлі фашысты.

Народ складаецца з асоб. Менавіта яны паасобку здольныя да актыўнай творчай дзейнасці. Калі мы кажам, што народ стварае культуру, гэта значыць, што аўтарства асобных твораў не падкрэсліваецца і не застаецца ў памяці людзей. Розныя людзі ўносяць свой уклад у тое, што называюць творчасцю народа. Перш чым асоба зможа пачаць актыўныя творчыя дзеянні, яна павінна сфарміравацца ў сацыяльным асяродку, які падтрымлівае творчасць, а не гасіць, падаўляе яе.

Калі творчасць асобы супадае з асноўным кірункам грамадскага прагрэсу, то яна можа ўнесці важкі ўклад у

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

сусветную культуру. У гісторыю трывала ўвайшлі імёны многіх выдатных філосафаў, навукоўцаў, вынаходнікаў, мастакоў, пісьменнікаў. Часта дзякуючы іх тытанічным намаганням у культуры адбываўся сапраўдны прарыў ад аднаго якаснага стану да другога. Так, кніга М. Каперніка «Пра вярчэнне нябесных сфер» (1543) азнаменавала сабой пераход ад геацэнтрычнай (цэнтрам прызнаецца Зямля; грэч. gḗ — Зямля) да геліяцэнтрычнай (грэч. hḗlios — Сонца) карціны свету. Гэта, у сваю чаргу, стала штуршком да фарміравання новага тыпу культуры, у тым ліку да развіцця сучаснай навукі.

Дзейнасць асобы часам можа быць скіравана супраць галоўнай лініі грамадскага прагрэсу. Да такіх асоб адносяць, напрыклад, заваёўнікаў мінулага, якія разбуралі культурныя формы. Так, іспанскія канкістадоры на чале з Э. Картэсам у XVI ст. знішчылі ў цэлым перспектыўную, хаця і досыць маладую культуру ацтэкаў, якая існавала на тэрыторыі сучаснай Мексікі. Разбуральны характар у адносінах да пакораных народаў мелі заваяванні Чынгісхана, Цімура, а ў мінулым стагоддзі — Гітлера. У падобных выпадках кажуць пра адмоўнае ўздзеянне творчасці асобы на культуру.

Нярэдка выдатная асоба аказвае супярэчлівае ўздзеянне на развіццё сусветнай культуры. Існуе не так ужо і шмат людзей, творчая дзейнасць якіх можа быць ацэнена цалкам адназначна — альбо як добрая, альбо як дрэнная. Так, стваральнікі ядзернай зброі не толькі паставілі свет на мяжу выжывання, але і заклалі аснову для развіцця ядзернай энергетыкі, што спрыяла вырашэнню складаных эканамічных праблем. Той жа Чынгісхан быў жорсткім заваёўнікам і разам з тым стваральнікам магутнай мангольскай дзяржавы.

Творчасць можа набываць розныя формы — ад адкрыцця новых законаў прыроды да вынаходніцтва новых сродкаў і тактыкі знішчэння людзей у ходзе ваенных дзеянняў. Адно і тое ж адкрыццё можа быць скарыстана і на карысць, і на шкоду людзям.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Такім чынам, дзве асноўныя рухальныя сілы культуратворчасці — гэта асоба і народ ці мноства людзей, якія ўтвараюць культурную супольнасць і ў сваёй паўсядзённай дзейнасці твораць новае. Культура выступае як поле рэалізацыі творчых здольнасцей чалавека. Аднак яна не толькі падахвочвае чалавека да творчасці, але і накладае на яго пэўныя абмежаванні. Культурныя забароны заклікаваны ахаваць грамадства ад разбуральных дзеянняў злачынных антысацыяльных элементаў, абмежаваць уплыў прыхільнікаў фашызму, расізму, розных формаў экстрэмізму, які дэзарганізуе грамадскае жыццё, і не дапусціць драпежніцкага стаўлення да прыроды.

**Асаблівасць культуратворчасці ў навуцы, мастацтве, тэхніцы.** Асноўнымі сферамі культуратворчасці з'яўляюцца навука, мастацтва і тэхніка.

*Навука* ўяўляе спецыфічную сферу дзейнасці, мэта якой — вытворчасць новых ведаў аб прыродзе і грамадстве.

Творчасць у навуцы звязана са здабываннем новых фактаў, выяўленнем новых законаў і прынцыпаў сувязі рэчаў і з'яў. У сваёй дзейнасці навукоўцы выкарыстоўваюць розныя метады даследавання. Важную ролю сярод іх адыгрываюць мадэляванне і навуковы эксперымент.

*Метад мадэлявання* заключаецца ў тым, што: 1) прапануецца дапушчэнне аб прыродзе прадмета вывучэння (рэчы, з'явы і інш.) і на яго падставе ствараецца тэарэтычная ці матэрыяльная мадэль; 2) вывучэнне мадэлі прыводзіць да высноў, якія могуць быць прыменены да зыходнай рэчы ці з'явы; 3) атрыманыя высновы правяраюцца на практыцы (эксперымент).

*Навуковы эксперымент* — гэта даследаванне пэўнага аб'екта з дапамогай актыўнага накіраванага ўздзеяння на яго.

Для правядзення эксперымента цікавы для даследчыка аб'ект (прадмет, працэс) адасабляецца. Затым у строга вызначаных умовах ажыццяўляюць загадзя намечанае ўздзеянне на яго. На падставе атрыманых вынікаў робіцца

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

выснова пра тое, што пры адных і тых жа ўмовах падобныя аб'екты пад такім самым удзеяннем будуць паводзіць сябе ў асноўным гэтак жа, як вывучаны. Выдатны англійскі філосаф Новага часу Фрэнсіс Бэкан (1561—1626) называў эксперымент «катаваннем прыроды» — строгім допытам з мэтай устанавіць ісціну.

Навукоўцы з дапамогай эксперымента прымушаюць прыроду адкрываць яе тайны, пазнаюць яе законы. Гэта патрабуе не толькі вынаходлівасці, але і вялізарнай працавітасці і самаадданасці. Напрыклад, французскія навукоўцы муж і жонка Кюры ахвяравалі сваім здароўем, праводзячы даследаванні радыеактыўнасці.

Часам навуковыя адкрыцці і вынаходкі ўражваюць настолькі, што людзі адмаўляюцца ў іх верыць, бо гэта змяняе іх уяўленні пра жыццё. Адкрытае ў канцы XX ст. рэнтгенаўскае выпраменьванне, якое дазволіла прасвечваць непразрыстыя целы, пэўны час выклікала недавер і лічылася чымсьці блізкім да містыкі. Аднак каго сёння здзіўляе рэнтгенаўскі здымак? Не адразу і далёка не ўсімі былі прызнаны заслугі рускіх вучоных К. Э. Цыялкоўскага (1857—1935), А. Л. Чыжэўскага (1897—1964), якія арыгінальна распрацавалі ідэю ўзаемасувязі чалавека і Космасу.

Навукоўцы імкнуцца прымяніць адкрытыя імі факты і законы для змянення прыроднай і сацыяльнай рэчаіснасці. Гэта патрабуе ад іх асаблівай адказнасці за вынікі даследаванняў — многія ж адкрыцці ў перспектыве іх укаранення могуць нашкодзіць чалавецтву. Дастаткова згадаць хімічныя доследы, якія прывялі да стварэння атрутных рэчываў.

Дзякуючы развіццю навукі і тэхнікі культура сучаснага Захаду змагла дамагчыся выдатных поспехаў. Разам з тым шырокае і безагляднае выкарыстанне гэтых дасягненняў на практыцы абвастрыла экалагічную праблему, стварыла пагрозу будучыні чалавецтва.

У адрозненне ад навукі, якая абапіраецца на мысленне і эксперымент, аснову мастацтва складаюць уяўленне і фантазія.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Помнік К. Э. Цыялкоўскаму ў Бароўску* (2007).
Скульптар С. Ю. Бычкоў

*Мастацтва* — асаблівая форма чалавечай дзейнасці, якая праяўляецца ў стварэнні мастацкіх вобразаў, цэласных мастацкіх твораў.

Мэта творчасці ў мастацтве — стварэнне прыгожага, якое выяўляе асабістыя і грамадскія ідэалы. Ад мастака, акрамя ўмення, патрабуецца яшчэ і асаблівае чуццё, мастацкая інтуіцыя. Дзякуючы ім твор майстра адлюстроўвае не проста яго асабістае ўяўленне аб прыгожым, але і сучасны ці будучы дамінантны тып прыгажосці.

Мастацтва, даючы чалавеку радасць, задавальненне, выхоўвае ў ім найлепшыя якасці. Узнікла яно з імкнення чалавека да прыгажосці. Мастацкія творы пастаянна стымулююць у людзях творчы пачатак. Мастацтва непарыўна звязана з даследаваннем прыроды і развіццём

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

навуковых ведаў, а ў старажытнасці яно часам і апераджала іх.

Найвышэйшага выяўлення напружанне ўсіх творчых сіл сучаснай заходняй культуры дасягнула ў развіцці тэхнікі.

*Тэхніка* — гэта сукупнасць прылад, штучных сродкаў, створаных чалавекам для пераўтварэння прыроднага асяроддзя, забеспячэння функцыянавання і развіцця культуры.

Творчасць у галіне тэхнічных аб'ектаў і прыстасаванняў абапіраецца на дасягненні прыродазнаўчых і дакладных навук: фізікі, хіміі, матэматыкі. Тэхніка з'яўляецца пасрэднікам паміж чалавекам і прыродай. Яна — найважнейшае звяно ў нашым узаемадзеянні з навакольным асяроддзем. Тэхнічная творчасць накіравана на стварэнне штучнай прыроды, адпаведнай патрэбам чалавека. Калі твор мастацтва ўвасабляе якую-небудзь мастацкую ідэю, то тэхнічная творчасць накіроўваецца думкамі пра карыснасць, эфектыўнасць, зручнасць. У нашы дні ўсё большае значэнне набывае дызайн — мастацкае праектаванне вырабаў. Тэхнічныя сродкі вельмі важныя ў кінамастацтве, музычным мастацтве і г. д.

**Творчасць і геніяльнасць.** Значную частку духоўных каштоўнасцей у сучасным грамадстве ствараюць прафесійныя творцы. У развіцці матэрыяльнай культуры творчым асобам таксама належала і належыць важная роля. Якімі б умелымі ні былі разьбяры па камені і будаўнікі, але без архітэктурнага генія Даната Брамантэ (1444—1514) мы б не ведалі такога велічнага збудавання, як сабор Святога Пятра ў Рыме.

*Творчая асоба*, *талент*, *геній* — узыходзячыя прыступкі творчага развіцця чалавека, розныя меры ацэнкі яго дасягненняў. Геній з'яўляецца найвышэйшай прыступкай, якая ўвенчвае і завяршае развіццё творчай асобы. Геній — гэта заўсёды талент, яго найбольш глыбокая і поўная праява. Але не ўсякі талент — геній.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Сабор Святога Пятра ў Рыме* (1506—1614). Архітэктары Брамантэ, Мікеланджэла, Порта, Віньёла і інш.

Існуюць наступныя асноўныя адрозненні генія ад таленту. Па-першае, высокая арыгінальнасць творчасці генія, яго бясспрэчна наватарскі характар. Усякі талент індывідуальны, але ў геніі гэта рыса дасягае найвышэйшага ўзроўню. Дзейнасць генія здольна замяніць намаганні вельмі многіх людзей, якія працуюць з ім у адной сферы. Такімі былі, напрыклад, стваральнік неэўклідавай геаметрыі М. І. Лабачэўскі (1792—1856), бліскучы фізік А. Эйнштэйн (1879—1955). Па-другое, гэта універсалізм генія, яго здольнасць дамагчыся поспехаў у розных галінах. Рознабаковымі былі навуковыя інтарэсы Арыстоцеля (384—322 гг. да н. э.), У. І. Вярнадскага (1863—1945). Геніяльнасць Леанарда да Вінчы (1452—1519) праявілася не толькі ў навуцы, але і ў тэхнічнай творчасці, у мастацтве. Па-трэцяе, высокая ступень працавітасці дазваляе генію дасягаць вельмі высокіх вынікаў нават там, дзе проста таленавіты чалавек пацерпіць

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

паражэнне. Геній — гэта чалавек, які ўплывае на сусветную культуру ў цэлым. Ён здольны прадбачыць будучыню, што дазваляе яго творам захоўваць актуальнасць для наступных пакаленняў.

## Некаторыя высновы

1. Творчасць звязана са стварэннем новых дасягненняў культуры. Накіраванасць і характар творчасці залежаць ад тыпу культуры. 2. Асноўнымі суб'ектамі творчасці, культуры з'яўляюцца народ і асоба. 3. Навуковая творчасць накіравана на выпрацоўку новых ведаў аб прыродзе і грамадстве. Мадэляванне і навуковы эксперымент — асноўныя сродкі сучаснага навуковага пошуку. 4. Творчасць у мастацтве накіроўваецца ідэяй прыгожага і патрабуе ад асобы наяўнасці развітой мастацкай фантазіі, інтуіцыі. 5. Тэхніка — галоўны пасрэднік ва ўзаемадзеянні грамадства з прыродай. Тэхнічная творчасць накіроўваецца клопатам пра карыснасць, эфектыўнасць, зручнасць.

?!

### ***Пытанні і заданні***

1. Вядомы кампазітар М. І. Глінка сказаў: «Народ стварае музыку, а мы, кампазітары, толькі аранжыруем яе». Што ён меў на ўвазе?
2. Як можна вытлумачыць словы І. А. Буніна: «З народа можа выйсці і ікона, і дубіна»?
3. Як вы разумееце словы А. С. Пушкіна: «Геній і ліхадзейства несумяшчальныя»? Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем?
4. П. Валеры сказаў: «Талент без генія значыць няшмат, геній без талента — нішто». Што ён меў на ўвазе? Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем?
5. Якую рысу геніяльнасці адлюстраваў у сваім выказванні Г. Гегель: «Талент з'яўляецца спецыфічнай, а геній — усеагульнай здольнасцю»?
6. Прывядзіце прыклады геніяльных людзей і іх дасягненняў.
7. Ці існуе ўзаемасувязь паміж мастацкай і тэхнічнай творчасцю?
8. Якія кірункі сучаснай тэхнічнай творчасці падаюцца вам найбольш важнымі? Чаму?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## § 12. Дыялог культур

**Нацыянальнае і агульначалавечае ў культуры.** Са старажытных часоў многія людзі судзілі пра іншыя культуры з пазіцыі перавагі свайго народа. Такая пазіцыя называецца *этнацэнтрызмам*; яна была характэрная і для Захаду, і для Усходу. Так, яшчэ ў IV ст. да н. э. старажытнагрэчаскія грамадскія дзеячы падзялялі свет на «элінаў» і «варвараў». Пры гэтым культура «варвараў» разглядалася як вельмі прымітыўная ў параўнанні з грэчаскай. Гэта была адна з першых праяў *еўрапацэнтрызму* — меркавання еўрапейцаў пра тое, што іх грамадства ёсць узор для астатняга свету.

Пазней хрысціянскія місіянеры імкнуліся схіліць «адсталых паганцаў» у сваю веру. У сваю чаргу, жыхары сярэдневяковага Кітая адкрыта выказвалі пагарду да «ўскраінных варвараў» (як да еўрапейцаў, так і да качавых плямёнаў). Этнацэнтрызм звычайна звязаны з *ксенафобіяй* (ад грэч. xenos — чужы, phobos — страх) — страхам перад чужымі поглядамі і звычаямі, непрыязнасцю ці нянавісцю да іх.

Аднак з часам многія прыйшлі да разумення таго, што процістаўленне Захаду Усходу і ўвогуле «сваіх» «чужым» не прыносіць карысці чалавецтву. Захад не вышэйшы за Усход, а Усход не вышэйшы за Захад — яны проста розныя.

Садзейнічанне разнастайнасці культур — адна з важных мэт сусветнай супольнасці. Гэта зафіксавана ў першым артыкуле Статута ЮНЕСКА — Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры. У ёй гаворыцца, што мэта супрацоўніцтва — спрыяць «зблiжэнню і ўзаемнаму разуменню народаў шляхам належнага выкарыстання апарату калектыўнага інфармавання, рэкамендуючы для гэтага заключэнне міжнародных пагадненняў, якія яна (ЮНЕСКА) палічыць карысным для свабоднага распаўсюджвання ідэй слоўным ці мастацкім спосабам». Такім чынам, культурная разнастайнасць патрабуе падтрымкі, яе неабходна развіваць.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Своеасаблівасць кожнай нацыянальнай культуры адносная. Яе унікальнасць выступае як канкрэтнае праяўленне ўсеагульнага ў развіцці чалавечага грамадства. У розных народаў гістарычна скláліся свае мовы. Але неабходнасць мець мову як сродак зносін, назапашвання вопыту агульная для ўсіх людзей. Усе культуры маюць некаторыя аднолькавыя нормы і каштоўнасці. Іх называюць *агульначалавечымі*, таму што яны выяўляюць асновы чалавечага жыцця. Дабро, праца, каханне, любоў, сяброўства значныя для людзей у любым месцы Зямлі. Існаванне гэтых каштоўнасцей спрыяе ўзаемаразуменню і збліжэнню культур. Інакш нельга растлумачыць той факт, што кожная культура ў працэсе ўзаемадзеяння з іншымі ўспрымае і выкарыстоўвае многія іх дасягненні. Так, у канцы XIX ст. аграрная Японія за некалькі дзесяцігоддзяў змагла ператварыцца ў моцную індустрыяльную дзяржаву.



Джарджоне да Кастэльфранка. *Тры філосафы* (1508)

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Прычына гэтага палягае ў запазычванні заходніх тэхналогій і прынцыпаў арганізацыі вытворчасці.

Узаемадзеянне культур вядзе, з аднаго боку, да ўмацавання своеасаблівасці ўсходніх і заходніх, паўднёвых і паўночных культур, з другога — да фарміравання агульнасусветнай культуры. Дыялог розных культур неабходны і бясконцы. Гэта заўсёдны працэс, які дапамагае чалавецтву захаваць разнастайнасць культурных асноў жыцця. Дыялог культур дазваляе кожнаму далучыцца да духоўнага багацця, створанага рознымі народамі, сумесна вырашаць глабальныя праблемы чалавецтва. Ён дапамагае асобным людзям і чалавечым супольнасцям знайсці сэнс уласнага быцця, не страціўшы своеасаблівасці.

**Асаблівасці культуры ўсходнеславянскіх народаў.** Культура ўсходніх славян дынамічна развіваецца. Гэты культурны свет багаты на высокія духоўныя дасягненні і ў чымсьці непрадказальны, схільны да рэзкіх змяненняў. Толькі ў XX ст. ён зведаў такія магутныя хваляванні, ад якіх многія іншыя культуры не змаглі б акрыяць. У канцы XIX — пачатку XX ст. усходнеславянскі свет перажываў творчы ўздым. Для рускай і беларускай культур гэты час адзначаны вялікімі дасягненнямі ў навуцы і мастацтве. Сярод творчых асоб Расіі названага перыяду вызначаюцца пісьменнікі А. П. Чэхаў, Л. М. Талстой, паэты А. А. Блок, С. А. Ясенін, У. У. Маякоўскі, філосафы С. Л. Франк, М. А. Бярдзяеў, мастак І. Я. Рэпін і інш. Беларуская культура таго часу праславілася такімі імёнамі, як В. І. Дунін-Марцінкевіч, Якуб Колас, Янка Купала, Максім Багдановіч. І беларускай, і рускай культуры належаць мастакі К. С. Малевіч, філосаф М. М. Бахцін, псіхолаг Л. С. Выгоцкі і інш. Але Расія была ўцягнута спачатку ў Першую сусветную вайну, а затым стала ахвярай шэрага разбуральных сацыяльных працэсаў.

Адбіліся на культуры і некаторыя асаблівасці рускага нацыянальнага характару, на які паўплывала знаходжанне рускіх зямель паміж Усходам і Захадам. Пад уздзеяннем праваслаўя тут сфарміраваўся «месіянскі тып чалавека». Такі чалавек адчувае, што ён павінен выратаваць

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

свет, няхай і цаной уласнай гібелі. На Русі заўсёды было нямала змагароў за свабоду народа, якія абаранялі яго перш за ўсё ад прыгнёту дзяржавы, а таксама ад самавольства памешчыкаў. Вялізарныя тэрыторыі расійскай імперыі дазвалялі прыгонным мужыкам бегчы на шырокі вольны прастор. У рускага чалавека адкрытая душа, ён схільны да суперажывання, добры і спагадлівы, але можа быць страшны ў сваім бунце, таму што для яго няма нічога даражэйшага за свабоду. Нярэдка ён праставаты і занадта спрашчае міжасабовыя зносіны, падзяляе ўсіх на ворагаў і сяброў, не прызнаючы паўтоны і адценні. «Ці сябар — ці вораг!» — такі ў мінулым быў дэвіз многіх расіян. Нядзіўна, што месіянская ідэя камунізму, упаўшы на рускую глебу, выклікала вельмі жорсткую грамадзянскую вайну, прынесла мільёны ахвяр і пагібель вялікіх каштоўнасцей культуры.

Духоўнае жыццё народа на працягу савецкага перыяду таксама было своеасаблівым полем бою. Ідэя класавага характару культуры супрацьстаяла ў савецкай ідэалогіі агульначалавечым каштоўнасцям. Да прадстаўнікоў інтэлігенцыі дзяржава нярэдка ставілася з падазрэннем, бачачы ў іх адкрытых ці тайных контррэвалюцыянераў. Вынікам такой пазіцыі яшчэ ў першыя гады існавання савецкай улады стала масавая эміграцыя рускай інтэлігенцыі. Краіну пакінулі тысячы высокакваліфікаваных навукоўцаў, інжынераў, канструктараў. З'ехалі такія вялікія людзі, як спявак Ф. І. Шаляпін, кампазітар С. В. Рахманінаў, балерына А. П. Паўлава, паэтэса М. І. Цвятаева, пісьменнік І. А. Бунін, мастак К. А. Каровін. Шмат хто пакідаў радзіму не па сваім жаданні. Яркім прыкладам стаў сумна вядомы «філасофскі параход». На ім была выслана за межы краіны вялікая група рускіх філосафаў і пісьменнікаў: М. А. Бярдзяеў, С. М. Булгакаў, П. А. Сарокін, М. А. Лоскі, С. М. Пракаповіч і інш. Такі адток розумаў прывёў да заўважнага паніжэння духоўна-інтэлектуальнага ўзроўню грамадства, што запатрабавала дадатковых намаганняў па аднаўленні страчанага.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Сучасная культура на ўсёй постсавецкай прасторы перажывае няпросты час. У XXI ст. у самабытныя культуры розных народаў шырока ўкараняюцца заходнія ўзоры. Гэта вядзе да яе камерцыялізацыі, разбурэння мінулай духоўнай і культурнай еднасці брацкіх народаў. Разам з тым захоўваецца магчымасць далейшага збліжэння ўсходнеславянскіх і іншых народаў, іх сумеснага ўзаемакарыснага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. Для гэтага неабходна аднавіць былыя і наладзіць новыя культурныя сувязі, пастарацца зберагчы і ўмацаваць нашы традыцыйныя каштоўнасці з улікам новага гістарычнага вопыту. У культурным развіцці мы павінны глядзець уперад, а не назад.

**Беларусь на скрыжаванні культур.** Ва ўмовах глабалізацыі ўзмацняецца знешняе ўздзеянне на нацыянальную культуру. Яе духоўныя каштоўнасці і ўстаноўкі праходзяць праверку на трываласць. Цяпер стаіць задача захаваць нашу нацыянальную духоўную спадчыну. Без разумення сябе, сваёй культуры немагчыма знайсці ўласны шлях развіцця ў сучасным свеце.

Беларуская культура мае вялікую гісторыю і ўласныя традыцыі. У ёй увасобіліся самабытныя міфічныя, рэлігійныя, мастацкія, маральныя, філасофскія ўяўленні нашага народа. Доўгі час беларуская культура, як і руская, запазычвала многія заходнія ідэі, каштоўнасці, формы культуры. Аднак у беларускай культуры ёсць свой стрыжань, аснова — эмпатыя. *Эмпатыя* — гэта здольнасць да шчырага суперажывання, імкненне падзяліць чужы боль.

Эмпатычная скіраванасць беларускай культуры звязана з яе талерантнасцю (памяркоўнасцю), разважлівасцю, спакоем. Адсутнасць нацыянальнай і рэлігійнай варожасці і ёсць праява гэтых рыс. Эмпатыйнасцю культуры можна растлумачыць перавагу на Беларусі мастацкай творчасці пры адсутнасці развітых філасофскіх сістэм. Беларус не імкнецца пакараць прыроду, а, наадварот, жадае еднасці з ёй. Ён хоча ўслухацца, угледзецца ў свет, каб адчуць усю яго прыгажосць. Самае

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



Гюстаў Курбэ. *Добры дзень, масье Курбэ!* (1854)

страшнае для беларуса — расчараванне ў ідэале, адарванне, адлучэнне ад прыгажосці.

Эмпатыйнасць беларускай культуры шмат у чым зблiжае яе з усходняй культурай. Аднак на Усходзе спачуванне і перажыванне чалавека часта бываюць звернуты да Бога ці ж унутр сябе. А ў беларусаў любоў і эмпатыя накіраваны перш за ўсё на блізкую, родную прастору. Моцнае пачуццё роднай зямлі — найважнейшая рыса светапогляду нашага народа.

Беларуская культура фарміравалася ў непасрэднай сувязі не толькі з расійскім, але і з заходнімі культурнымі цэнтрамі. Яна зазнала іх значны ўплыў і таму мае ясна выяўленую практычную скіраванасць. Разам з тым наша культура не нацэлена на барацьбу, сілавое самасцвярджэнне.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Беларусы заўсёды імкнуліся да гібкага, канструктыўнага дыялога з прадстаўнікамі іншых культур.

Беларуская культура вельмі блізкая да рускай, аднак ёсць між імі і адрозненні. Імкненне да максімальнага ахопу быцця, характэрнае для рускай культуры, часам увасаблялася ў вялікія праекты: «Масква — трэці Рым», «Сусветная рэвалюцыя». Дзеячы ж беларускай культуры заўсёды клапаціліся пра блізкае, кіраваліся пачуццём меры і здаровым розумам, пазбягаючы крайнасцей і рэвалюцыйных ломак. У XX ст. Беларусь атрымала магчымасць незалежнага дзяржаўнага і культурнага развіцця. Абапіраючыся на свой адметны тып духоўнасці, беларусы займаюць пачэснае месца сярод іншых народаў і нацыянальных культур.

**Менталітэт беларускага народа.** *Менталітэт* (ад лац. mens — розум, мысленне) — гэта ўклад думак асобнага чалавека ці групы людзей. На фарміраванне беларускага менталітэту паўплывалі тры асноўныя фактары. Па-першае, прыродна-геаграфічнае асяроддзе, якое ўздзейнічала на светаадчуванне нашых продкаў — прыгажосць роднай прыроды, размяшчэнне беларускіх зямель у раўніннай зоне з умерана-кантынентальным кліматам. Па-другое, рэлігія, а дакладней, некалькі рэлігій — перш за ўсё праваслаўе, а таксама каталіцызм, пратэстантызм, іслам, іудаізм. Па-трэцяе, калектыўна-радавы пачатак, які праявіў сябе ў абмежаванні актыўнасці асобнага чалавека клопатам пра агульнае шчасце.

Важнымі рысамі менталітэту беларусаў можна лічыць наступныя:

• «памежнасць», звязаную з неабходнасцю выбіраць паміж Захадам і Усходам; заўсёдны пошук свайго шляху развіцця. Так, ужо першы беларускі навуковец Францыск Скарына аб'яднаў у сабе рысы дзвюх культур — заходняй і ўсходняй (праваслаўнай), што не перашкаджала яму заставацца самаадданым патрыётам;

• адсутнасць пачуцця перавагі над іншымі народамі;

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

• цярплівасць, трываласць і неагрэсіўнасць. Беларусы заўсёды адмаўлялі гвалт, хоць самі нярэдка станавіліся яго ахвярамі. Разам з тым беларусы зусім не пазбаўлены свабодалюбства і храбрасці. На вайне беларус храбры і рашучы, пра што сведчыць вопыт Вялікай Айчыннай вайны, масавы партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі;

• нешматслоўнасць і стрыманасць, адсутнасць схільнасці да бурнага выяўлення пачуццяў. Свае праблемы беларусы лічаць за лепшае не абмяркоўваць, а пераажываць унутры. У той жа час яны шчырыя, адкрытыя і лагодныя;

• міралюбнасць, падатлівасць, талерантнасць (памяркоўнасць). Наша талерантнасць мае канкрэтныя гістарычныя карані. Беларусы доўгі час жылі ў складзе шматнацыянальных дзяржаў, таму жыццё навучыла наш народ думаць пра інтарэсы грамадства ў цэлым, а не толькі пра свае ўласныя.

**Некаторыя высновы**

1. Разнастайнасць культур і іх арыентацыя на прадуктыўны дыялог — асноўныя ўмовы паспяховага развіцця сусветнай культуры. 2. Культура ўсходніх славян — дынамічны і багаты, хаця і супярэчлівы свет. 3. Беларуская культура — гэта культурнае памежжа паміж Захадам і Усходам са спрыяльнымі магчымасцямі для самастойнага творчага развіцця. 4. Важныя рысы беларускага менталітэту: талерантнасць, цярплівасць, разважлівасць, стрыманасць.

?! ***Пытанні і заданні***

1. Якія, на ваш погляд, асноўныя перадумовы дыялога культур Захаду і Усходу?
2. Вызначце характэрныя рысы развіцця рускай культуры.
3. Назавіце вядомых вам дзеячаў беларускай культуры.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

4. Якія, на ваш погляд, асноўныя асаблівасці развіцця беларускай культуры?
5. Параўнайце менталітэт рускага і беларускага народаў.
6. Які ўплыў на менталітэт беларусаў аказала прырода роднага краю?

## § 13. Асваенне чалавекам культуры

**Уваходжанне чалавека ў свет культуры.** Культура — гэта надпрыродная рэальнасць. Яна, як мы ўжо адзначалі, складваецца ў працэсе сумеснай жыццядзейнасці людзей. Уваходжанне чалавека ў культуру пачынаецца з моманту яго нараджэння, паколькі жыццё хлопчыка ці дзяўчынкі працякае шмат у чым не так, як жыццё дзіцяняці жывёл. Вакол немаўляці — мноства штучных рэчаў; кормяць і пояць яго таксама асабліва. Аднагадовае дзіця прывучаюць да прамахаджэння, хоць ад прыроды яно прыстасавана да перамяшчэння на чатырох канечнасцях. Аднак існуе надбіялагічная патрэбнасць, якая заключаецца ў тым, каб вызваліць рукі для больш важных спраў, чым простае перамяшчэнне. У далейшым гэта будуць рукі токараў ці скрыпачоў, муляраў ці скульптараў — рукі культурнага чалавека.

У дзіцяці развіваюцца спецыфічныя чалавечыя функцыі органаў маўлення, слыху, зроку. Яны забяспечваюць моўныя зносіны, чытанне тэкстаў і г. д. Дзіцяці прывіваюцца пэўныя звычкі, правілы паводзін, у яго фарміруюцца розныя якасці, што робяць яго культурнай асобай. Гэты працэс супадае, як вы ўжо ведаеце, з адукацыяй асобы. У час адукацыі прыродным задаткам і магчымасцям чалавека надаецца новая скіраванасць. Яны развіваюцца так, каб чалавек сапраўды стаў носьбітам, а ў далейшым і творцам культуры. Для нованароджанага культура з'яўляецца чымсьці знешнім, і толькі дзякуючы адукацыі яна становіцца ўнутранай якасцю чалавека як асобы. Працэс адукацыі працягваецца ўсё жыццё. У кожным узросце вырашаюцца свае задачы адукацыі.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Накіраванасць развіцця асобы ў працэсе адукацыі шмат у чым залежыць ад тыпу культуры. Кожная культура мае свае каштоўнасці, ідэалы, спосабы жыцця і дзеяння. Ад таго, якія яны, залежыць узмацненне адных і аслабленне іншых рыс асобы. Напрыклад, паўночнаамерыканская культура патрабуе ад асобы энергічнасці, вольнасці ў зносінах, упэўненасці ў сабе. Гэтыя якасці неабходныя для паспяховай сацыялізацыі ў амерыканскай культуры. Індыйская культура, як сведчаць найлепшыя ўзоры яе духоўнасці, адстойвае іншыя каштоўнасці: сузіральнае стаўленне да свету, пасіўнасць, замкнёнасць і самааналіз. Але, безумоўна, на паўсядзённым узроўні яна таксама арыентавана на жыццёва-практычныя каштоўнасці.

Кожная культура вызначае не толькі формы працоўнай, гаспадарчай дзейнасці чалавека, але і традыцыйныя спосабы адпачынку, атрымання задавальнення, расслаблення. Так, італьянцы ў навагоднюю ноч забаўляюцца выкідаючы ў акно старыя рэчы, якія сабраліся ў доме за год. Але ёсць і шмат агульнага ў культурах розных народаў адносна таго, што лічыць годным ці ганебным, што належыць да сапраўдных жыццёвых каштоўнасцей, а што, наадварот, разбурае лад у жыцці, пазбаўляе яго каштоўнасці і сэнсу. Так, ва ўсіх народаў у пашане добрасумленная праца, маральная сталасць, адукаванасць.

Ад самога індывіда, а не толькі ад знешніх умоў залежыць, ці стане ён паўнацэнным членам грамадства, ці разаўе ў сабе найлепшыя якасці, ці стане чалавекам культуры альбо, наадварот, ператворыцца ў ізгоя або разбуральніка культурных каштоўнасцей. Каб стаць сапраўднай асобай, грамадзянінам, трэба авалодаць тымі каштоўнасцямі, якія выпрацавала культура, асвоіць яе змест, усвядоміць моц яе традыцый і ідэалаў.

**Сям'я як носьбіт культурных традыцый і каштоўнасцей.** Сямейны ўклад жыцця ўзнаўляе традыцыі нацыянальнай культуры, далучае да іх новыя пакаленні людзей.

У сям'і дзецям прышчэпліваюцца асноўныя жыццёвыя ўменні і навыкі, неабходныя ў побыце. Напрыклад, бацька навучае сына забіваць цвікі, майстраваць, маці

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

вучыць дзяцей падтрымліваць чысціню ў доме. У сям'і дзіця атрымлівае мноства вельмі патрэбных для жыцця практычных ведаў.

Матэрыяльная культура сям'і — гэта не проста рэчы і грошы, а перш за ўсё ўстаноўка на захаванне і разумнае выкарыстанне таго, што ёсць. Сапраўды гаспадарлівае стаўленне да маёмасці вядзе да росту матэрыяльнага дабрабыту. Далучэнне дзяцей да матэрыяльнай культуры жыцця сям'і дапамагае ім падрыхтавацца да рацыянальнага самастойнага гаспадарання. У той сям'і, дзе клапоцяцца пра дом і правільна арганізуюць побыт, дзеці з ранніх гадоў вучацца даражыць вынікамі працы — як сваёй, так і іншых людзей, беражліва ставіцца да грамадскага набытку.

Ад сям'і шмат у чым залежыць далучэнне дзяцей да каштоўнасцей традыцыйнай фізічнай культуры. Калі, напрыклад, бацькі разам з дзецьмі выконваюць ранішнюю зарадку, уцягваюць іх у спорт, гэта спрыяе фарміраванню здароўя як асобнага чалавека, так і ўсёй нацыі.

Важнай часткай духоўнай культуры сям'і з'яўляюцца сямейныя паданні, біяграфіі продкаў — рэальныя і легендарныя. Гэтыя прыклады дапамагаюць асвойваць асноўныя формы сацыяльнага вопыту. Біяграфіі вялікіх продкаў складаюць сямейны эпас, які дае прыклад паводзін у жыцці і шмат у чым вызначае ўклад думак і нават спосаб жыцця членаў сям'і, фарміруючы ў іх пачуццё прыналежнасці свайму роду і народу. Так, у шляхты паняцце «радавы гонар», «доўг», «адданасць інтарэсам Радзімы» заўсёды былі непасрэдна звязаны з сямейнай традыцыяй. Пра гэта добра сказаў А. С. Пушкін:

Два пачуцці дзіўна блізкія нам,
Ў іх сэрца мае пажытак:
Любоў да родных мясцінак,
Любоў да бацькоўскіх магіл.
О жыватворчая святыня!
Зямля б была мёртвай без іх...

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



К. Ясевіч. *Сямейны партрэт* (1849)

У развіцці духоўнай культуры сям'і вялікае значэнне мае прафесійны вопыт бацькоў. Напрыклад, дзеці прафесіяналаў, майстроў сваёй справы самі, як правіла, становяцца прафесіяналамі, добрасумленнымі і ініцыятыўнымі працаўнікамі. Часам так узнікаюць працоўныя дынастыі.

Такім чынам, сям'я спалучае ў сабе праявы многіх асноўных формаў культуры. Яна адначасова вядзе гаспадарчую і кіраўнічую дзейнасць, падтрымлівае фізічнае здароўе сваіх членаў, праз захаванне традыцый закладае трывалыя асновы іх духоўнага развіцця і маральных паводзін.

**Школа як феномен культуры.** Школа — гэта ўстанова, прызначаная для навучання і выхавання падрастаючага пакалення. Яна служыць падмуркам сучаснай культуры і, шырэй, усёй жыццядзейнасці грамадства, бо рыхтуе дзяцей да самастойнага жыцця.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Школа як спецыялізаваная ўстанова адукацыі ўзнікае на тым этапе гістарычнага развіцця, калі ўскладненне грамадскага жыцця, назапашванне новага і ўсё больш разнастайнага вопыту вядзе да паяўлення пісьменнасці. Паколькі значныя для грамадства звесткі фіксуюцца ў пісьмовым выглядзе, людзей, якім давядзецца карыстацца імі, трэба навучыць чытанню, пісьму і арыфметычным дзеянням.

У пісьмовым выглядзе захоўваюцца не ўсякія веды, а толькі спецыяльна адабраныя. Школа далучае вучняў да той часткі вопыту, назапашанага ў культуры, якая прызнаецца неабходнай для засваення. Паўсядзённыя веды і досвед вучні звычайна атрымліваюць па-за ёй. Школа вучыць асновам упарадкаваных, навуковых ведаў.



Рафаэль Санці. *Філосафы Платон і Арыстоцель* (1508—1511). Фрагмент фрэскі «Афінская школа»

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Школа* — гэта спецыяльна арганізаванае адукацыйнае асяроддзе, якое ўключае настаўнікаў, вучняў, пэўныя сродкі навучання і г. д. Дадзенае асяроддзе з'яўляецца своеасаблівай мадэллю грамадства, у якім вучань жыве і правілы якога ён павінен засвоіць. Усякая мадэль павінна быць прасцейшая за тое, што яна мадэліруе. У прыватнасці, школа не можа вучыць усяму таму, што грамадства прызнае важным, бо аб'ём такіх ведаў празмерна вялікі. Таму для вывучэння адбіраюцца толькі тыя звесткі, навуковыя вынікі і высновы, якія вучні могуць зразумець і засвоіць. Разам з тым задача школы — сістэматызаваць вучэбны матэрыял і з яго дапамогай паказаць, як арганізаваны свет, як узаемазвязаны ў ім з'явы, працэсы. Гэта азначае, што школа заклікана сфарміраваць у вучняў сучасны светапогляд.

Школа дае веды асноўных фактаў і іх сувязей, законаў і заканамернасцей, узбройвае вучняў паняційным апаратам, агульным для розных навук і розных відаў чалавечай дзейнасці. Атрымліваючы адукацыю, школьнік атрымлівае здольнасць разумець хаця б у агульных рысах, чым займаюцца спецыялісты, як працуюць розныя ўстановы, як адбываюцца грамадскія працэсы і г. д. Школа не проста капіруе арганізацыю грамадскага жыцця, а адбірае ў ім самае лепшае, бароначы асобу вучня ад уплываў яго асяроддзя, якія разбэшчваюць. Школа захоўвае і перадае новым пакаленням тое найлепшае, што трэба зберагчы і развіць. Яе прызначэнне — садзейнічаць прагрэсу культуры грамадства, развіццю культуры асобы.

Яшчэ адна важная функцыя школы — спрыяць устанаўленню сацыяльнай роўнасці. Яна стварае для ўсіх навучэнцаў роўныя магчымасці набыцця ведаў, авалодання сацыяльным вопытам, далучэння да культуры. Гэта дапаможа ім больш паспяхова рэалізаваць сябе ў самастойным жыцці. Школа вучыць пастаянна працаваць над сабой, займацца самаадукацыяй, што таксама вельмі важна ў сучасным, такім дынамічным жыцці.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Некаторыя высновы

1. Працэс адукацыі ажыццяўляецца на працягу ўсяго жыцця і на кожным з яго этапаў мае свае асаблівасці. У цэлым адукацыя — гэта спосаб уваходжання чалавека ў культуру, асваення яе каштоўнасцей і нормаў. 2. Сям'я — захавальнік культурнай традыцыі; менавіта ў ёй пачынаецца далучэнне асобы да культуры. 3. Ключавую ролю ў забеспячэнні пераемнасці культуры і перадачы яе дасягненняў новым пакаленням адыгрывае школа. Яна дае вучням не толькі веды, але і вопыт дзейнасці ў якасці носьбітаў культуры.

### ?! *Пытанні і заданні*

1. Што, на ваш погляд, уваходзіць у матэрыяльную і духоўную культуру сям'і?
2. У чым вы бачыце значэнне сямейнага падання ў развіцці культуры?
3. Вялікі рускі навуковец і грамадскі дзеяч Д. І. Мендзялееў сцвярджаў: «Школа з'яўляецца вялізарнай сілай, якая вызначае побыт і лёс народаў і дзяржаў, гледзячы па асноўных прадметах і па прынцыпах, укладзеных у сістэму школьнай адукацыі». Ці згодныя вы з гэтым выказваннем?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Практыкум

1. Антычны філосаф Пратагор прапанаваў палажэнне пра тое, што «чалавек ёсць мера ўсіх рэчаў». Ці згодныя вы з гэтым сцверджаннем?

2. *Гульня «эстафета культуры»* (5—8 удзельнікаў). Удзельнікі гульні па чарзе даюць азначэнне культуры. У першым туры — з падручніка. Пры гэтым той, хто не можа сфармуляваць азначэнне, выбывае з гульні. У другім туры патрабуецца даць сваё азначэнне культуры на падставе вядомых. Па выніках другога тура ўдзельнікі шляхам галасавання могуць вырашыць, чыё азначэнне было найбольш арыгінальным і цікавым для аналізу.

3. У першабытным грамадстве быў распаўсюджаны абрад ініцыяцыі (ад лац. initium — пачатак), калі юнакоў і дзяўчат пераводзілі ў катэгорыю дарослых. Пры гэтым ім наносілі парэзы на цела, рабілі татуіроўкі, прымушалі іх выконваць цяжкія і непрыемныя дзеянні. З чым, на ваш погляд, гэта было звязана? Ці існуюць сучасныя культурныя «ініцыяцыі»?

4. Параўнайце два выказванні і вызначце пазіцыі іх аўтараў адносна прыроды творчасці: 1) «Стваральнік мастацкага твора будучыні ёсць не хто іншы, як мастак цяперашняга часу» (Р. Вагнер) і 2) «Творчасць — гэта самазабыўнае служэнне мастацтву народа» (В. І. Качалаў).

5. Олівер Кромвель сказаў: «Быць у пошуку — амаль тое самае, што знайсці: хто раз пачаў шукаць, той не супакоіцца да канца. Шчаслівыя тыя, хто знайшоў, але шчаслівыя і тыя, хто шукае». Такая ацэнка творчага пошуку адпавядае масавай ці элітарнай культуры?

6. Супастаўце два выказванні пра крыніцы геніяльнасці і вызначце сваю пазіцыю па гэтым пытанні: 1) «Выдатныя розумы, таксама як кнігі, маюць свой лёс. І нельга сказаць, што іх лёс «куецца» імі самімі. Ён *вызначаецца той роляй, якую адыгрывае іх радзіма* ў ходзе культурнага развіцця чалавецтва» (Г. В. Пляханаў) і 2) «Выдатныя

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

асобы фарміруюцца не з дапамогай прыгожых прамоў, а ўласнай працай і яе вынікам» (А. Эйнштэйн).

7. Паспрабуйце даць сваё азначэнне масавай культуры. Якую ролю яна адыгрывае ў жыцці грамадства? Калі яна «нізкая», то нашто яна патрэбна?

8. Уявіце, пісаў французскі псіхолаг А. П'ерон, што з нашай планетай здарылася катастрофа, у выніку якой жывымі засталіся толькі малыя дзеці. Захаваліся б усе матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, усе скарбы культуры — бібліятэкі і кнігі, музеі і карціны, навуковыя працы і тэхніка, усе самыя дасканалыя машыны. Род чалавечы не спыніўся б, але гісторыя чалавецтва была б перарвана. Машыны б бяздзейнічалі. Кнігі засталіся б непрачытанымі. Мастацкія творы — непатрэбнымі: іх сэнс і эстэтычная сутнасць не былі б адкрыты. Культурная гісторыя чалавецтва павінна была б пачынацца нанова.

Якую выснову, на ваш погляд, можна зрабіць з гэтага разважання?

9. Якая роля школы ў развіцці культуры? Пракаменціруйце словы французскага пісьменніка В. Гюго: «Навучаць народ — значыць рабіць яго лепшым; адукоўваць народ — значыць павышаць яго маральнасць; рабіць яго пісьменным — значыць цывілізаваць яго».

10. Пісьменнік К. М. Сіманаў адзначаў: «Адукаваны чалавек тым і адрозніваецца ад неадукаванага, што працягвае лічыць сваю адукацыю незавершанай». Пракаменціруйце гэта сцверджанне.

11. Сенека пісаў: «Канец прыйшоў добрым звычаям! Трыумфуе бессаромнасць у адзенні! Мёртвыя дабрадзейнасць і прыстойнасць! Чалавецтва становіцца ўсё горшым! Так казалі ў часы нашых бацькоў, так кажам мы сёння, і тое ж будуць паўтараць заўтра нашы дзеці». Што ў словах рымскага філосафа гучыць актуальна і ў нашы дні? З чым вы нязгодныя? Растлумачце чаму?

12. Вылучаюць некалькі тыповых сцэнарыяў вольнага часу.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Адсутнасць адпачынку.* Крайняя, «выраджаная» сітуацыя, у якой працягласць вольнага часу набліжаецца да нуля. Праца займае гэтулькі часу і адымае гэтулькі сіл, што чалавек ледзь паспявае хоць бы трохі паспаць. Гэта «праца на знос».

*Будзённае гультайства.* Пасля працы — бяздумнае, бесклапотнае і бязмэтнае баўленне часу. Напрыклад, ляжанне на канапе, сядзенне на лаўцы, не занадта інтэлектуальныя гульні (даміно, карты, футбол), балбатня з прыяцелямі, звычайна на адны і тыя жа тэмы. Ёсць і трохі больш асэнсаваныя варыянты: тэлевізар, лёгкая музыка, дыскатэка.

*Хатняя праца.* У людзей сямейных — гэта звычайна непазбежны дадатак да іх прафесійнай, службовай працы. Адны займаюцца хатнімі справамі ахвотна і адпачываюць за імі. У іншых яны толькі павялічваюць стомленасць. Паколькі большая частка гаспадарчых клопатаў па доме — падрыхтоўка ежы, мыццё бялізны, догляд дзяцей — выпадае звычайна на долю жанчын, гэта пакідае ім менш часу для паўнавартаснага адпачынку.

*Свята.* Свята ў шырокім сэнсе слова, г. зн. не толькі дзяржаўнае, рэлігійнае або сямейнае. Гэта можа быць любая форма баўлення вольнага часу, якая рэзка парушае звычайны, паўсядзённы, з дня ў дзень паўтаральны парадак жыцця і стварае прыўзняты настрой. Свята перарывае манатонную плынь будняў.

*Змена заняткаў.* Вольны час запаўняецца нейкімі справамі, якія падабаюцца чалавеку і задавальняюць яго інтэрасы, што выходзяць за межы службовых абавязкаў. Распаўсюджанай формай вольных заняткаў з'яўляюцца хобі — захапленні, якім чалавек з радасцю прысвячае адпачынак. Хобі вельмі разнастайныя: калекцыяніраванне, кулінарыя, рамесныя вырабы, радыётэхніка, камп'ютэр, аўтамабіль, маляванне, музыка, тэатр, спорт, турызм, вывучэнне архітэктуры, гісторыі і г. д. Звычайна падобныя захапленні абмяжоўваюцца аматарскім узроўнем, але некаторыя людзі дасягаюць высокага прафесіяналізму.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Спалучэнне адпачынку з працай.* Гэты сцэнарый вольнага часу тыповы для людзей, якія працуюць ва ўмовах «ненарміраванага» працоўнага дня (індывідуальны прадпрымальнік, менеджэр, увогуле чалавек, які мае магчымасць распараджацца працоўным часам па ўласным меркаванні). Адпачынак можа перамяжоўвацца з працай так, як здаецца зручней, уключацца ў структуру дзейнасці (напрыклад, дзелавая сустрэча на пікніку).

Якому сцэнарыю аддаюць перавагу ў вашай сям'і? Якім відам адпачынку аддаяце перавагу вы? Які з названых сцэнарыяў у большай меры спрые прылучэнню чалавека да культуры? Растлумачце сваё меркаванне.

13. Пазнаёмцеся з урыўкамі з «Роздумаў» рускага навукоўца, філосафа, грамадскага дзеяча Д. С. Ліхачова. Пракаменціруйце іх.

«Адна з найважнейшых асноў, на якіх грунтуецца культура, — гэта памяць. У стварэнні культуры ўдзельнічаюць многія пакаленні людзей. Культура чалавецтва — гэта не геніі, якія нараджаюць усё з сябе. Геніі ствараюцца на пэўнай глебе культуры. Культура перадаецца з пакалення ў пакаленне, назапашваецца. Пры гэтым памяць ніяк не механічная. Гэта вельмі важны творчы працэс: менавіта працэс і менавіта творчы. Запамінаецца тое, што трэба, і запамінаецца паступова, часам пакутліва цяжка, праз пераадоленне памылак і іншы раз насуперак пагібелі найвялікшых каштоўнасцей.

Гісторыя каштоўнасцей — гэта гісторыя чалавечай памяці, гісторыя развіцця памяці, яе паглыбленне і самаўдасканальвання.

Цудоўная ўласцівасць памяці! У памяці асобнага чалавека і ў памяці грамадства захоўваецца пераважна тое, што трэба, добрае — больш актыўна, чым злое. З дапамогай памяці назапашваецца чалавечы вопыт, ствараюцца традыцыі, працоўныя і побытавыя навыкі, сямейны ўклад і інстытуты, якія аблягчаюць жыццё, а таксама развіваецца эстэтычны ўзровень успрымання і творчасці, ствараюцца веды».

14. Г. Р. Вараб'ёў у кнізе «Моладзь у інфармацыйным грамадстве», разважаючы пра ролю адукацыі ў сучас-

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ным свеце, указвае, што ў развітых краінах чалавека з адукацыяй 5 класаў лічаць непісьменным і няздольным прыносіць карысць грамадству. У ЗША такіх непісьменных 5 % і яны складаюць касцяк «хранічных» беспрацоўных. Некваліфікаванай працай у гэтых краінах займаюцца пераважна людзі з адукацыяй не ніжэйшай за 8 класаў. У адпаведнасці з патрабаваннямі ААН кожны работнік у краінах, якія ўступаюць у інфармацыйную стадыю развіцця, павінен мець у сярэднім 11,5 года навучання.

Выкарыстайце гэтыя звесткі для ацэнкі адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Якія высновы асабіста для сябе вы можаце зрабіць з гэтай інфармацыі? У якой навучальнай установе вы хацелі б працягнуць адукацыю?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Урок абагульнення

1. Ахарактарызуйце асноўныя падыходы да вызначэння паняцця «культура».
2. Як суадносяцца матэрыяльны і духоўны бакі культуры?
3. Назавіце асноўныя праявы масавай культуры ў сучасным жыцці. Якая іх роля ў развіцці культуры?
4. Што такое контркультура? Якія магчымы станоўчыя і адмоўныя аспекты яе ўплыву на культуру грамадства ў цэлым?
5. Раскрыйце ролю мовы як асноўнага сродку захавання і перадачы культуры.
6. Растлумачце сэнс наступнага выказвання: «Мінулае прызначана служыць нам, але завалодаць ім мы можам толькі пры ўмове падпарадкавання яго сучаснасці» (Р. Эмерсан). Якое стаўленне да культурнай традыцыі адлюстравана ў гэтых словах?
7. Падрыхтуйце паведамленне пра традыцыі беларускай культуры.
8. Падбярыце з гісторыі і літаратуры прыклады праяўлення нацыянальнага характару беларусаў. Дайце ім маральную ацэнку.
9. Ад чаго залежыць паспяховае ўваходжанне чалавека ў культуру?
10. Напішыце эсэ на тэму «Школа будучыні».

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Тэма 3. Міжасабовыя зносіны



## § 14. Роля зносін у жыцці людзей

**Зносіны і іх функцыі.** Вядомы французскі пісьменнік Антуан дэ Сент-Экзюперы (1900—1944) адзначыў, што «адзіная сапраўдная раскоша — гэта раскоша чалавечых зносін». Штодзень кожны з нас уступае ў зносіны са сваякамі, сябрамі, досыць вялікай колькасцю людзей.

*Зносіны (адносіны, стасункі)* — гэта працэс узаемадзеяння людзей, пад час якога яны абменьваюцца інфармацыяй, выяўляюць сваё стаўленне адно да аднаго.

Галоўная функцыя зносін заключаецца ў тым, каб *спрыяць станаўленню і развіццю чалавека як асобы*. Дзіця, якое нарадзілася на свет, яшчэ не навучылася гаварыць, аднак яно ўжо ўмее даносіць свае перажыванні да бацькоў. Пры дапамозе дарослых яно вучыцца выказваць свае адчуванні, жаданні, думкі, у далейшым — чытаць, пісаць, правільна паводзіць сябе ў зносінах з іншымі. У сумеснай дзейнасці людзей (гульнявой, навучальнай, вытворчай, навуковай і інш.) *зносіны выступаюць неабходным сродкам дасягнення намечанага выніку*. У гэтым заключаецца яшчэ адна функцыя зносін, якую называюць *прагматычнай* (ад лац. pragma — дзеянне, справа).

Зносіны для любога чалавека звязаны з ацэньваннем іншых людзей і наладжваннем пэўных адносін з імі — або станоўчых, або адмоўных. У розных сітуацыях узнікаюць такія супрацьлеглыя пачуцці, як сімпатыя і антыпатыя, любоў (каханне) ці нянавісць, павага ці пагарда і г. д. Напэўна, вы ведаеце прыклады таго, як аднакласнік падзяжурыў у класе замест хворага таварыша, а нехта іншы, магчыма, адмовіўся абараняць гонар класа ў спартыўных спаборніцтвах.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Зносіны, поўныя добрых пачуццяў, з'яўляюцца крыніцай духоўнага росту. У ходзе зносін важна аказваць розныя знакі павагі, звяртацца па імені, іншымі спосабамі пацвярджаць павагу да суразмоўцы. Гэта дазваляе чалавеку сцвердзіцца ва ўласных вачах, умацаваць яго ўпэўненасць у сабе. Тым самым паспяхова выконваецца ўласцівая зносінам *функцыя пацвярджэння.*

**Віды і формы зносін.** Кожны з нас жыве сярод людзей і ад іх набывае шмат каштоўнага, вучыцца працаваць і змястоўна праводзіць вольны час. Ёсць розныя віды зносін. Кожны з нас мае свае асаблівасці і правілы.




*Схема 1.* Віды зносін

*Міжасабовыя* зносіны маюць перадумовай непасрэдныя кантакты людзей у малых групах. Множныя непасрэдныя кантакты незнаёмых людзей (напрыклад, у натоўпе), а таксама зносіны з дапамогай радыё, тэлебачання, газет, часопісаў, электронных сродкаў масавай інфармацыі называюць *масавымі* зносінамі.

Вылучаюць таксама *нефармальныя* зносіны (напрыклад, зносіны з сябрамі) і *ролевыя* зносіны (вучань —

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



І. А. Давідовіч. *Першадрукар Францыск Скарына* (1968)

настаўнік, пакупнік — прадавец, сын — бацька і г. д.), у ходзе якіх чалавек выступае як носьбіт пэўнай ролі і дзейнічае так, як прадпісвае яму яго роля.

Зносіны могуць быць таксама асабістымі і дзелавымі. У асабістых зносінах абменьваюцца неафіцыйнай інфармацыяй. Тут праяўляецца эмацыянальнае стаўленне людзей адно да аднаго. Дзелавыя зносіны характарызуюцца выкананнем сумесных абавязкаў. Напрыклад, вучні пад кіраўніцтвам настаўніка разам працуюць на ўроку.

*Непасрэднымі* зносінамі называюць кантакты паміж людзьмі ў транспарце, на вуліцах, у крамах і г. д. Колькасць такіх кантактаў увесь час павялічваецца па меры развіцця грамадскіх сувязей. Аднак у наш час непасрэдныя зносіны часта замяняюцца *апасродкаванымі* — з дапамогай тэлефона, аўдыё- і відэатэхнікі, інтэрнэта.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Пра даверлівыя і канфліктныя зносіны будзе сказана ў наступных параграфах.

Вылучаюць таксама разнастайныя формы зносін.




*Схема 2.* Формы зносін

*Імператыўныя* зносіны (ад лац. imperativus — уладны) — аўтарытарная, дырэктыўная форма ўздзеяння на чалавека. Пры гэтым ставіцца мэта кантраляваць яго паводзіны, прымусіць да пэўных дзеянняў ці рашэнняў. Імператыўныя зносіны заснаваны на беспярэчным падпарадкаванні, на катэгарычных указаннях, якія выконваюцца безадгаворачна. Апраўданы яны, напрыклад, у статутных адносінах паміж ваеннаслужачымі ці пры рабоце ў надзвычайных абставінах. У імператыўных зносінах выкарыстоўваюцца загады, прадпісанні, указанні, патрабаванні і нават пагрозы. Аднак дырэктыўная форма непрымальная ў адносінах паміж сябрамі, паміж мужам і жонкай, паміж настаўнікам і вучнем.

Пры *маніпулятыўных* зносінах (ад лац. manipulus — жменя) уплыў на чалавека з мэтай дасягнення сваіх намераў ажыццяўляецца скрытна. Яны нярэдка выкарыстоўваюцца ў сферы рэкламы і прапаганды, часам сустракаюцца ў паўсядзённым жыцці. Успомніце, як школьнікі спасылаюцца на добрыя адзнакі, звяртаючыся да бацькоў з рознымі просьбамі. Маніпулятара часта характарызуюць ілжывасць, прымітыўнасць пачуццяў, цынізм і недавер да іншых, з прычыны чаго ўзнікае пагроза для блізкіх, даверлівых адносін.

Імператыўная і маніпулятыўная формы зносін, па сутнасці, з'яўляюцца разнавіднасцямі *маналагічных* зносін.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Чалавек, які разглядае іншага толькі як аб'ект уздзеяння для дасягнення ўласных мэт, не бачыць у ім сапраўднага суразмоўцу. Меркаванне іншага яго не цікавіць, бо ён імкнецца навязаць сваю пазіцыю.

Значна больш магчымасцей для наладжвання ўзаемаразумення і ўзаемнага ўзбагачэння асоб утрымліваюць *дыялагічныя* зносіны, якія з'яўляюцца раўнапраўнымі, гуманістычнымі, даверлівымі.

**Асноўныя правілы дыялагічных зносін:**

- успрыманне партнёра па зносінах як роўнага, з правам на ўласнае меркаванне і рашэнне;
- давер і павага да намераў партнёра;
- улік у зносінах пачуццяў, жаданняў, фізічнага стану іншых людзей;
- абмяркоўванне агульных праблем;
- зварот да суразмоўцы ад свайго імя, без спасылкі на меркаванні і аўтарытэты, выяўленне сваіх сапраўдных пачуццяў і жаданняў.

Да трыццаці гадоў кола знаёмых у кожнага чалавека пашыраецца ў сярэднім да некалькіх соцень, а часам і тысяч. Мы становімся часцінкай вялікага «акіяна» зносін. Тое, што адбываецца ў нашым жыцці, уплывае на іншых людзей, а тое, што адбываецца ў іх жыцці, уплывае на нас.

**Сродкі зносін.** Любыя зносіны ажыццяўляюцца па двух асноўных каналах перадачы інфармацыі: моўным (вербальным) і нямоўным (невербальным).

Вы ўжо ведаеце, наколькі значнае для плённага ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі пісьменнае і правільнае вуснае і пісьмовае маўленне. Важную ролю ў зносінах адыгрываюць не толькі дакладнасць ужывання слоў, правільнасць пабудовы фразы і вымаўлення, але і тэмп гаворкі, рытм, тэмбр. Звычайна найбольш прывабнае плаўнае, мернае маўленне.

Знакаміты персанаж А. Конан-Дойля (1850—1930) Шэрлак Холмс заўважыў, што людзі, з якімі мы ўступаем

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

у зносіны, даюць нам пра сябе значна больш інфармацыі, чым утрымлівае іх маўленне ці наша папярэдняя пра іх дасведчанасць. *Невербальныя сродкі зносін* — гэта жэсты, пастава, хада, міміка, кантакт вачамі. Важная нават адлегласць, на якой суразмоўцы знаходзяцца адзін ад аднаго. Возьмем, напрыклад, размяшчэнне рук у гутарцы. Раскрытыя далоні — характэрны знак шчырасці і адкрытасці. Калі чалавек вас не разумее, то ён суправаджае раскрыццё рук пацісканнем плеч. Лёгкі дотык да кончыка носа — знак сумнення.

Жэсты шмат у чым абумоўлены нацыянальнымі традыцыямі і сацыяльнымі адрозненнямі. У розных народаў адзін і той жа рух можа абазначаць розныя пачуцці. Калі вы ў размове раптам пакажаце язык, усім ясна — вы дражніцеся. А ў Старажытным Кітаі гэты жэст разумелі як пагрозу. У народа майя гэта быў знак мудрасці. Ваша ўсмешка ці пахмурны, напружаны твар, жэсты, рухі могуць сказаць людзям значна больш, чым вашы словы.

**Некаторыя высновы**

1. Зносіны — гэта ўзаемадзеянне людзей з мэтай перадачы адно аднаму інфармацыі, дасягнення разумення іншага чалавека, выяўлення свайго стаўлення да яго. 2. Адрозніваюць наступныя віды зносін: міжасабовыя — масавыя, ролевыя — нефармальныя, асабістыя — дзелавыя, апасродкаваныя — непасрэдныя, даверлівыя — канфліктныя. 3. Асноўнымі формамі зносін з’яўляюцца маналагічныя (імператыўныя альбо маніпулятыўныя) і дыялагічныя. 4. Гуманістычныя па сваёй сутнасці дыялагічныя зносіны дазваляюць дасягнуць глыбокага ўзаемаразумення, самараскрыцця людзей, ствараюць умовы для іх узаемнага развіцця. 5. Зносіны ажыццяўляюцца з дапамогай вербальных і невербальных сродкаў, якія шмат у чым абумоўлены нацыянальнымі традыцыямі і сацыяльнымі адрозненнямі.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

### *Пытанні і заданні*

1. Успомніце словы Антуана дэ Сент-Экзюперы пра раскошу чалавечых зносін. На ваш погляд, які сэнс уклаў пісьменнік у гэтыя словы?
2. Якую ролю адыгрываюць зносіны ў развіцці асобы дзіцяці?
3. Амерыканскі філосаф і псіхолаг Уільям Джэймс (1842—1910) адзначаў, што для чалавека «не існуе больш жахлівага пакарання, чым быць у кампаніі і ў той жа час заставацца сам-насам, абсалютна незаўважаным». Пракаменціруйце гэтыя словы. Свой адказ аргументуйце.
4. Л. С. Выгоцкі (1896—1934) зазначыў, што чалавек і сам-насам захоўвае функцыю зносін. Як бы вы маглі абгрунтаваць і праілюстраваць гэты пункт гледжання знакамітага савецкага псіхолага?
5. Якія віды зносін вы лічыце самымі важнымі? Чаму?
6. У чым падабенства і адрозненне імператыўнай і маніпулятыўнай формаў зносін? У якіх сферах узаемадзеяння людзей іх мэтазгодна выкарыстоўваць?
7. Як вы разумееце сэнс асноўных правіл гуманістычных зносін?

## § 15. Узаемадзеянне з навакольнымі людзьмі

**Успрыманне і разуменне людзьмі адно аднаго.** Як мы ўспрымаем і разумеем адно аднаго ў працэсе зносін? Знакаміты герой М. Сервантэса (1547—1616) Дон Кіхот, адпраўляючы свайго збраяносца з лістом да Дульсінеі, казаў яму: «Напруж сваю памяць і хай не сатрэцца з яе, як мая пані цябе прыме; ці зменіцца ў твары, пакуль ты будзеш выкладаць ёй маю просьбу; занепакоіцца ці збянтэжыцца, усхвалюецца, пачуўшы маё імя», «Назірай за ўсімі дзеяннямі яе і рухамі, таму што, калі ты выкладзеш мне ўсё дакладна, то я ўгадаю, якія ў глыбіні душы яна мае да мяне пачуцці».

Для разумення адно аднаго і наладжвання ўзаемаадносін вельмі важная назіральнасць, якая патрабуе пільнай увагі і абапіраецца на жыццёвы і прафесіянальны вопыт асобы.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Глыбіня, аб'ектыўнасць, хуткасць успрымання і разумення іншага залежаць ад полу, узросту, нацыянальных асаблівасцей, ладу жыцця чалавека, а таксама ад псіхічнага стану і ўвогуле ад стану здароўя. Уплываюць таксама зыходная ўстаноўка, вопыт зносін, прафесіянальныя і асобасныя адметнасці. Так, падлеткі звяртаюць увагу ў першую чаргу на фізічныя даныя іншага чалавека, больш дакладна вызначаюць узрост маладых людзей, але часцей памыляюцца пры вялікай розніцы гадоў. Дзеці і падлеткі часам не могуць зразумець дарослых і правільна ацаніць іх дзеянні. Нямногія ўмеюць «чытаць чалавека, як кнігу». Разам з тым можна значна палепшыць свае магчымасці ў пазнанні іншых людзей, наладжванні спрыяльных адносін з імі.

Калі быць добразычлівым, ласкавым і ветлівым з суразмоўцам, то можна разлічваць на яго ўзаемнасць. Зразумець унутраны стан іншага найпрасцей праз суперажыванне ці спачуванне яму. Для гэтага трэба ў думках паставіць сябе на яго месца. Асаблівай формай пазнання іншага чалавека з'яўляецца прыняцце яго пазіцыі дзякуючы станоўчым пачуццям да яго.

У працэсе зносін мы не толькі вучымся разбірацца ў людзях, але і пачынаем лепей разумець сябе. Самапазнанне ў працэсе зносін атрымала назву сацыяльнай рэфлексіі.

*Сацыяльная рэфлексія* — гэта здольнасць асобы ўявіць, як яе ўспрымае іншы чалавек у працэсе зносін. Чым больш чалавек схільны да змястоўных і даверлівых зносін, тым лепей у яго развіваецца здольнасць да рэфлексіі.

Ва ўсіх ёсць свае звыклыя схемы тлумачэння чужых паводзін. Пры фарміраванні першага ўражання часта праяўляецца *эфект «ружовых акуляраў»*: папярэдне ўзніклае агульнае добрае ўражанне пра чалавека спрыяе станоўчым ацэнкам яшчэ невядомых яго якасцей. Наадварот, усталяванае агульнае кепскае ўражанне схіляе да адмоўных ацэнак яго новых учынкаў ці якасцей. Пры

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



А. Л. Ржэўская. *Вясёлая часінка* (1897)

ўспрыманні знаёмага дзейнічае *эфект навізны*: новая інфармацыя пра чалавека, непадобная да папярэдняй, аказваецца больш значнай для фарміравання меркавання пра яго. *Эфект праекцыі* заахвочвае нас знаходзіць у іншым, як у люстэрку, свае ўласцівасці, рысы і адчуванні. Прыемнаму для нас суразмоўцу мы схільныя прыпісваць уласныя вартасці, а непрыемнаму — свае недахопы. Нярэдка праекцыя выступае як механізм псіхалагічнай абароны. Напрыклад, непісьменны чалавек бывае празмерна ўважлівы да памылак іншых; баязлівы можа адкрыта радавацца няўдачам смелых людзей; занадта заклапочаны якімі-небудзь праблемамі часта чакае такіх жа праблем і ў навакольных.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Успрымаючы іншага чалавека, мы звычайна кіруемся *стэрэатыпамі* — звыклымі для нас поглядамі. Напрыклад, «носіць акуляры — разумны», «вочы — люстэрка душы». Стэрэатыпы могуць фарміравацца як вынік нашага асабістага досведу, да якога далучаюцца звесткі з кніг, кінафільмаў і г. д. Аднак стэрэатыпы, калі да іх не ставіцца крытычна, прыводзяць да спрошчанага ці нават скажонага разумення іншага чалавека, да ўзнікнення прадузятасцей.

**Спосабы ўзаемадзеяння.** Зносіны паміж людзьмі — гэта не толькі абмен інфармацыяй, але і арганізацыя сумесных дзеянняў. Напрыклад, некалькі вучняў вырашылі выпусціць насценгазету. Для гэтага яны дамовіліся падзяліць абавязкі: хтосьці піша тэксты, хтосьці малюе, хтосьці афармляе загалоўкі.

Узаемадзейнічаючы з навакольнымі, мы выкарыстоўваем розныя спосабы дасягнення пастаўленай мэты. Супрацоўніцтва і ўзгодненасць дзеянняў дапамагаюць вырашыць агульную задачу. Так, калі вучні на ўроку будуць працаваць разам з настаўнікам, уважліва сачыць за яго думкаю, актыўна шукаць адказы на пастаўленыя пытанні, то вучоба будзе цікавай і больш эфектыўнай.

Супрацьборства і няўзгодненасць дзеянняў, наадварот, перашкаджаюць дасягненню пастаўленых мэт. Так, у футболе важныя дзеянні менавіта каманды, а калі хтосьці імкнецца вылучыцца любым чынам, ігнаруючы намаганні партнёраў, то каманда рызыкуе пацярпець паражэнне.

Найважнейшыя са спосабаў уздзеяння людзей адно на аднаго — заражэнне, унушэнне, перакананне, пераймание.

*Заражэнне* — гэта распаўсюджванне якой-небудзь дзейнасці ці настрою ад аднаго чалавека да іншага, што адбываецца быццам само сабой. Яркім прыкладам такога спосабу ўзаемадзеяння з'яўляюцца паводзіны спартыўных заўзятараў. Асаблівыя ўмовы, у якіх узмацняецца ўздзеянне праз заражэнне, — натоўп і сітуацыя панікі, калі людзі кепска разумеюць, што адбываецца, і іх паводзіны могуць стаць непрадказальнымі.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Унушэнне* — уздзеянне аднаго чалавека на іншага ці на групу людзей, якое вядзе да таго, што ў іх міжвольна з'яўляюцца якія-небудзь пачуцці, намеры і г. д. У адрозненне ад заражэння, за выключэннем асобных выпадкаў гіпнозу, унушэнне ажыццяўляецца праз маўленчае паведамленне і заснавана на яго некрытычным успрыманні.

*Перакананне* — лагічна абгрунтаваны працэс заахвочвання чалавека прыняць пэўныя каштоўнасці, вераванні ці адносіны. У адрозненне ад унушэння перакананне абапіраецца на давер да розуму чалавека, яго здольнасць пагадзіцца з правільнымі довадамі, развагамі.

*Перайманне* — гэта ўспрыманне чалавекам узораў дэманстраваных паводзін. Яно мае важнае значэнне для засваення жыццёвага вопыту. Так, дзеці бяруць прыклад з аўтарытэтных для іх дарослых ці старэйшых дзяцей. Праўда, перайманне можа быць і некрытычным. Пераймаючы, можна навучыцца не толькі добраму — працавітасці, ветлівасці, але і кепскаму — грубасці, брыдкаслоўю і г. д.

**Ролевае ўзаемадзеянне.** Па меры ўскладнення чалавечых зносін выпрацоўваліся ўсё новыя іх правілы. Згадайце, напрыклад, чым пры феадалізме паводзіны селяніна адрозніваліся ад паводзін землеўласніка. Кожны з іх выконваў сваю сацыяльную ролю дакладна ў адпаведнасці з прынятым у тым грамадстве наборам нормаў і патрабаванняў.

У псіхалогіі пад *роляй* разумеюць нарматыўна ўхвалены ўзор паводзін, які навакольныя чакаюць ад кожнага, хто займае тую ці іншую сацыяльную пазіцыю (паводле ўзроставых ці палавых характарыстык, роду заняткаў, наяўных узаемаадносін і інш.).

Адзін і той жа чалавек можа аднačасова рэалізоўваць некалькі сацыяльных роляў (напрыклад, ваш аднакласнік — сын, вучань, сябар, стараста ў класе, старэйшы брат, «душа» дваровай кампаніі і г. д.). Некаторыя ролі дадзены нам ад нараджэння. Так, чалавек нараджаецца

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

хлопчыкам ці дзяўчынкай. Іншыя ролі набываюцца ў працэсе жыцця і ўзаемадзеяння ў групах. Скажам, работнік завода быў добрым майстрам і стаў начальнікам змены; супрацоўнік навуковай лабараторыі абараніў дысертацыю, атрымаў навуковую ступень і прызначаны на вышэйшую пасаду.

У некаторых сітуацыях множнасць ролевых пазіцый спараджае іх сутыкненне. Узнікае *ролевы канфлікт*, які ставіць чалавека перад неабходнасцю аддаць перавагу якойсьці з роляў. Напрыклад, школьнік павінен у пятніцу ўвечары наведаць факультатыў па фізіцы, а ў гэты ж час яго спартыўная каманда ўдзельнічае ў турніры па футболе. Як быць? У падобных сітуацыях чалавек павінен вырашыць для сябе і паведаміць навакольным, якая з роляў падаецца яму больш важнай.

Узаемадзеянне людзей, якія выконваюць розныя ролі, рэгулюецца *ролевымі спадзяваннямі*. Так, заседзеўшыся ля камп'ютэра, дзевяцікласнік стаміўся і хоча спаць, але сацыяльныя ролі вучня і старасты класа патрабуюць, каб на занятку ён прыйшоў у час і падрыхтаваны.

У зносінах з іншымі заўсёды важна ўлічваць іх спадзяванні адносна нас як партнёраў па зносінах. Напрыклад, вы прыйшлі ў бібліятэку і, узяўшы кнігу, ціха працуеце за сталом; у грамадскім транспарце вы ветлівыя і прыязныя з навакольнымі, своечасова аплачваеце праезд. Чалавек іграе пэўную ролю з улікам тых патрабаванняў, якія да гэтай ролі прад'яўляюць у грамадстве. За правільнае выкананне сваёй ролі ён атрымлівае заслужанае ўхваленне, за няправільнае — караецца. Зносіны — гэта універсальны інструмент, які дапамагае дамагчыся многага з таго, чаго мы хочам дасягнуць.

**Некаторыя высновы**

1. Важную ролю ў разуменні іншага чалавека адыгрываюць суперажыванне, спагада і назіральнасць. 2. Пры фарміраванні меркавання пра іншага чалавека належыць вельмі асцярожна выкарыстоўваць стэрэатыпы. 3. Асноўныя спосабы ўздзеяння людзей

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

адно на аднаго — гэта заражэнне, унушэнне, перакананне, перайманне. 4. Кожны чалавек выконвае пэўныя сацыяльныя ролі. Навакольныя ў той ці іншай форме кантралююць іх выкананне. Несупадзенне ролевых спадзяванняў у адносінах нярэдка прыводзіць да неразумення і канфліктаў.

***Пытанні і заданні***

1. Якія рысы асобы ўплываюць на працэс успрымання і разумення яе іншымі людзьмі? Прывядзіце прыклады.
2. Назавіце вядомыя вам эфекты, якія ўзнікаюць пры ўспрыманні людзьмі адно аднаго.
3. Што такое стэрэатыпы зносін? Якім чынам можна паменшыць негатыўны ўплыў стэрэатыпаў пры ўспрыманні іншых людзей?
4. У чым заключаецца стэрэатып чакання? Як ён можа праяўляцца ва ўзаемаадносінах?
5. У чым падобныя і адрозныя заражэнне і ўнушэнне як спосабы ўздзеяння ў працэсе зносін?
6. Што такое ролевы канфлікт? Як ён можа быць вырашаны?

## § 16. Зносіны ў малых групах

**Віды зносін у групах.** Калі некалькі чалавек уступаюць у зносіны, паміж імі ўзнікаюць сувязі, якія ператвараюць іх у малую групу. Уявіце сабе пасажыраў у купэ цягніка. Часам людзі яшчэ і двух слоў не сказалі адно аднаму, а кантакт паміж імі ўжо ўзнік. Гэтак могуць зараджацца сімпатыя, антыпатыя, ухваленне, асуджэнне і г. д. Прычым звычайна знаходзіцца чалавек, які бярэ на сябе функцыі ініцыятара гутаркі. І, як ні кароткачасовае існаванне такой групы, менавіта яна ў гэты перыяд, а бывае — і на больш працяглы тэрмін, вызначае настрой людзей, эмацыянальную атмасферу. Пасажыраў у купэ можна ахарактарызаваць як групу *кароткачасовую* і *нефармальную*, г. зн. афіцыйна не аформленую, якая ўзнікла выпадкова.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Кожны чалавек з'яўляецца членам многіх груп, такіх, як, напрыклад, сям'я, клас, спартыўная каманда, працоўны калектыў ці гурток мастацкай самадзейнасці. Групы, спецыяльна створаныя для пэўнай дзейнасці, называюцца *фармальнымі*. Такія групы маюць сваю структуру, а нярэдка і статут, які рэгламентуе іх дзейнасць. Групы адрозніваюцца таксама па колькасці членаў. *Малымі* называюць групы, у складзе якіх ад 2 да 30—40 чалавек.



В. Д. Паленаў. *Бабулін сад* (1878)

Школьны клас — гэта фармальная малая група. Аднакласнікі аб'яднаны ў ім агульнай дзейнасцю і маюць магчымасць непасрэднага кантакту. Унутры такой групы пад уплывам узаемных сімпатый і антыпатый непазбежна з'яўляюцца больш дробныя групоўкі. Прыгледзьцеся да свайго класа: у кожнага з аднакласнікаў ёсць кола найбліжэйшых зносін, сваё мікраасяроддзе.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Любы член групы займае ў ёй пэўнае становішча. У малой групе фармальныя ролі (стараста, выдатнік, сын дырэктара і г. д.) звычайна не з'яўляюцца галоўнымі, не вызначаюць гэта становішча. Больш важнай аказваецца ступень папулярнасці і аўтарытэтнасці чалавека, іншымі словамі, яго асабісты статус.

Можа здарыцца, што чалавек дзейнічае ў групе, якую не лічыць сваёй. Напрыклад, у класе ён адчувае сябе адчужана, затое яму цікавыя прыяцелі са спартыўнага клуба, альбо ён увогуле бярэ прыклад з герояў якогасьці маладзёжнага тэлесерыяла і ў ім знаходзіць каштоўнасці і ўзоры сваіх паводзін. Група, з якой чалавек запазычвае нормы, каштоўнасці і ўстаноўкі паводзін, называецца *рэферэнтнай* (ад лац. referre — адносіць) ці *эталоннай*. Ведаючы, з кім чалавек гутарыць, сустракаецца, можна вызначыць яго інтарэсы і растлумачыць многае ў яго паводзінах.

**Групы і калектывы.** Найніжэйшы ўзровень развіцця групы — гэта *дыфузныя (выпадковыя) групы*, у якіх людзі аб'яднаныя толькі агульнымі эмоцыямі і перажываннямі. Заўзятары на стадыёне — яркі прыклад такой групы.

Найвышэйшым узроўнем развіцця адносін людзей з'яўляецца калектыў. У ім ствараюцца ўмовы, спрыяльныя для сумеснай дзейнасці, ёсць органы самакіравання. *Калектыў* аб'ядноўвае людзей для выканання задач, карысных грамадству, у ім існуе атмасфера ўзаемнай адказнасці. Усе члены калектыву падзяляюць яго каштоўнасці, успрымаюць яго як рэферэнтную для сябе групу. Міжасабовыя зносіны ў калектыве маюць характар узаемадапамогі і ўзаемаразумення, эмацыянальнай сумяшчальнасці і зладжанасці. Нават нечаканыя сур'ёзныя цяжкасці не выбіваюць добры калектыў з каляіны, не ўносяць дэзарганізаванасць і раздражнёнасць ва ўзаемаадносіны паміж людзьмі.

Развіццё групы ў калектыў — складаны працэс, які праходзіць шэраг этапаў. Возьмем, напрыклад, школьны клас. Першы этап характарызуецца актыўным прыстасаваннем школьнікаў да вучэбнага працэсу і засваеннем патрабаванняў, нормаў, традыцый навучальнай

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

установы. На другім этапе фарміруецца актыў з вучняў, якія маюць аўтарытэт у большасці. Адначасова класны калектыў асэнсоўвае свае мэты, прапануе найбліжэйшыя задачы і паслядоўна іх вырашае. Трэці этап адрознівае высокі ўзровень згуртаванасці, блізкасць поглядаў, ацэнак і пазіцый членаў калектыву класа ў вырашэнні праблем, найбольш значных для яго.




*Схема 3.* Этапы развіцця калектыву

Сталы калектыў па сваёй атмасферы набліжаецца да дружнай сям'і, у якой усе праблемы вырашаюцца так, каб спрыяць асобаснаму росту кожнага яе члена і агульнай карысці.

**Лідэрства і кіраўніцтва.** Важную ролю ў жыцці групы адыгрываюць яе кіраўнік і лідэр. *Кіраўнік* прадстаўляе фармальную структуру групы і прызначаецца афіцыйна. *Лідэра* вылучае само жыццё. Гэта чалавек, які хоча і можа ўплываць на іншых, весці іх за сабой і за якім людзі хочуць ісці. Часам кіраўнік і лідэр — адна і тая ж асоба. Гэта самы спрыяльны выпадак.

Кіраўніцтва і лідэрства звязаны з паняццем «улада» і «ўплыў». *Улада* прадугледжвае санкцыі: пазітыўныя (узнагароды) ці негатыўныя (пакаранні — пазбаўленне ўзнагароды ці доступу да якіх-небудзь выгод). *Уплыў* —

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

паняцце больш шырокае, чым улада, яно цесна звязана з лідэрствам. Гэта адносіны, пры якіх чалавек стымулюе іншых дзейнічаць пэўным чынам.

**Асноўныя ўменні і здольнасці кіраўніка:**

- майстэрства быць роўным;
- майстэрства быць лідэрам;
- майстэрства вырашаць канфлікты;
- майстэрства перапрацоўваць інфармацыю;
- майстэрства прымаць нестандартныя кіраўнічыя рашэнні;
- майстэрства размяркоўваць рэсурсы ў арганізацыі;
- здольнасць апраўдана рызыкаваць і ўкараняць новаўвядзенні;
- майстэрства самааналізу.

Ці кожны чалавек можа стаць лідэрам? Пры адказе на гэта пытанне трэба ўлічыць наступнае. Па-першае, лідэру ўласцівы такія псіхічныя якасці, як упэўненасць у сабе, востры і гнуткі розум, моцная воля, арганізатарскія здольнасці. Па-другое, у розных групах прад'яўляюцца неаднолькавыя патрабаванні да лідэра: ён павінен мець рысы, важныя менавіта для гэтай групы. Нездарма кажуць: «Якая група, такі і лідэр». Па-трэцяе, у розных сітуацыях у якасці лідэра вылучаюцца розныя людзі. Важна, каб гэты чалавек мог прывесці групу да вырашэння яе праблем.

Часта кіраўнік і нефармальны лідэр маюць розныя мэты: кіраўнік цалкам засяроджаны на задачах, для рашэння якіх група стваралася, лідэр жа больш арыентаваны на яе ўнутраныя інтарэсы. Тым не менш супадзенне лідэра і кіраўніка ў адной асобе бывае вельмі эфектыўным (напрыклад, у навуковым калектыве, у моладзевай грамадскай арганізацыі). Пры наяўнасці ў калектыве некалькіх нефармальных груп кожная з іх можа сфарміраваць свае правілы і нормы і ўнутры кожнай можа вызначыцца свой лідэр. Кіраўнік калектыву павінен умець узаемадзейнічаць

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

з лідэрамі нефармальных груп, якія выказваюць і фарміруюць погляды гэтых груп.

У працэсе кіравання групай выкарыстоўваюць той ці іншы спосаб уплыву на падначаленых у залежнасці ад сітуацыі. Існуюць *тры асноўныя стылі кіравання*: аўтарытарны (праз загады, непадлеглыя абмеркаванню), дэмакратычны (праз калектыўнае абмеркаванне і сумеснае прыняцце рашэнняў) і ліберальны, які часам называюць «патуральніцкім» (поўны давер і перадача функцый падначаленым). Апошні можа быць выніковым, калі група характарызуецца высокай згуртаванасцю і адказнасцю, інакш ён вядзе да развалу, дэзарганізацыі групы.

### Некаторыя высновы

1. З пачаткам зносін паміж людзьмі ўзнікаюць сувязі, якія ператвараюць гэтых людзей у малую групу. 2. Група праходзіць у сваім развіцці, станаўленні шэраг этапаў. Найвышэйшая форма аб'яднання — калектыў. 3. Галоўнай прыкметай калектыву з'яўляецца агульная дзейнасць, карысная не толькі для членаў групы, але і для грамадства ў цэлым. 4. Вылучэнне чалавека ў лідэры абумоўлена як яго асобаснымі якасцямі, так і асаблівасцямі ўзаемаадносін у групе, яе мэтамі, каштоўнасцямі і нормамі. 5. Прызначэнне кіраўніка групы — арганізаваць рашэнне задач, для якіх яна створана. Лідэр больш арыентаваны на інтарэсы членаў групы; ён забяспечвае яе згуртаванасць.

### ?! ***Пытанні і заданні***

1. Якое аб'яднанне людзей называюць малой групай?
2. Апішыце ўзроўні развіцця сацыяльных груп, ахарактарызуйце іх асаблівасці.
3. Пералічыце асноўныя рысы, уласцівыя калектыву. Якія з гэтых рыс ёсць у вашага школьнага класа?

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

4. Якой групай з’яўляецца сям’я? Абгрунтуйце свой адказ.
5. Як вы лічыце, чаму часам для падлетка яго клас перастае быць прывабным і ён супастаўляе свае паводзіны зусім з іншай групай? Як называецца такая група?
6. Якая роля лідэра ў малой групе?
7. У чым адрозненне кіраўніка ад лідэра?
8. Ахарактарызуйце паняцці «ўплыў» і «ўлада». Прывядзіце прыклады выкарыстання ўлады ў кіраўніцтве групамі, членамі якіх вы з’яўляецеся.
9. Якія якасці і ўменні ўласцівы паспяховаму кіраўніку?
10. Напішыце эсэ на тэму «Калі б дырэктарам школы быў я...».

## § 17. Сацыяльная арыентацыя асобы

**Эгаізм і альтруізм.** Эгаістычна настроены чалавек у зносінах шукае выгады галоўным чынам для сябе. Ён з цяжкасцю адаптуецца ў калектыве, дзе хутка распазнаюць яго арыентацыю толькі на задавальненне ўласных патрэбнасцей і здабыванне даброт жыцця выключна для сябе. Біялагічнай перадумовай эгаізму з’яўляецца інстынкт самазахавання; яна звычайна ўзмацняецца няправільным выхаваннем. Калі ў малой групе інтарэсы адных людзей супрацьпастаўляюцца інтарэсам іншых людзей, гэта можа прывесці да распаду групы.

*Эгаізм* — рыса асобы, якая заключаецца ў сябелюбнасці, засяроджанасці на сваім Я, раўнадушшы да іншых людзей.

*Альтруізм* процілеглы эгаізму і прадугледжвае добраахвотную дапамогу чалавека іншым людзям, яго гатоўнасць ахвяраваць для іх асабістымі інтарэсамі.

Прычыну жадання дапамагаць людзям некаторыя навукоўцы тлумачаць эмпатыяй (суперажываннем), а таксама імкненнем чалавека пераадолець уласны негатыўны стан, які выкліканы горам ці пакутамі іншых.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Альтруістычныя паводзіны звычайна разглядаюцца як стратэгія, што развілася ў працэсе натуральнага адбору. Так, праяўляючы альтруізм да дзяцей, людзі спрыяюць захаванню чалавечага роду. Акрамя таго, дапамагаючы камусьці сёння, мы маем права спадзявацца, што ў будучыні дапамогуць і нам. Нормы альтруізму — гэта сацыяльная адказнасць (дапамога тым, каму яна патрэбна) і ўзаемная адказнасць (дапамога тым, хто дапамог нам). Такія нормы з'яўляюцца важнымі ўмовамі паспяховага ўзаемадзеяння чалавека з іншымі людзьмі.

Калі людзі больш схільныя дапамагаць адно аднаму? Калі бачаць, што гэта робяць і іншыя, а таксама калі не спяшаюцца і не захоплены сваімі думкамі і клопатамі. Мае значэнне і стан чалавека, яго настрой. Так, здзейсніўшы які-небудзь заганны ўчынак, людзі потым часта жадаюць дапамагчы каму-небудзь, спадзеючыся тым самым палегчыць узніклае адчуванне віны. Нарэшце, існуе вельмі цікавая з'ява — «добры настрой — добрыя ўчынкі»: шчаслівыя людзі звычайна гатовы прыйсці на дапамогу.

**Індывідуалізм і калектывізм.** Узгодненасць у зносінах паміж людзьмі — найважнейшая ўмова паспяховага супрацоўніцтва і плённай жыццядзейнасці. *Калектывіст* — гэта чалавек, які ўспрымае і перажывае інтарэсы малой групы, у якую ён уключаны, як самыя каштоўныя і значныя для сябе. Псіхолагі заўважылі, што ў вялікіх калектывах іншым разам адбываецца скачкападобны рост актыўнасці. Удзельнікаў ахоплівае адзіны парыў, удзесяцяраецца эмацыянальная і фізічная энергія. Амаль разрозненая маса людзей ператвараецца ў сілу, здольную здзейсніць маштабныя справы.

Нішто так не гуртуе калектыў, як сумесная натхнёная праца. Добра арганізаванай калектыўнай працы ўласцівы атмасфера гарэння, спаборніцтва, узаемнай падтрымкі, г. зн. усяго таго, што аб'ядноўвае людзей і памнажае іх сілы, уздымае творчыя магчымасці кожнага на вышэйшую ступень.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

На фарміраванне такой якасці, як калектывізм, уплываюць асаблівасці нацыянальнай культуры. Калектывісцкая культура ў цэлым тыповая для Кітая і Японіі.

*Індывідуалізм* характарызуецца сцвярджэннем, што жыццё асобнага чалавека каштоўнейшае за жыццё вялікіх калектываў. Краіны, у чыіх культурах пераважае індывідуалізм, — гэта Вялікабрытанія і ЗША.

У калектывісцкіх культурах бацькі і школа літаральна ад нараджэння імкнуцца выхоўваць у дзяцей каштоўнасці калектывізму і ўзаемадапамогі, накіроўваць ці нават прадвызначаць іх жыццё: выбраць універсітэт, сям'ю, прафесію і г. д.; у індывідуалісцкіх — наадварот, выхоўваюць у дзецях незалежнасць і самастойнасць.

Кожная культурная традыцыя мае пэўныя перавагі і разам з тым патрабуе «плату» за іх. У канкурэнтным, індывідуалістычным грамадстве людзі маюць больш асабістай свабоды, больш ганарацца сваімі асабістымі дасягненнямі і меней звязаны са спадзяваннямі навакольных, іх паводзіны больш спантанныя, раскаваныя. Але ў якасці расплаты за гэта — болей выпадкаў адзіноты, разводаў, забойстваў і стрэсавых расстройстваў. Можна сказаць, што ў калектывісцкіх культурах замест незалежнасці асоба набывае ўзаемазалежнасць і ўзаемасувязь. У той жа час унутры кожнай культуры паміж яе прадстаўнікамі магчымы значныя індывідуальныя адрозненні.

У найбольшай ступені спрыяе фарміраванню калектывізму як уласцівасці асобы прыналежнасць чалавека да згуртаваных груп з трывалымі традыцыямі. Аднак нельга блытаць сапраўдны калектывізм з выяўленнем групавога эгаізму. Сапраўдны калектывізм праяўляецца ў сітуацыі, калі чалавек, баронячы найвышэйшыя інтарэсы групы, можа супрацьстаяць нават ціску яе самой. Таму што яе члены па тых ці іншых прычынах могуць памыляцца ў ацэнцы значных падзей, дзейнічаць няправільна.

Ад *калектывісцкіх паводзін* варта адрозніваць некрытычныя групавыя паводзіны і мысленне. Яны заключаюцца

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ў тым, што члены групы, каб захаваць добрыя ўзаемаадносіны і пазбегнуць рознагалосся, адмаўляюцца ад аб'ектыўнага і ўсебаковага разгляду пытання і без абмеркавання прымаюць прапанаваны, найчасцей лідэрам групы, варыянт вырашэння праблемы, якую-небудзь ідэю ці план. Гэтаму спрыяюць сяброўская згуртаванасць групы, параўнальная ізаляцыя ад процілеглых меркаванняў і аўтарытарнасць яе лідэра. Узнікае ілюзія аднадумнасці, у якой няма нічога агульнага з каштоўнаснай еднасцю калектыву. Нельга забываць, што «ісціна нараджаецца ў спрэчцы сяброў».

**Канфармізм і нонканфармізм.**

*Канфармізмам* называецца змяненне паводзін людзей у выніку рэальнага ці ўяўнага ціску групы.

Лепш за ўсё пра канфармізм расказаў Х. К. Андэрсен (1805—1875) у казцы «Новае адзенне караля».

Звярніце ўвагу: канфармізм заключаецца не проста ў тым, што нехта дзейнічае таксама, як усе, але ў тым, што ён паддаецца ўплыву ўсеагульнага дзеяння і паводзіць сябе не так, як бы рабіў сам-насам. Канфармізм можа праяўляцца ў дзвюх формах: падатлівасць (паводзім сябе так, як прынята, аднак унутрана не згаджаемся з тым, што робім) і ўхваленне (верым у правільнасць таго, што вымушае нас рабіць група).

Шматлікія псіхалагічныя эксперыменты раскрываюць дзве асноўныя прычыны канфармізму. Па-першае, гэта імкненне быць прынятым групай, атрымаць яе ўхваленне. Па-другое, гэта жаданне выглядаць пераканаўча, быццам выконваюцца правільныя дзеянні, калі чалавек адчувае сябе недастаткова ўпэўнена пры вырашэнні цяжкай задачы і яму прасцей рабіць «як усе».

Канфармізм — шырока распаўсюджаная з'ява. У той жа час індывідуальныя асаблівасці людзей дапускаюць розную ступень незалежнасці іх паводзін. Так, у адным псіхілагічным эксперыменце студэнты, пачуўшы, што навакольныя выказваюць меркаванні, тоесныя з іх уласнымі, тут жа змянялі сваю пазіцыю толькі для таго, каб умацаваць

Адукацыя і выхаванне
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

адчуванне асабістай непаўторнасці, г. зн. праяўлялі *нонканфармізм*.

Звычайна нам не падабаецца занадта адрозніванца ад групы, але мы не хочам і выглядаць дакладна як усе. Таму нашы паводзіны ў значнай ступені абароненыя ад грамадскага ўплыву пачуццём уласнай індывідуальнасці і непаўторнасці. У групе мы лепш за ўсё ўсведамляем, чым адрозніваемся ад іншых.

Станоўчай, плённай заменай канфармізму з'яўляецца калектывізм, калі згода з пазіцыяй групы ўзнікае ў выніку ўсвядомленага супадзення імкненняў асобы з мэтамі калектыву. Часам да такой згоды чалавек прыходзіць праз унутраную барацьбу, у якой перамагае разуменне важнасці агульнай задачы.

### Некаторыя высновы

1. Альтруізм — форма грамадскіх паводзін і рыса асобы, якая праяўляецца ў гатоўнасці добраахвотна дапамагаць іншым, нават нягледзячы на магчымыя непрыемнасці для сябе. Альтруізм супрацьлеглы эгаізму — засяроджанасці на сваім Я, на ўласных інтарэсах. 2. Калектывізм — усвядомленае служэнне калектыўным інтарэсам як асаблівая якасць і форма паводзін. Калектывізм супрацьлеглы індывідуалізму, які сцвярджае, што асабістыя інтарэсы важнейшыя за інтарэсы любой супольнасці людзей. 3. Канфармізм — разнавіднасць грамадскіх паводзін, якая характарызуецца імкненнем адпавядаць меркаванню большасці. 4. Асаблівасці культуры, у якой выхоўвалася асоба, шмат у чым вызначаюць яе сацыяльную арыентацыю.

### ?! *Пытанні і заданні*

1. Як можна, на ваш погляд, растлумачыць паходжанне альтруізму і эгаізму?
2. Якія ўмовы і асобасныя характарыстыкі спрыяюць праяўленню ў чалавека альтруізму?

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

3. Ці згодныя вы з меркаваннем вядомага рэжысёра К. С. Станіслаўскага: «Думайце больш пра іншых і меней пра сябе, клапаціцеся пра агульны настрой і агульную справу, тады і вам будзе добра»?
4. Што такое калектывізм і індывідуалізм? Як уплываюць асаблівасці выхавання на фарміраванне гэтых якасцей асобы?
5. Ці заўсёды прыняцце погляду групы з'яўляецца праявай калектывізму? Абгрунтуйце свой адказ.
6. Як вы лічыце, калі мы трымаемся моды, то гэта праява канфармізму ці нонканфармізму? Абгрунтуйце сваю пазіцыю.
7. Як вы думаеце, у якіх сітуацыях і пры якіх умовах канфармізм можа разглядацца як сацыяльна пажаданая з'ява?
8. Чым калектывізм адрозніваецца ад канфармізму?

## § 18. Канфліктныя і бесканфліктныя паводзіны

**Тыпы канфліктаў.** Адносіны паміж людзьмі не заўсёды складваюцца беспраблемна. Сапраўды, ці могуць людзі з разнастайнымі рысамі характару, поглядамі і каштоўнасцямі ва ўсім ладзіць адно з адным?

Невысокая культура адносін — гэта адна з прычын узнікнення канфліктаў.

*Канфлікт* (лац. conflictus — сутыкненне) — гэта сутыкненне людзей, якія маюць узаемавыключальныя мэты і рэалізуюць іх на шкоду іншым.

Значыць, у аснове канфлікту ляжыць сітуацыя, у якой сутыкаюцца супрацьлеглыя мэты, інтарэсы, пазіцыі, меркаванні, погляды партнёраў па зносінах. Часта ў сітуацыі канфлікту людзі няправільна ўспрымаюць свае і чужыя дзеянні і намеры. Да тыповых скажэнняў успрымання канфлікту адносяцца наступныя:

- «ілюзія ўласнай высакароднасці», калі здаецца, што ісціна і справядлівасць цалкам на вашым баку;
- «пошук саломінкі ў воку іншага», калі заўважаюць недахопы перш за ўсё ў апанента, але не ў сябе;

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

• «падвойная этыка», калі аднолькавыя ўчынкі свае і апанента ацэньваюцца па-рознаму;

• пазіцыя «ўсё зразумела»: празмернае спрашчэнне сітуацыі канфлікту і адназначная ацэнка намераў апанента як варожых.

У структуры канфлікту можна вылучыць яго ўдзельнікаў, прычыну, канкрэтную падставу і наяўную канфліктную сітуацыю.




*Схема 4.* Структура канфлікту

Канфліктная сітуацыя можа існаваць задоўга да ўзнікнення канфлікту, да пары да часу не праяўляючыся заўважна. Напрыклад, у пакоі, дзе жывуць паэт, музыкант і футбаліст, ёсць толькі адзін тэлевізар. Канфлікт можа ўзнікнуць тады, калі ўсе ўтраіх адначасова выказжуць жаданне паглядзець свае любімыя перадачы (адзін — вечар паэзіі, другі — канцэрт, трэці — футбол) і паспрабуюць захапіць тэлевізійны пульт. Такія дзеянні, якія вядуць да канфлікту, называюць інцыдэнтам.

У залежнасці ад колькасці ўдзельнікаў канфлікт можа быць *міжасабовым*, *асабова-групавым* і *міжгрупавым*. Міжасабовы канфлікт — самы распаўсюджаны. У ім некалькі ўдзельнікаў. Напрыклад, два школьнікі не могуць дамовіцца пра ўдзел у «Спартландыі». Калі кагосьці з іх падтрымлівае ўвесь клас, то гэта ўжо асабова-групавы канфлікт. Канфлікт паміж асобай і групай можа ўзнікнуць у тым выпадку, калі нехта зойме пазіцыю, супрацьлеглую пазіцыі групы. Нярэдка чалавек, меркаванне якога адрозніваецца ад меркавання групы, прымае інтарэсы калектыву блізка да сэрца. Тым не менш яго ўсё роўна

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

можна разглядаць як крыніцу канфлікту, калі ён ідзе супраць меркавання групы.

У міжгрупавым канфлікце сутыкаюцца інтарэсы розных груп адной арганізацыі. Напрыклад, канфлікт паміж камандамі розных класаў з-за падвядзення вынікаў спартыўнага спаборніцтва.

Здараецца і ўнутрыасабовы канфлікт, ці канфлікт чалавека з самім сабой. Ён можа ўзнікнуць пры нізкай задаволенасці чалавека сваёй працай, недастатковай упэўненасці ў сабе, няўзгодненасці розных сацыяльных роляў; часта бывае звязаны са стрэсам. У такім выпадку чалавек павінен, прааналізаваўшы сітуацыю, нанова абдумаць, што для яго з'яўляецца прыярытэтным, і пастарацца ў далейшым кантраляваць свае дзеянні.

Адрозніваюць канструктыўныя і неканструктыўныя канфлікты. *Канструктыўным канфлікт* бывае тады, калі апаненты не выходзяць за рамкі этычных нормаў,



Адрыян ван Астадэ. *Бойка* (1637)

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

дзелавых адносін, разумных аргументаў і імкнуцца знайсці прымальнае вырашэнне праблемы. *Неканструктыўны канфлікт* узнікае ў двух выпадках: па-першае, калі адзін з бакоў упарта і жорстка настойвае на сваёй пазіцыі і не жадае ўлічваць інтарэсы іншага боку і, па-другое, калі адзін з апанентаў ужывае маральна асуджаныя метады барацьбы, імкнецца псіхічна прыгнесці партнёра, дыскрыдытуючы і зневажаючы яго.

**Лініі паводзін у канфліктных сітуацыях.** Пасля таго як канфлікт асэнсаваны, яго ўдзельнікі могуць выбраць розныя стратэгіі (лініі паводзін) у канфліктнай сітуацыі.

Стратэгія *супрацоўніцтва* прадугледжвае адкрыты абмен думкамі і пошук рашэння, якое задаволіла б інтарэсы ўсіх удзельнікаў канфлікту. Такі спосаб патрабуе часу і ўвагі да партнёра. Разам з тым гэта адзіны шлях, які можа прывесці да справядлівага і канчатковага ўрэгулявання канфлікту.

*Кампраміс* дасягаецца ўрэгуляваннем рознагалоссяў праз узаемныя саступкі. Перавага такіх паводзін — у хуткай ліквідацыі канфлікту. Аднак кампраміснае рашэнне не заўсёды самае справядлівае, а таму ва ўдзельнікаў канфлікту захоўваецца эмацыянальная незадаволенасць.

Дзеянні ў стратэгіі *ўхілення* накіраваны на тое, каб выйсці з сітуацыі не саступаючы апаненту, але і не настойваючы на сваім, устрымліваючыся ад спрэчкі і дыскусіі. У адказ на абвінавачванні праяўляецца імкненне перавесці размову на іншую тэму. Выкарыстоўваючы гэты спосаб паводзін, мы перш за ўсё хочам захаваць добрыя ўзаемаадносіны. Канфлікт пры гэтым не вырашаецца.

*Прыстасаванне* таксама выяўляецца ў імкненні ўнікнуць канфлікту шляхам уступак. Чалавек у гэтым выпадку згладжвае супярэчнасці, ахвяруючы сваімі інтарэсамі на карысць іншага.

У стратэгіі *канкурэнцыі* (праціборства) дзеянні скіраваны на тое, каб дамагчыся свайго ў адкрытай барацьбе

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

за свае інтарэсы. Гэты стыль паводзін мэтазгодны ў экстрэмальных сітуацыях.

**Шляхі ўрэгулявання канфліктаў.** Часам удзельнікі канфлікту самастойна спрабуюць урэгуляваць яго. Яны могуць таксама звярнуцца па дапамогу да пабочнага чалавека — пасрэдніка, які здольны арганізаваць дыялог паміж імі.

Часта канфлікты паміж людзьмі ўскладняюцца з-за нявыказаных думак і пачуццяў. Адкрыты выклад свайго разумення сітуацыі дапамагае праясніць сутнасць канфлікту. Пры гэтым рэкамендуецца выкарыстоўваць такія выказванні, як «я пакрыўдзіўся», «я раззлаваўся» і г. д.

Крытыкаваць трэба праблему, а не асобу. Напрыклад, выказванне «Вы наўмысна ставіце гучную музыку, каб раздражняць мяне» можна замяніць такім: «Калі я чую гучную музыку ў вас, мне цяжка засяродзіцца, бо гэта выклікае ў мяне раздражненне». Важна таксама даведацца пра тое, што думае і адчувае іншы чалавек. Паспрабуйце стаць на яго пазіцыю, глянуць на сітуацыю яго вачамі.

Пры абмеркаванні канфлікту належыць пазбягаць пагроз і хлусні. Абавязковая ўмова — максімальна спакойны тон выказванняў, дакладнасць і прадуманасць фраз. Да чалавека, які ўступіў з вамі ў канфлікт, трэба праяўляць максімальную добразычлівасць. Неабходна паказваць гатоўнасць вырашаць праблемы, не пускаючы іх на самацёк.

Адной з самых важных умоў выхаду з канфліктных сітуацый з'яўляецца ўменне спрачацца.

**Асобныя правілы спрэчкі:**

1. Спрэчка можа праводзіцца толькі пасля папярэдняй згоды абодвух бакоў абмеркаваць наяўнае становішча. Адносіны трэба высвятляць як мага хутчэй пасля ўзнікнення канфліктнай сітуацыі («тут і цяпер»).

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

2. Той, хто пачынае спрэчку, павінен загадзя ясна ўяўляць тую мэту, якой ён хоча дасягнуць.

3. Размова павінна ісці аб праблеме, актуальнай для абодвух удзельнікаў.

4. Кожны ўдзельнік спрэчкі павінен гаварыць пра сябе без «шуму», з добрай «зваротнай сувяззю» (не толькі казаць самому, але і слухаць суразмоўцаў).

5. Аргументы павінны быць дзелавымі, удзельнікі спрэчкі павінны выконваць правілы сумленнай гульні. Парушэнне гэтых правіл — выкарыстанне аргументаў, якія не адносяцца да справы ці маюць на мэце зняважыць праціўніка, ужыванне абагульненняў тыпу «ніколі», «заўсёды», «усе яны такія». Але трэба памятаць, што універсальных і цудадзейных спосабаў урэгулявання канфліктаў не існуе.

Вельмі важнай з'яўляецца гатоўнасць асобы да пошуку эфектыўных шляхоў пераадолення сітуацыі. Належыць выпрацоўваць у сабе якасці, неабходныя для бесканфліктных зносін і канструктыўнага ўрэгулявання канфліктаў. Да іх адносяць эмпатыю, добразычлівасць, уменне быць нязмушаным у стасунках, не хавацца за маскамі і ролямі. Для ўнікнення канфліктаў важныя:

- канкрэтнасць (адмова ад шматзначных і няясных заўваг, агульных развaг, гатоўнасць адназначна адказаць на пытанні);
- ініцыятыўнасць (здольнасць наладжваць кантакты, схільнасць да таго, каб у адносінах з іншымі «ісці наперад», а не толькі рэагаваць на іх дзеянні);
- непасрэднасць (уменне гаварыць і дзейнічаць без хітрыкаў, шчырая дэманстрацыя свайго стаўлення да сітуацыі);
- адкрытасць (гатоўнасць і ўменне гаварыць пра свае думкі і пачуцці).

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Некаторыя высновы

1. У канфлікце сутыкаюцца супрацьлеглыя мэты, інтарэсы, пазіцыі, меркаванні, погляды партнёраў па зносінах. 2. Правільнае разуменне канфлікту важнае для выбару адэкватнай лініі паводзін у канфлікце і пошуку шляхоў яго ўрэгулявання. 3. Для ўрэгулявання канфлікту яго ўдзельніку важна выбраць эфектыўную стратэгію, прымальны стыль паводзін. Вылучаюць такія лініі паводзін у канфлікце, як ухіленне, прыстасаванне, канкурэнцыя, кампраміс, супрацоўніцтва. 4. Важнай умовай паспяховага пераадолення канфліктных сітуацый з'яўляецца ўменне спрачацца.

?! ***Пытанні і заданні***

1. Што такое канфлікт, якая яго структура?
2. Па якіх крытэрыях класіфікуюць канфлікты? Складзіце схему тыпаў канфліктаў, вылучаных па розных прыкметах.
3. Згадайце які-небудзь канфлікт, у якім вы ўдзельнічалі, і апішыце яго. Які спосаб паводзін вы тады выбралі?
4. Параўнайце такія стылі паводзін у канфліктнай сітуацыі, як сурацоўніцтва, ухіленне, прыстасаванне, кампраміс, канкурэнцыя. Прывядзіце прыклады.
5. Што перашкаджае і што дапамагае адэкватнаму ўспрыманню канфлікту?
6. Якія прыёмы спрыяюць адкрытым і эфектыўным зносінам удзельнікаў пры ўрэгуляванні канфлікту?
7. Якія ўласцівасці асобы дапамагаюць бесканфліктным паводзінам і канструктыўнаму ўрэгуляванню канфліктаў? Якія з гэтых якасцей, на ваш погляд, уласцівыя вам?

## § 19. Культура зносін

**Этыкет.** Каб свабодна і нязмушана сустракацца і размаўляць з людзьмі ў самых розных сітуацыях, неабходна авалодаць пэўнымі нормамі паводзін і асаблівай сістэмай знакаў. Так, пры сустрэчы мы можам кіўнуць, нізка пакланіцца, паляпаць па плячы, абняцца і г. д.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Гэтым мы выяўляем сваё стаўленне да людзей, з якімі сустрэліся.

*Этыкет* (ад франц. étiquette — ярлык; абыходжанне, пачцівасць) — гэта сукупнасць правіл знешняга праяўлення стаўлення да людзей. Ён уключае правілы паводзін у грамадскіх месцах, формы звароту і вітанняў, манеры і пэўную форму адзення.

Згадкі пра этыкет сустракаюцца ўжо ў літаратурных тэкстах Старажытнага Шумера. Адзін з першых трактатаў пра паводзіны быў выдадзены ў Сярэдневякоўі, у 1204 годзе, іспанскім святаром Пэдрам Альфонсам. Ён называўся «Дысцыпліна клерыкаліс». На яго падставе былі складзены многія іншыя кнігі па этыкеце. Рускі імператар Пётр Першы таксама загадаў стварыць кнігу пра этыкет, «Юнацтва добрае люстэрка, або Сведчанні для жыццёвага абыходжання».



Жак Луі Давід. *Пасвячэнне імператара Напалеона I і каранаванне імператрыцы Жазафіны ў саборы Парыжскай Маці Божай 2 снежня 1804 года* (1806—1807)

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Этыкет падпарадкаваны сістэме каштоўнасцей, якая склалася ў народа. Парушэнне этыкету магло прывесці да варожасці і нават войнаў паміж плямёнамі і народамі.

Этыкетныя знакі заўсёды ўмоўныя. Адна і тая ж інфармацыя можа перадавацца ў розных народаў па-рознаму. Напрыклад, у старажытнасці ў некаторых народаў чалавеку, які прынёс дрэнную вестку, адсякалі галаву: паступіць па-іншаму было б няправільна. У Старажытным Егіпце, Кітаі, Залатой Ардзе ад ведання этыкету, выканання яго правіл таксама нярэдка залежала не толькі кар'ера, але і жыццё чалавека.

Многія правілы этыкету, выпрацаваныя чалавецтвам у даўнія часы, адлюстраваны ў выразах «укленчыць (стаць на калені)», «паклаўшы руку на сэрца», «біць паклоны», «кідаць пальчатку», «паварочвацца спінай» і г. д.

У этыкетных мэтах выкарыстоўваюцца розныя прадметы, напрыклад, прыўзняты капялюш, падораныя кветкі і інш. Пры гэтым словы і дзеянні чалавека не павінны супярэчыць яго адзенню. Этыкет не будзе захаваны, калі маладыя людзі прыйдуць у тэатр у джынсах і стракатых майках. Далікатнае абыходжанне з жанчынай, пачцівае стаўленне да старэйшых, уменне весці размову і прымаць гасцей — усё гэта стварае агульнае ўражанне пра годнасць асобы. Такім чынам, этыкет складае частку культуры кожнага чалавека паасобку і грамадства ў цэлым.

Разам з агульнымі існуюць спецыфічныя правілы паводзін і зносін у розных сітуацыях. Так, акрамя паўсядзённага этыкету, ёсць дзелавы, службовы этыкет. У розных калектывах могуць складвацца свае эталоны паводзін і спосабы вядзення спраў, якія вызначаюць карпаратыўную культуру і стыль арганізацыі. Галоўнае ў гэтых правілах — павага да асобы дзелавога партнёра. Службовы этыкет ахоплівае правілы зносін паміж членамі калектыву, уключаючы і правілы ўзаемаадносін паміж кіраўніком і падначаленым. Чалавеку, які прыйшоў у новы калектыў, належыць быць уважлівым да нормаў і традыцый, якія тут склаліся.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Той, хто хоча наладзіць пасняховыя зносіны, павінен навучыцца быць ветлівым, тактоўным, неназойлівым. Важна ўважліва выслухоўваць суразмоўцу, не перабіваць у гутарцы і, перш чым выказаць сваё меркаванне, даведацца ў яго, ці ўсё ён сказаў, ці гатовы выслухаць вас. Належыць, дзе гэта дарэчы, выкарыстоўваць рэплікі тыпу «калі я вас правільна зразумеў...», «калі вы лічыце, што...», «вы думаеце, што...», «дазвольце, я падагульню...» і да т. п.

Можна знайсці і іншыя словы, каб выказаць сваё стаўленне. Важна памятаць, што сутнасць этыкету вызначаецца ўнутранай гатоўнасцю аднаго чалавека дапамагчы іншаму тактоўна і далікатна.

Узаемаадносіны паміж людзьмі тым багацейшыя, разнастайнейшыя, чым танчэйшая і паўнейшая засвоеная імі культура зносін. Выкананне правіл этыкету дазваляе нам адчуваць сябе ўпэўнена і свабодна, мець інтарэс да працэсу зносін і задавальненне ад іх. Хто валодае культурай паводзін, той праяўляе яе паўсюль — на працы, у сям'і, на адпачынку, у грамадскіх месцах і г. д.

**Рытуалы і звычаі.** З дзяцінства кожны з нас паступова засвойвае стэрэатыпы паводзін, выхоўвае ў сабе карысныя звычкі, добрыя манеры, уменне правільна паводзіць сябе з бацькамі, равеснікамі і старэйшымі. У наш час чалавек чакае, што іншыя не толькі будуць судзіць яго дзейнасць, але і паспагадаюць, дапамогуць яму.

Кожнаму з нас прыемна мець справу з людзьмі, якія ўмеюць правільна сябе паводзіць у самых розных абставінах. У аснове правільных паводзін ляжаць прынятыя ў грамадстве ўзоры. Найперш да іх адносяцца рытуалы і звычаі.

*Рытуал* (ад лац. ritus — святы абрад) — форма паводзін людзей, якая склалася гістарычна, парадкуе іх паводзіны і мае сімвалічны характар.

Кожнае сваё дзеянне, кожны зварот да каго-небудзь мы нярэдка суправаджаем дарэчнымі ў гэтым выпадку рытуаламі, а таксама «чароўнымі словамі»: «калі ласка», «дзякую вам» і інш.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Яшчэ адной формай рэгуляцыі паводзін з'яўляюцца звычаі, якія вызначаюць традыцыйна сфарміраваны лад паводзін. Звычай — гэта шырока распаўсюджаная форма дзеянняў, якая паўтараецца ў пэўных абставінах. Звычаі не змяняюцца на працягу стагоддзяў і забяспечваюць культурную і сацыяльную стабільнасць грамадства.

Звычаі адпавядаюць ладу жыцця грамадства і ў розных культурах набываюць розны змест і сэнс. Разам з тым звычаі розных народаў дэманструюць нямала падобнага. Прыкладамі могуць быць звычаі падкрэсліваць павагу да старэйшых, строга выконваць законы гасціннасці, быць стрыманым у зносінах.

**Беларускія нацыянальныя традыцыі зносін.** Рытуалы і звычаі, з'яўляючыся няпісанымі правіламі, вызначаюць паводзіны ў грамадстве, забяспечваюць перадачу вопыту, спрыяюць засваенню культурных і маральных каштоўнасцей. *Рытуалы* — гэта адна з разнавіднасцей звычаяў. Некаторыя звычаі, якім людзі надаюць асаблівае значэнне, імкнучыся захаваць атрыманы ў спадчыну лад жыцця, называюцца *традыцыямі*. На Беларусі захоўваецца мноства старажытных, паганскіх па паходжанні, звычаяў



М. М. Філіповіч. *Ноч на Купалле* (1925)

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

і адпаведных ім рытуалаў. Іх сляды мы знаходзім у святах «Масленіца», «Купалле», «Дажынкі», «Каляды» і інш.

Самабытнасць беларускага народа — вынік многавяковага развіцця. Пасля кожнага са шматлікіх нашэсцяў заваёўнікаў беларусы пачыналі будаваць жыццё амаль нанова — падымаючы з попелу гарады і вёскі, адраджаючы сваю культуру. Па гэтай прычыне ўпартасць з'яўляецца адной з найбольш характэрных рыс беларусаў. Беларусам уласцівы надзейнасць, працавітасць, сціпласць, сумленнасць, павага да людзей, вернасць у сяброўстве. У шматнацыянальных калектывах беларусы, як правіла, нясхільныя ўтвараць зямляцкія і нацыянальныя мікрагрупы, таму што цэняць у чалавеку перш за ўсё яго асабістыя якасці, а фактар этнічнай прыналежнасці для іх невырашальны. Канфліктныя сітуацыі з удзелам беларусаў узнікаюць даволі рэдка, бо яны звычайна нязлосна ставяцца да жартаў таварышаў, не рэагуюць на кепікі. Разам з тым беларусы — горды народ. Іх гордасць праяўляецца ў стаўленні да службовых абавязкаў, справы, таварышаў. Менавіта пачуццё нацыянальнай гордасці не дазваляе ім абмінуць несправядлівасць, знявагу іншага чалавека.

Шматвяковая агульнасць адбілася на характары чалавечых узаемаадносін. На Беларусі рэдка ўбачыш шумныя сваркі на людзях. Вельмі шануецца ўзаемадапамога. Нават у дзелавы этыкет увайшлі традыцыі даверу. Мноства рашэнняў прымаецца на сямейнай ці сяброўскай нарадзе. Святы часта праводзяць усёй сям'ёй.

Давайце ўспомнім асноўныя правілы міжкультурных зносін, выпрацаваныя беларускім народам:

- паважаючы і шануючы беларускую нацыянальную культуру, ясна ўсведамляць, што прадстаўнік ніякай культуры не вызначае сусветных стандартаў;
- ставіцца да культуры іншых з той жа павагай, з якой ставішся да сваёй;
- разумець, што ў кожнай культуры, якой бы малой яна ні была, ёсць што прапанаваць свету, але няма такіх культур, якія б мелі манаполію на ўсеахопнае лідэрства.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Некаторыя высновы

1. Этыкет — сукупнасць правіл паводзін, з дапамогай якіх грамадства рэгулюе дзеянні чалавека і дае агульнае ўяўленне пра яго годнасць. Этыкет — частка культуры кожнага чалавека паасобку і грамадства ў цэлым. 2. Важнымі спосабамі сацыяльнага рэгулявання з'яўляюцца рытуалы і звычаі — традыцыйныя ўстойлівыя формы паводзін. 3. Нацыянальныя асаблівасці зносін беларускага народа адлюстроўваюць яго самабытнасць і своеасаблівасць гістарычнага шляху. 4. Трэба ўлічваць традыцыйную аснову паводзін і зносін розных народаў ды з павагай ставіцца да іх.

### ?! *Пытанні і заданні*

1. Якую ролю ў міжасабовых зносінах адыгрывае этыкет?
2. У чым выяўляецца канкрэтна-гістарычны характар этыкету?
3. Якія, на ваш погляд, сацыяльна-культурныя функцыі рытуалаў?
4. Выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, падрыхтуйце паведамленне пра этыкет тэлефоннай размовы, дзелавога пісьма і электронных зносін.
5. Якія рытуалы і звычаі беларускага народа вам вядомыя?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Практыкум

1. Пазнаёміўшыся з урыўкам з кнігі савецкага пісьменніка і публіцыста І. Р. Эрэнбурга (1891—1967) «Людзі, гады, жыццё», пакажыце на прыкладах умоўны і канкрэтна-гістарычны характар этыкетных знакаў.

«Еўрапейцы, вітаючыся, працягваюць руку, а кітаец, японец або індыец вымушаны паціснуць канечнасць чужога чалавека. Калі б прыезджы соваў парыжанам або масквічам босую нагу, наўрад ці гэта б выклікала захапленне. Жыхар Вены кажа «цалую руку», не задумваючыся над сэнсам сваіх слоў, а жыхар Варшавы, калі яго знаёмяць з дамай, машынальна цалуе ёй руку. Англічанін, абураны выхадкамі свайго канкурэнта, піша яму: «Дарагі сэр, вы махляр!» Без «дарагога сэра» ён не можа пачаць ліст. Хрысціяне, уваходзячы ў царкву, касцёл або кірху, здымаюць галаўныя ўборы, а яўрэй, уваходзячы ў сінагогу, пакрывае галаву. У каталіцкіх краінах жанчыны не павінны ўваходзіць у храм з непакрытай галавой.

У Еўропе колер жалобы — чорны, у Кітаі — белы. Калі кітаец упершыню бачыць, як еўрапеец або амерыканец ідзе пад руку з жанчынай, часам нават яе цалуе, гэта здаецца яму надзвычай бессаромным. У Японіі нельга ўвайсці ў хату не зняўшы абутку, у рэстаранах на падлозе сядзяць мужчыны ў еўрапейскіх гарнітурах і шкарпэтках. У гасцініцы мэбля была еўрапейская, але ўваход у пакой традыцыйна кітайскі — шырма не дазваляла ўвайсці прама, гэта звязана з паданнем пра тое, што чорт ідзе напрасткі; а па нашых паданнях, чорт хітры і яму нічога не каштуе абысці любую перагародку. Калі да еўрапейца прыходзіць госць і захапляецца карцінай на сцяне, вазай або іншай цацкай, то гаспадар задаволены. Калі еўрапеец пачынае захапляцца штучкай у хаце кітайца, гаспадар яму дорыць гэты прадмет — таго патрабуе ветлівасць. Маці мяне вучыла, што ў гасцях нічога нельга пакідаць на талерцы. У Кітаі да кубка сухога рысу, які падаюць у канцы абеду, ніхто не дакранаецца: трэба паказаць, што ты сыты. Свет шматстайны, і не варта ламаць галаву над тым або іншым звычаем: калі ёсць чужыя кляштары, то, значыць, ёсць і чужыя статуты».

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

2. А. П. Чэхаў (1860—1904) у лісце брату сфармуляваў своеасаблівы кодэкс чалавечай выхаванасці. Пазнаёмцеся з ім і выкажыце сваё стаўленне да гэтых палажэнняў.

«Выхаваныя людзі, на маю думку, павінны задавальняць наступным умовам:

1) Яны паважаюць чалавечую асобу, а таму заўсёды паблажлівыя, мяккія, ветлівыя, падатлівыя… Яны не бунтуюць з-за малатка або зніклай гумкі; жывучы з кім-небудзь, яны не робяць з гэтага ласкі, а сыходзячы, не кажуць: з вамі жыць нельга! Яны прабачаюць і шум, і холад, і перасмажанае мяса, і кепікі, і прысутнасць у іх жыллі чужых…

2) Яны спачуваюць не адным толькі жабракам і кошкам. Яны хварэюць душой і ад таго, чаго не ўбачыш простым вокам…

3) Яны чыстасардэчныя і баяцца хлусні, як агню. Не маняць яны нават у дробязях. Хлусня абразлівая для слухача і апашляе яго ў вачах моўцы. Яны не рызыкуюць, трымаюць сябе на вуліцы гэтак жа, як у хаце, не пускаюць пыл у вочы меншай браціі… Яны не балбатлівыя і не лезуць са споведзямі, калі іх не пытаюць… З павагі да чужых вушэй яны часцей маўчаць.

4) Яны не зневажаюць сябе з той мэтай, каб выклікаць у іншым спагаду. Яны не граюць на струнах чужых душ, каб у адказ ім уздыхалі і няньчыліся з імі».

3. Шырока вядомы эксперымент, падчас якога ў розных групах падыспытных перад прад'яўленнем фатаграфіі адной і той жа асобы даваліся розныя ўстаноўкі, напрыклад: «гэта злачынец» або, наадварот, «гэта герой». Характарыстыкі асобы на фатаграфіі былі палярнымі ў залежнасці ад пачутага.

Эксперыментальна даказана, што ўпэўненыя ў сабе людзі часцей ацэньваюць іншых як добразычлівых і прыхільных да іх. Няўпэўненыя ж у сабе звычайна прыпісваюць іншым халоднасць у зносінах.

Пра што, на ваш погляд, кажуць гэтыя прыклады?

4. Што такое альтруізм? Якія ўласцівасці асобы характэрныя для альтруіста? Прывядзіце прыклады вядомых вам людзей-альтруістаў. Чым альтруізм адрозніваецца ад эгаізму?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

5. Венецыянскі вандроўца Марка Пола (1254—1324) апісаў этыкет званай бяседы пры двары мангольскага вялікага хана Хубілая (1215—1294).

«На бяседзе вялікі хан за сталом сядзіць вось як. Яго стол вышэйшы за іншыя сталы; садзіцца ён на паўночным баку, тварам на поўдзень; з левага боку поруч яго сядзіць старэйшая жонка, а па правай руцэ, значна ніжэй, — сыны, пляменнікі і сваякі імператарскага роду; а галовы іх аказваюцца ля ног вялікага хана; а іншыя князі садзяцца за іншыя сталы, яшчэ ніжэй. Жонкі рассаджваюцца дакладна гэтак жа. Жонкі сыноў вялікага хана, яго пляменнікаў і сваякоў — з левага боку, трохі ніжэй, а за імі, яшчэ ніжэй, садзяцца жонкі баронаў і рыцараў. Кожны ведае сваё месца, дзе ён павінен сядзець згодна з парадкам, вызначаным вялікім ханам...

Ежу і пітво вялікаму хану падаюць шматлікія князі, а раты і насы ў іх, скажу вам, прыкрыты дзівоснымі шаўковымі ды залатымі тканінамі, каб дух і пах не дакраналіся ежы і пітва вялікага хана. Калі вялікаму хану піць, інструменты граюць, а тут іх шматлікае мноства; а возьме вялікі хан чарку ў рукі, усе князі і ўсе, хто там, кленчаць і нізка кланяюцца... Кожны раз, калі вялікі хан п'е, паўтараецца тое ж самае».

Якія ўзаемаадносіны паміж людзьмі характарызуе гэты прыклад?

6. Што такое карпаратыўная культура, фірменны стыль? Ці можна школьны этыкет лічыць карпаратыўным? Растлумачце сваё меркаванне.

7. Пракаменціруйце словы з твора нямецкага гуманіста С. Бранта (1458—1521):

Ребёнок учится тому,
Что видит у себя в дому:
Родители пример ему...
Коль видят нас и слышат дети,
Мы за дела свои в ответе
И за слова: легко толкнуть
Детей на нехороший путь.
Держи в приличии свой дом,
Чтобы не каяться потом.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

8. Пра культуру зносін пісьменнік М. М. Рошчын сказаў так: «Сакрэт інтэлігентнасці просты: увага. Калі вы будзеце ўважлівыя да любога чалавека, уступаючы ва ўзаемаадносіны, — ці гэта выпадковы спадарожнік у трамваі, ці родная маці, — яна і будзе ключ паводзін. Паспрабуйце. Калі зыходзіць з таго, што любы чалавек гэтак жа складаны, цікавы, глыбокі, ранімы, як вы самі, то вы не зможаце без дай-прычыны зрабіць яму нязручнасць, непрыемнасць, а тым больш гора, жорсткую крыўду, рану. <...> Паспрабуйце не наступаць, а саступаць. Не захапіць, а аддаць. Не кулак паказаць, а працягнуць далонь. Не схаваць, а падзяліцца. Не гарлапаніць, а выслухаць, не разарваць, а склеіць».

Ці згодныя вы з аўтарам? Ці дапамогуць гэтыя навучанні пазбегнуць непатрэбных канфліктаў?

9. Падрыхтуйце паведамленне пра моду як адзін са спосабаў уплыву людзей адно на аднаго.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Урок абагульнення

1. Членамі якіх груп вы з'яўляецеся? Вызначыце асноўныя прыкметы кожнай з гэтых груп.

2. Што такое калектыў? Якія з прапанаваных груп можна назваць калектывамі: чарга ў краме; школьны клас; спартыўная каманда; рабочыя аднаго завода; суседзі. Назавіце асноўныя этапы складвання калектыву.

3. Што, на ваш погляд, азначае тэрмін «псіхалагічная сумяшчальнасць членаў калектыву»?

4. Дайце параўнальную характарыстыку такіх стыляў паводзін у канфліктнай сітуацыі, як кампраміс, канкурэнцыя, супрацоўніцтва.

5. Што такое заражэнне? Якія яго наступствы?

6. Ці згодныя вы са сцвярджэннем, што выхаванне асобы ў калектыве, поруч з дадатнымі якасцямі, абавязкова фарміруе ў яе залежнасць і канфармізм? У якіх выпадках згода чалавека з пазіцыяй групы з'яўляецца праявай канфармізму, а ў якіх — праявай калектывізму?

7. Што азначае фраза «Свой сярод чужых, чужы сярод сваіх»? Ці можна ў калектыве зведаць пачуццё адзіноты?

8. Аўстралійскія псіхолагі Х. Карнеліюс і Ш. Дэйр вызначылі канфлікт як «нераскрытую магчымасць». Як вы разумееце гэта азначэнне?

9. Паспрабуйце сфармуляваць асноўныя правілы культуры зносін, прыдатныя да сітуацый канфлікту, а таксама для недапушчэння канфлікту, для выхаду з яго.

**Некаторыя прыёмы, якія забяспечваюць уменне слухаць**

1. Не перарывайце суразмоўцу.

2. Праяўляйце сваімі жэстамі, мімікай поўную ўвагу да суразмоўцы. Па магчымасці ўвесь час добразычліва глядзіце на яго.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

3. Калі суразмоўца выказаўся, паўтарыце сваімі словамі галоўную думку, каб удакладніць, ці правільна вы яго зразумелі.

4. Пазбягайце паспешных высноў, пастарайцеся зразумець ход думак іншага чалавека да канца.

5. Старайцеся як мага спакойней рэагаваць на эмацыянальныя паводзіны суразмоўцы, імкніцеся пачуць галоўнае.

6. Не прытварайцеся, што вы ўважліва слухаеце; трэба прымусіць сябе сапраўды слухаць уважліва.

7. Не аслабляйце ўвагу.

8. Памятайце, што не ўся інфармацыя ўтрымліваецца ў словах. Шукайце сапраўдны сэнс слоў суразмоўцы з улікам невербальнай інфармацыі.

9. Не «манапалізуйце» размову.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Тэма 4. Чалавек і маральнасць

## § 20. Асноўныя паняцці маралі

**Сутнасць маралі.** Чалавек жыве сярод людзей. А гэта значыць — кіруецца пэўнымі прынцыпамі і правіламі зносін. Ён павінен суадносіць сваё Я з грамадскім Мы, мець мэты на самую блізкую будучыню і на перспектыву, выбіраць шляхі і сродкі дасягнення мэт. Гэтыя прынцыпы, нормы, ідэалы, стаўленне да дабра і зла, агульнага і прыватнага, справядлівага і несправядлівага і складаюць сутнасць маралі.

Паняцце *мараль* (ад лац. moralis — народныя звычаі, маральнасць) ахоплівае звычаі, норавы, нормы чалавечых паводзін, якія ўвасабляюць найвышэйшыя каштоўнасці чалавека як разумнай і адказнай асобы.

Не існуе ніводнага бясспрэчнага азначэння маралі.

Найчасцей пад *мараллю* разумеюць сістэму нормаў і правіл паводзін, прынятых у грамадстве і заснаваных на ўяўленнях пра дабро і зло, пра належныя і неналежныя ўчынкі.

Аднак яшчэ ў Старажытнай Грэцыі мараль разглядалася як мера панавання чалавека над самім сабой, паказчык таго, наколькі чалавек адказны за сябе, за тое, што ён робіць. Напрыклад, калі ты паабяцаў таварышу дапамагчы ў выкананні якой-небудзь працы, але сябры паклікалі цябе ў камп'ютэрны клуб, і ты пайшоў з імі, — наўрад ці такі ўчынак можна назваць зусім маральным. «Дробязь», — скажаце вы. Так, дробязь, але ж менавіта па канкрэтных учынках чалавека судзяць пра ступень яго маральнасці.

Калі пра чалавека кажуць, што ён маральны, то звычайна маюць на ўвазе, што ён прыстойны, добры і спагадлівы. Калі ж некага называюць амаральным, то ўказваюць, што ён злы, жорсткі, несумленны.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Мараль заўсёды выступае як памяркоўнасць, здольнасць да самаабмежавання. Яна супрацьлеглая распуснасці і ў чымсьці бліжэйшая да аскетычнасці, г. зн. здольнасці чалавека абмежаваць сябе, трымацца строгага ўкладу жыцця, накласці пры неабходнасці забарону на свае прыродныя жаданні. Яна супрацьстаіць пачуццёвай разбэшчанасці — ляноце, абжорству, хамству, распусце. Ва ўсе часы і ва ўсіх народаў мараль асацыіравалася са стрыманасцю. Сярод станоўчых маральных якасцей адно з першых месцаў заўсёды займалі памяркоўнасць і мужнасць. Яны сведчаць пра тое, што чалавек умее супрацьстаяць абжорству (празмернасці ў ежы) і страху — гэтым найбольш моцным інстынктыўным пазывам сваёй жывёльнай прыроды, умее кіраваць імі.

Такім чынам, мараль ёсць сфера ўчынкаў, а ўчынкі ставяць чалавека ў пэўную пазіцыю адносна іншых людзей. Значыць, мараль характарызуе здольнасць жыць у грамадстве. Калі пра некага гавораць, што ён дужы і разумны, то згадваюць уласцівасці, якія характарызуюць асобу саму па сабе; каб праявіць іх, ёй неабавязкова патрэбны іншыя людзі. Але калі пра кагосьці кажуць, што ён добры, шчодры, прыязны, то называюць уласцівасці, якія выяўляюцца толькі ў зносінах з іншымі. Рабінзон, апынуўшыся на востраве адзін, безумоўна, мог дэманстраваць і моц, і розум, але, пакуль не з'явіўся Пятніца, у яго не было магчымасці быць велікадушным і прыязным. Людзі ўступаюць у зносіны адно з адным, бо яны нешта робяць разам: выконваюць сумесную працу, гуляюць у футбол, забаўляюцца на дыскатэцы, гутараць і г. д. Зносіны ёсць натуральная і неабходная ўмова існавання людзей. Мараль тут выступае як чалавечнасць. Яна дапамагае жыць лепей, правільна сябе паводзіць, гуманна і патрабавальна ставіцца да іншых. Яна перасцерагае ад няправільных крокаў і памылак.

**Дабро і зло.** У шырокім сэнсе словы «дабро» і «зло» абазначаюць адпаведна станоўчыя і адмоўныя з'явы, учынкі, якасці. Гэта самыя агульныя паняцці, якія размяжоўваюць

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

маральнае і амаральнае. Традыцыйна *дабро* звязваюць з паняццем шчасця, да якога адносіцца ўсё, што карысна людзям. Галоўная прыкмета дабра — спрыяць праяўленню сапраўднай сутнасці чалавека — яго самараскрыццю, самарэалізацыі. Для навучэнца гэта працавітасць, уважлівасць, адказнасць, актыўнасць, творчасць.

Дабро мае свае асаблівасці. Добрыя намеры без дзеяння яшчэ не ёсць рэальнае дабро; гэта дабро патэнцыяльнае (магчымае). Як часта мы плануем здзейсніць добрыя справы, але адкладаем іх на потым! Невыпадкова кажуць, што добрыя намеры вядуць у пекла. Дабро адноснае: няма нічога такога, што ў любых абставінах было б толькі карысным. І атрута ў невялікай колькасці можа быць лекам; і фізічныя практыкаванні, калі яны празмерныя, могуць давесці чалавека да захворвання. Таму тое, што з'яўляецца дабром (карыснае) у адной сітуацыі, можа быць злом у іншай. Аднак паняцце «дабро» не ператвараецца ў паняцце «зло». Дабро — гэта заўсёды нешта станоўчае.

Пад *злом* разумеюць процілеглае дабру, тое, што разбурае шчасце: амаральнасць учынкаў і перакананняў людзей, бесчалавечнасць, увогуле тое, што заслугоўвае асуджэння. Паняцце зла ўтрымлівае агульную характарыстыку адмоўных маральных якасцей і ацэнку канкрэтных адмоўных учынкаў. Да зла адносяцца такія якасці, як зайздрасць, ганарыстасць, помслівасць, высакамернасць, ліхадзейства. Тое, што было ў нейкім сэнсе дабром, у працэсе развіцця можа паказаць супрацьлеглую якасць. Злая мачаха ў казцы «Папялушка» была добрай да сваіх дачок: патураючы іх капрызам, старалася выканаць усе жаданні, песціла і лашчыла іх. Аднак такое няправільна зразуметае дабро ператварылася ў зло: дочкі сталі неразумнымі капрызнымі пераростымі паненкамі, няўмелымі, нялюбымі і непаважанымі. Буйнамаштабныя работы ў Беларусі па асушэнні балот некалі далі магчымасць пашырыць карысныя плошчы і, значыць, спрыялі дабру — павелічэнню вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Але з часам гэта прывяло да знішчэння рэк

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

і азёр, якія вызначалі прыродныя ўмовы некаторых раёнаў нашай краіны, г. зн. асушэнне зрабіла прыродзе і людзям þдавочнае зло.

Такім чынам, дабро і зло — супрацьлегласці, якія суадносяцца адно з адным. Не разабраўшыся, што такое дабро, не зразумееш і асаблівасці зла. У залежнасці ад зместу, які мы ўкладаем у наш жыццёвы ідэал, дабро і зло трактуюцца як шчасце і няшчаце, асалода і пакута, карысць і шкода, радасць і гора. Дабро — гэта тое, што набліжае да ідэалу, а зло — тое, што аддаляе ад яго.

**Доўг.** Мы часта чуем: «Ты павінен добра вучыцца (працаваць), паважаць старэйшых, дапамагаць малодшым». Калі хваляць чалавека за годны ўчынак, кажуць, што ён выканаў свой доўг. Што ж такое доўг?

*Доўг* — гэта прынятая асобай неабходнасць падпарадкоўвацца грамадскаму правілу ці прадпісанню.

Напрыклад, доўг кожнага грамадзяніна ўдзельнічаць у выбарах, доўг кожнага юнака — служыць у радах Узброеных сіл, доўг бацькоў — клапаціцца пра сваіх дзяцей, доўг дарослых дзяцей — клапаціцца пра састарэлых ці хворых бацькоў.

Крыніцай доўгу з’яўляецца грамадскі інтарэс, які фарміруе маральны абавязак чалавека перад іншымі людзьмі і самім сабой. Нярэдка гэта выклікае ўнутранае супраціўленне індывіда, бо яго свабода абмяжоўваецца, а жыццё ператвараецца ў ланцуг абавязкаў, калі асабісты інтарэс падначалены інтарэсам іншых. Аднак калі разабрацца, то ўсё становіцца на свае месцы: мой асабісты інтарэс забяспечваецца належнымі паводзінамі іншага, а я, у сваю чаргу, павінен улічваць яго інтарэс, клапаціцца пра яго шчасце.

Простае выкананне абавязкаў яшчэ не ёсць доўг у поўным сэнсе гэтага слова. *Доўг* — маральны абавязак чалавека, які ён выконвае пад уплывам не толькі знешніх патрабаванняў, але і ўнутраных маральных матываў. У час аварыі на Чарнобыльскай АЭС у 1986 годзе многія спецыялісты не проста выконвалі патрабаванні кіраўніцтва па ліквідацыі яе вынікаў, але дзейнічалі па ўнутраных

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



М. А. Савіцкі. *Рэквіем* (1988)

маральных меркаваннях, рызыкуючы ўласным жыццём дзеля выратавання соцень тысяч людзей.

Найважнейшай уласцівасцю доўгу з'яўляецца яго *добраахвотнасць*. Людзі маральнага доўгу ініцыятыўныя, дзейныя, актыўна сцвярджаюць у жыцці дабро і не могуць абыякава абмінаць несправядлівасць. Апошнім часам у нашай краіне ствараецца шмат экалагічных атрадаў з ліку навучэнцаў і студэнтаў, якія добраахвотна парадкуюць берагі рэк, азёр, каналаў, удзельнічаюць у акцыях «Чысты горад», «Квітней, Беларусь!». Маральны доўг фарміруе ў такіх людзей актыўную грамадзянскую пазіцыю, развівае ў іх пачуццё асабістай прыналежнасці да ўсяго, што адбываецца вакол, імкненне ўнесці пасільны ўклад у агульную справу.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Сумленне як рэгулятар паводзін асобы.** Сумленне — гэта чуткі індыкатар, які вызначае адпаведнасць індывідуальных паводзін асобы найвышэйшым маральным прадпісанням.

*Сумленне* ўяўляе здольнасць чалавека крытычна ацэньваць свае ўчынкі, думкі, жаданні з пункту гледжання маральных нормаў.

Яно выконвае функцыю ўнутранага рэгулятара, якая ўласціва маралі ў цэлым, і дзейнічае ў чатырох кірунках:

1) як пабуджальнік, арыентуючы нас на выкананне маральных патрабаванняў;

2) як фактар забароны, загадзя асуджаючы нас за магчымы няправільны выбар;

3) як кантралёр, ацэньваючы нашы ўчынкі, выклікаючы задавальненне зробленым намі ці, наадварот, раскаянне;

4) сумленне можа гаварыць у нас і пад час дзеянняў, дапамагаючы карэкціраваць іх.

Слова «сумленне» паходзіць ад слова «сумненне» г. зн. «няўпэўненасць; няпэўнасць; недавер». «Мець сумленне» — значыць правяраць сябе, бездакорнасць, правільнасць сваіх учынкаў.

У размове з уласным сумленнем чалавек быццам стаіць твар у твар з самім сабой як з маральнай істотай і таму мае магчымасць (ці вымушаны) быць гранічна шчырым. Можна падмануць іншых, можна нічога не сказаць пра нешта непажаданае, асабліва калі не было сведкаў, але падмануць уласнае сумленне немагчыма: гэта «сведка, які заўсёды з табой».

Старажытнагрэчаскі філосаф Дэмакрыт, які жыў на рубяжы V і IV ст. да н. э., патрабаваў: «Не кажы і не рабі нічога кепскага, нават калі ты сам-насам. Вучыся значна больш саромецца самога сябе, чым іншых».

У той жа час сумленне як сродак самаацэнкі не абсалютнае. Яно можа быць паблажлівым. Яго нельга падмануць, але можна «ўсыпіць», «угаварыць». Існуе цэлы набор усім добра знаёмых угавораў, прызначаных для здзелкі з сумленнем: «хацеў як лепей»; «не ведаў, што так

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

здарыцца»; «усе так робяць»; «іншыя дзейнічаюць яшчэ горш» і г. д.

Ёсць людзі, якія ніколі не ідуць на кампраміс з уласным сумленнем, не адступаюць ад найвышэйшых маральных прынцыпаў. Кожны чалавек сутыкаецца з рознымі акалічнасцямі, якія ставяць нас перад выбарам. І правільны выбар павінна падказваць сумленне. Праблема ж заключаецца ў тым, каб актывізаваць яго, зрабіць найвышэйшым суддзёй усяго нашага жыцця. Згрызоты сумлення — гэта сорам за здзейсненае ці за тое, што хацеў здзейсніць. Пакуты сумлення не толькі дазваляюць ацаніць уласны ўчынак, але і дапамагаюць змяніць свае паводзіны. Падкрэсліваючы думку пра тое, што сумленне для чалавека значыць больш за славу, рускі паэт Г. Р. Дзяржавін пісаў:

Што слава? Шчасця крыніца —
З сумленнем не сварыцца.

**Некаторыя высновы**

1. Мараль — гэта сістэма нормаў і правіл паводзін, якая дапамагае чалавеку ў выбары лініі паводзін, накіроўвае яго ўчынкі і адносіны на падставе ўяўленняў пра дабро і доўг. 2. Дабро і зло — найбольш агульныя маральныя паняцці, якія размяжоўваюць маральнае і амаральнае і характарызуюць усякую чалавечую дзейнасць і адносіны. 3. Доўг — гэта маральны абавязак чалавека, што выконваецца пад уплывам не толькі знешніх патрабаванняў, але і ўнутраных маральных матываў. 4. Сумленне — гэта здольнасць да самаацэнкі; яно з'яўляецца ўнутраным рэгулятарам паводзін асобы.

?! ***Пытанні і заданні***

1. Што такое мараль? Для чаго яна неабходная?
2. У чым заключаюцца маральныя паводзіны?
3. Ці могуць, на ваш погляд, злыя ўчынкі пры пэўных умовах ператварацца ў добрыя? А наадварот: добрыя справы — у дрэнныя? Прывядзіце прыклады.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

4. Старажытная кітайская прытча расказвае пра юнака, які звярнуўся да мудраца з просьбай узяць яго да сябе вучыцца, каб накіраваць на шлях ісціны.
   — Ці ўмееш ты маніць? — спытаў мудрэц.
   — Натуральна, не! — адказаў юнак.
   — А красці?
   — А забіваць?
   — Не...
   — Тады ідзі, — усклікнуў мудрэц, — і пазнай усё гэта. А пазнаўшы, не рабі!
   Што хацеў сказаць мудрэц сваёй дзіўнай парадай?
5. Як вы разумееце свой доўг: перад грамадствам; перад калектывам; перад сям'ёй; перад самім сабой?
6. Як вы разумееце выраз «чыстае сумленне», «згрызоты сумлення»?
7. У чым, на ваш погляд, заключаецца падабенства і розніца паміж сорамам і сумленнем?

## § 21. Маральныя каштоўнасці

**Віды маральных каштоўнасцей.** Кожны з нас ацэньвае свае і чужыя ўчынкі, а таксама падзеі і з'явы жыцця ў сучаснасці і мінулым. Але тое, што важна і значна для адных, пакідае абыякавымі іншых і ўвогуле не ўспрымаецца як каштоўнасць. Што ж такое маральныя каштоўнасці?

*Каштоўнасць* — гэта значнасць, якую прадмет ці з'ява мае для нас.

Адны і тыя ж прадметы і з'явы могуць для розных людзей і ў розныя эпохі мець розную каштоўнасць. Сапраўды каштоўнымі іх робіць наша зацікаўленае да іх стаўленне.

Вядомая прытча расказвае, як работнікаў, што перавозілі ў тачках цяжкія камяні на вялікай будоўлі, спыталі, чым яны займаюцца. Адзін раздражнёна кінуў: «Не бачыш, я цягаю камяні!» Другі сказаў: «Я зарабляю на пражытак сваёй сям'і». А трэці ўсклікнуў: «Я будую храм!»

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Па «знаку» каштоўнасці падзяляюцца на станоўчыя і адмоўныя, ці антыкаштоўнасці: асалода — пакута, карысць — шкода, улада — безуладдзе, свабода — залежнасць, слава — ганьба, прыгажосць — агіднасць, бяспека — небяспека, ісціна — хлусня, дабро — зло, шчасце — няшчасце.

Адны каштоўнасці прынята адносіць да практычных (кар'ера, матэрыяльныя выгоды, навукова-тэхнічны прагрэс і г. д.), іншыя — да духоўных (музыка, жывапіс, зносіны, творчасць, веды, вера). Іх таксама прынята раздзяляць на высокія і нізкія. Безумоўна, падзел гэты даволі ўмоўны. Ён залежыць ад канкрэтных гістарычных сітуацый і часткова суб'ектыўны, бо кожны чалавек на падставе ўласных пераваг і інтарэсаў можа аб'яўляць адны каштоўнасці найвышэйшымі, а іншыя прыніжаць ці нават адмаўляць. Існуюць, аднак, усеабдымныя ідэі, якія акумулююць сутнасць маралі і складаюць аснову «правільнага жыцця»: дабро, сэнс жыцця, свабода, шчасце. Гэтыя ідэі ўтрымліваюць найвышэйшыя маральныя каштоўнасці. Ад іх правільнага разумення залежыць наша мараль: учынкі, погляды, ацэнкі, стратэгія і тактыка «правільнага жыцця».

**Сэнс жыцця.** Спакон веку перад людзьмі ўставалі пытанні «Нашто я, нашто мы?», «Для чаго я жыву, чаго хачу ад жыцця?». Чалавек шукаў, выбіраў, а розныя этычныя вучэнні прапаноўвалі свае канцэпцыі сэнсу жыцця. Можна вылучыць тры асноўныя падыходы да пытання пра сэнс жыцця:

- *песімістычны*, пры якім жыццё ўспрымаецца як бясконцая чарада пакут, зла, хвароб з заканамерным вынікам — смерцю;
- *скептычны*, для якога характэрна сумненне ў асэнсаванасці і важнасці жыцця людзей;
- *аптымістычны*, звязаны з прызнаннем сэнсу чалавечага жыцця і магчымасці яго рэалізацыі.

Разважаючы пра сэнс жыцця, мы сутыкаемся з супярэчнасцю: для чаго жыццё, калі ў канцы яго (раней ці пазней) нас чакае смерць? Таму ва ўсе часы многія людзі жадалі для сябе бяссмерця, лічылі сябе вартымі

Адукацыя і выхаванне
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

яго, шукалі магчымасці для яго дасягнення. Аднак калі дапусціць магчымасць бяссмерця, ці з’явіцца сэнс у гэтым вечным жыцці? Калі любыя магчымасці могуць быць рэалізаваны калі-небудзь у няпэўнай будучыні, то навошта прыкладаць намаганні ў рэальных умовах сёння?

Бяссмертнае жыццё не мае ні мэты, ні сэнсу. Менавіта смяротнасць чалавека і перспектыва заканчэння жыцця прымушаюць кожнага з нас старацца зрабіць сваё жыццё асэнсаваным, а таксама здзейсніць усё магчымае для таго, каб пакінуць пасля сябе добрую памяць. Імкненне знайсці сэнс жыцця само па сабе мае высокую каштоўнасць. Калі ў дзейнасці чалавека ёсць сэнс, ён звычайна не задумваецца над ім, а проста жыве, працуе, робіць тое, што лічыць патрэбным і важным.

Сэнс жыцця звязаны са значнымі мэтамі і каштоўнасцямі, да якіх мы імкнёмся. Аднак бываюць сітуацыі, калі чалавек страчвае ранейшыя каштоўнасці і звязанае з імі яснае разуменне мэты. Гэта здараецца з-за крутога і неспрыяльнага змянення лёсу, страты блізкіх, у час бязлітасных ваенных дзеянняў і г. д. У такіх сітуацыях чалавек бывае падарваны фізічна і маральна, і толькі пошук і знаходжанне новага сэнсу дапамагаюць яму выжыць. У апавяданні М. А. Шолахава «Лёс чалавека» апісаны менавіта такі выпадак: у час вайны ў салдата гіне сям’я, ён трапляе ў палон, а пасля заканчэння вайны адчувае сябе прыгнечаным, разгубленым і непатрэбным. І толькі сустрэча з хлапчуком-сіратой абуджае яго да жыцця, дапамагае знайсці новы сэнс. Філосаф Ф. Ніцшэ сказаў: «У каго ёсць “нашто” жыць, той можа вытрымаць амаль любое “як”». Сэнс як раз і з'яўляецца адказам на пытанне «Нашто жыць?», таму што ён прапануе тую каштоўную мэту, дзеля якой варта змагацца.

Сэнс нельга даць чалавеку гатовым, яго трэба знайсці самому, сцвердзіць і даказаць справамі. Асэнсаваным жыццём мы сцвярджаем саміх сябе як людзей.

**Свабода.** Чалавек — істота, скаваная мноствам абмежаванняў, залежнасцей. Мы матэрыяльныя і цялесныя, а значыць, падначалены фізічным законам і законам фізіялогіі.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



Рафаэль Санці. *Сіксцінская мадонна* (1512—1513)

Як асобы з канкрэтнага грамадства, мы падуладныя яго сацыяльным і юрыдычным законам, нормам і правілам, стэрэатыпам паводзін. Эканамічная неабходнасць прымушае нас вырашаць мноства праблем жыццезабеспячэння. Дык ці ёсць у гэтым сатканым з неабходнасцей свеце свабода? Што яна з сябе ўяўляе?

*Вядомыя дзве трактоўкі свабоды.* Першая: свабода ёсць пазнаная неабходнасць. Паколькі чалавек рухаецца ў рэчышчы магутнай плыні касмічнага маштабу, ён можа толькі падпарадкоўвацца ёй. Скарыся неабходнасці, як камень у палёце падпарадкоўваецца сіле прыцягнення.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Усвядомь знешнюю для цябе неабходнасць як адзіна магчымую, прымі яе як свой унутраны кліч — і ты займееш свабоду. Другая: сутнасць свабоды заключаецца ў магчымасці выбару. Калі мы нічога не выбіраем па ўласнай волі, мы несвабодныя. Амаль заўсёды ў жыцці ёсць альтэрнатывы, і чалавек вольны аддаць перавагу таму ці іншаму спосабу паводзін, той ці іншай ацэнцы.

Паміж дзвюма названымі трактоўкамі свабоды няма неадольнай супярэчнасці. Бо наш выбар будзе правільным, выніковым толькі ў тым выпадку, калі ён адпавядае законам прыроды і грамадства (прыроднай і сацыяльнай неабходнасці). Гэтыя законы, пераплятаючыся, робяць магчымым розны ход падзей, і мы выбіраем тую магчымасць, якая нам больш падыходзіць.

Бывае, што чалавек не ў сілах вырашыць, якую ж каштоўнасць выбраць, і тады ён можа ці хоча адмовіцца ад вырашэння, адысці, пакінуўшы сур'ёзную работу над наяўнай праблемай іншым людзям. Аднак нават адмаўленне ад выбару таксама ёсць выбар. Нічога не зрабіць — таксама ўчынак. Невыпадкова законам прадугледжана пакаранне за «неаказанне дапамогі». Не аказаць дапамогу, змоўчаць, заплюшчыць вочы — таксама свабодны выбар. Калі ты не знайшоў правільную лінію паводзін — значыць, хтосьці выбраў за цябе і ход падзей можа аказацца неспрыяльным.

Пытанне пра свабоду выбару немінуча падводзіць нас да пытання пра адказнасць за ўсё, што мы робім (ці не робім, хаця маглі і павінны былі зрабіць). *Адказнасць* — адваротны бок свабоды; яны непарыўна звязаны паміж сабой. Той, хто робіць свой выбар, г. зн. дзейнічае свабодна, цалкам адказвае за ўчыненае. Чым больш свабоды ў чалавека, тым большая адказнасць ляжыць на ім. Наадварот, адсутнасць свабоды зніжае і адказнасць чалавека.

Паводзіць сябе адказна — значыць быць здольным актыўна дзейнічаць і разам з тым разумець і асэнсоўваць, як адаб'юцца твае дзеянні на табе і на іншых, якімі будуць іх вынікі.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Несці *адказнасць* — значыць прыняць на сябе не толькі планаванне і выкананне, але і ўсе вынікі здзейсненых учынкаў. У сваю чаргу, безадказнасць азначае імкненне перакласці выкананне намечанага, а таксама вынікі сваіх дзеянняў на іншых, прымусіць іх расплачвацца за вашу баязлівасць, неразважнасць ці нястрымную зухаватасць.

**Шчасце.** Пра шчасце думаюць у юнацтве і ў старасці, яго жадаюць дабіцца ў сталым узросце, яно выступае адкрытай ці схаванай мэтай многіх чалавечых імкненняў, з'яўляецца вельмі важным матывам дзейнасці.

Што такое шчасце? Кожны разумее гэта па-свойму, але ўсе хочуць яго мець. Даследчыкі адзначалі, што ўжо ў Старажытным Рыме існавала каля 300 розных уяўленняў пра «сапраўднае шчасце». Вы можаце спытаць: калі так шмат меркаванняў, то ці варта ўвогуле гаварыць пра гэту маральную катэгорыю? Варта, таму што вельмі важна разабрацца: што́ ў чалавечым шчасці залежыць ад аб'ектыўных умоў і што́ — ад самога чалавека, яго суб'ектыўных асаблівасцей.

Адной з умоў шчасця і ўвогуле зыходнай перадумовай чалавечага існавання з'яўляецца задавальненне матэрыяльных патрэбнасцей. Імкненне да максімальнага дастатку і жыццёвага камфорту — норма чалавечага існавання. Але дастатак — гэта проста валоданне дабротамі, ён ніяк не можа прыраўноўвацца да шчасця. Згадайце старую з казкі А. С. Пушкіна «Пра рыбака і рыбку», якая імкнулася «ўварваць» як мага больш матэрыяльных выгад. Ці была яна шчаслівая?.. Пісьменнік Ч. Айтматаў справядліва заўважыў: усё, што мы атрымліваем, — гэта ўмовы жыцця, і толькі тое, што мы аддаём, — само жыццё. Значыць, дастатак можа служыць перадумовай, але не самім шчасцем. Як вядома, «багатыя таксама плачуць».

Другая найважнейшая ўмова, якая дазваляе чалавеку адчуць сябе шчаслівым, — гэта задавальненне духоўных патрэбнасцей, у тым ліку набыццё новых ведаў, больш глыбокае разуменне таго, што адбываецца, паспяховая

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

рэалізацыя творчай дзейнасці. Трэцяя ўмова — сацыяльны дабрабыт: добрая сям'я, добрыя зносіны з людзьмі, павага з іх боку.

Шчасце нельга знайсці, выйграць, атрымаць у падарунак. Яго можна толькі здабыць у працэсе самаажыццяўлення, самарэалізацыі асобы. І гэта — яшчэ адна вельмі важная ўмова шчасця.

Сапраўднае шчасце звычайна звязана з адчуваннем неверагоднага ўздыму духоўных і фізічных сіл чалавека, яго імкненнем да перажывання ўсёй паўнаты жыцця. Такім чынам, гэтаму паняццю можна даць такое азначэнне.

*Шчасце* — гэта стан чалавека, звязаны з адчуваннем глыбокага маральнага задавальнення, паўнаты быцця.

Гэты стан немагчымы без пераадолення ўласнай інертнасці, ляноты, пасіўнасці, поўнай залежнасці ад знешніх абставін. Шчасце не з'яўляецца непарыўнай плынню ўцех, пастаянным адчуваннем радасці. Яно — гэта, хутчэй, «зорны час» чалавека, найбольш яркія моманты яго жыцця.

**Некаторыя высновы**

1. Да найвышэйшых маральных каштоўнасцей адносяцца дабро, свабода, сэнс жыцця, шчасце, любоў. 2. Сэнс жыцця звязаны са значнымі мэтамі і каштоўнасцямі, да якіх мы імкнёмся. Яго нельга атрымаць гатовым, а трэба знайсці самастойна. 3. Сутнасць свабоды заключаецца ў пазнанні неабходнай сувязі з'яў, а таксама ў магчымасці выбару і адказнасці за вынікі здзейсненых учынкаў. 4. Неабходнымі ўмовамі шчасця з'яўляюцца аптымальнае задавальненне матэрыяльных, духоўных і сацыяльных патрэбнасцей, самарэалізацыя асобы.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

### ?! *Пытанні і заданні*

1. Якія віды маральных каштоўнасцей вы ведаеце?
2. Як разумеюць сэнс жыцця ў рамках:
   а) песімістычнага падыходу;
   б) скептычнага падыходу;
   в) аптымістычнага падыходу?
3. Кажуць, што жыццё чалавека не прайшло бессэнсоўна, калі ён пабудаваў дом, выхаваў сына і пасадзіў дрэва. Як вы думаеце, чаму? Ці кожнаму гэта ўдаецца?
4. У чым адрозненне сэнсу жыцця ад мэты жыцця?
5. Што лягчэй: мець свабоду ці не мець яе? Чаму?
6. Ці ўсе людзі дастойныя маральнай свабоды?
7. Падрыхтуйце паведамленне пра асаблівасці шчасця і яго «законы».
8. Ці згодныя вы з тым, што шчасце кожны разумее па-свойму? Ці існуе, на ваш погляд, нейкае абагульненае разуменне шчасця, справядлівае для ўсіх?
9. А. С. Пушкін пісаў: «На свеце ўцех няма, ды ёсць спакой і воля» (пераклаў М. Стральцоў). Але праз нейкі час жыццё прывяло яго да зусім процілеглай высновы:

   ...Чужы для ўсіх, незакаханы,
   Я думаў: вольнасць і спакой
   Замена шчасцю. Божа мой!
   Як я за гэта пакараны! (Пераклаў А. Куляшоў.)

   Як вы лічыце: чаму паэт змяніў сваё меркаванне?

## § 22. Маральныя нормы

**Узнікненне маральных нормаў.** Напэўна, вам даводзілася чуць, як пра кагосьці кажуць: «Ён парушыў маральныя нормы». Што ж такое маральныя нормы і чаму іх парушэнне выклікае асуджэнне?

*Маральныя нормы* вызначаюць, як чалавек павінен сябе паводзіць у адносінах з грамадствам, іншымі людзьмі, як ставіцца да самога сябе.

Яны ўзніклі не адразу, а фарміраваліся на працягу ўсёй гісторыі развіцця грамадства. Першабытны чалавек не мог выжыць у адзіночку. Неабходнасць калектыўнага існавання ў той перыяд патрабавала выканання пэўных правіл

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



У. Я. Макоўскі. *Не пушчу!* (1892)

сумеснага жыцця. Менавіта тады аформіліся прадпісанні: «Дапамагай сваякам», «Не забівай», «Не крадзі», «Не мані» і г. д. Вырашальную ролю ў гэтым працэсе адыгрывала праца, на аснове якой з'яўляліся і замацоўваліся ў свядомасці і паводзінах людзей патрабаванні працавітасці, павагі да старэйшых, дапамогі слабым, іх абароны і інш. У працэсе развіцця грамадства складваліся і замацоўваліся ўсё больш складаныя правілы сумеснай жыццядзейнасці, што ператвараліся ў нормы і перадаваліся ад пакалення да пакалення. Адначасова знікалі, адкідваліся тыя нормы і ўстаноўкі, якія перасталі адпавядаць новым умовам грамадскага жыцця.

Узнікненне маральных нормаў суправаджала станаўленне самога грамадства і азначала пераход чалавека ад інстынктыўных формаў паводзін да свядомай калектыўнай дзейнасці. Многія элементарныя маральныя нормы, якія

Адукацыя і выхаванне
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ўзніклі ў эпоху першабытна-абшчыннага ладу, захоўваюць сваё значэне ў нашы дні.

**Значэнне маральных нормаў для грамадства і чалавека.** Сёння мы не можам уявіць жыццё ў грамадстве без агульнапрынятых маральных нормаў. Мараль ад пачатку была звернута да кожнага індывіда і рэгулявала адносіны «чалавек — чалавек», «чалавек — калектыў», «чалавек — грамадства».

Маральныя нормы ўласцівы толькі чалавеку і фарміруюцца толькі ў чалавечым грамадстве. І гэта менавіта маральныя нормы і ўстаноўкі рэгулююць людскія паводзіны і развіццё грамадства, з'яўляюцца вельмі важнымі складнікамі культуры. Трэба памятаць, што для паспяховага дзеяння маральныя нормы павінны быць глыбока засвоены чалавекам, «увайсці ў яго душу», стаць часткай унутранага свету. Чалавек маральны толькі тады, калі маральныя нормы і маральныя паводзіны становяцца арганічнымі для яго, дапамагаюць яму правільна паводзіць сябе ў самых розных сітуацыях. А грамадства можа паспяхова развівацца, калі яго члены трымаюцца маральных нормаў, адпаведных духоўным ідэалам гэтай эпохі.

**Узаемасувязь маральных нормаў, якасцей, прынцыпаў, ідэалаў.** Маральныя нормы з'яўляюцца найпрасцейшай формай маральных патрабаванняў. Яны альбо патрабуюць, альбо забараняюць паводзіны пэўнага тыпу. Маральныя нормы непасрэдна закранаюць усе аспекты чалавечых узаемаадносін, прадпісваючы праяўляць узаемны клопат, павагу, падтрымку, быць сціплымі, праўдзівымі, шчырымі, выхоўваць у сабе працавітасць, тактоўнасць, мужнасць. Выкананне маральных нормаў характарызуюць такія якасці, як ветлівасць, прыстойнасць, сумленнасць. Не пакрыўдзіць слабага, не прынізіць, не зняважыць чалавека, не перашкаджаць навакольным у грамадскіх месцах — усё гэта простыя нормы чалавечых паводзін, якія фарміруюцца ў нас з першых гадоў жыцця. Норма вызначае паводзіны асобы ў пэўных тыповых сітуацыях, якія паўтараюцца на працягу тысячагоддзяў. Звычайна мы кіруемся нормамі па звычцы, не задумваючыся; толькі іх

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

парушэнне прыцягвае ўвагу людзей як абуральная, страшэнная агіднасць.

Дзейснасць маральных нормаў, што прымушаюць чалавека рабіць так, а не інакш, дасягаецца з дапамогай *грамадскай думкі*: любому ж з нас непрыемна стаць вядомым сваёй няветлівасцю, грубасцю, бестактоўнасцю, звесці на сябе асуджэнне ці кпіны навакольных. Грамадская думка, фарміруючы некаторыя стандарты паводзін, служыць бы гарантам бяспекі кожнага, абаронай ад маральнага самавольства людзей.

Кожны чалавек, фарміруючыся як асоба, набывае пэўныя *маральныя якасці*. Гэтыя якасці адлюстроўваюць палярнасць маральнага свету і падзяляюцца на добрыя *(дабрачыннасці)* і дрэнныя *(заганы)*. Яшчэ старажытнагрэчаскія мудрацы вылучылі чатыры асноўныя дабрачыннасці: мудрасць, мужнасць, памяркоўнасць і справядлівасць. Ацэньваючы чалавека, мы часцей за ўсё і пералічваем гэтыя якасці. Аднак, у адрозненне ад нормаў, маральныя якасці не зводзяцца да прадпісанняў ці забарон, таму што індывід з маральнымі якасцямі здольны сам выбіраць патрэбныя правілы паводзін, маральныя нормы. Гэта азначае, што кожны адказвае за тое, каб выхоўваць у сабе і ў навакольных дабрачыннасці і змагацца з заганамі. Але чалавек звычайна не з'яўляецца ідэалам маральнасці і жывым увасабленнем усіх дасканаласцей. У яго ёсць і недахопы, прычым якая-небудзь, хай і важная, вартасць не можа аслабіць маральныя недахопы. Мала мець асобныя станоўчыя рысы — яны павінны дапаўняць адна адну, утвараючы агульную лінію паводзін. Звычайна чалавек сам вызначае яе для сябе, выпрацоўваючы пэўныя ўласныя прынцыпы: калектывізм ці індывідуалізм, працавітасць ці лянота, альтруізм ці эгаізм.

*Маральны прынцып* абазначае стратэгічную ўстаноўку чалавека ў яго адносінах з людзьмі.

Выбіраючы прынцыпы, мы выбіраем маральную арыентацыю ў цэлым і здольныя разумна абгрунтаваць яе.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Вернасць абранай станоўчай маральнай арыентацыі здаўна лічылася вартасцю чалавека. Яна азначала, што чалавек ніколі не сыдзе з маральнага шляху. Аднак жыццё шматстайнае, і не заўсёды абраныя прынцыпы дапамагаюць прыняць вернае рашэнне ў канкрэтнай сітуацыі. Так, у мінулым здаралася, што любоў да людзей прыносілі ў ахвяру рэвалюцыйным прынцыпам, ды і ў нашы дні памылкова зразуметая таварыскасць часам штурхае на амаральныя і бездухоўныя ўчынкі. Менавіта таму свае прынцыпы трэба пастаянна правяраць на чалавечнасць, гуманнасць, звяраць іх з маральнымі ідэаламі.

*Маральныя ідэалы* — гэта цэласны ўзор маральных паводзін, да якога людзі імкнуцца, лічачы яго найбольш разумным, карысным, прыгожым. Гэта ўсё самае лепшае, што выпрацавана мараллю на пэўным этапе яе развіцця.

У дзяцінстве ідэалам для нас можа быць канкрэтны чалавек. У далейшым ідэал як адзінства станоўчых якасцей набывае больш абагульнены характар. Маральны ідэал дазваляе ацэньваць паводзіны іншых людзей і з'яўляецца арыенцірам для самаўдасканалення, дапамагае кожнаму арыентавацца ў жыцці, выбіраць лінію паводзін.

Такім чынам, маральныя нормы, якасці, прынцыпы, ідэалы не дзейнічаюць самастойна, ізалявана адно ад аднаго, а з'яўляюцца асноўнымі элементамі сістэмы маралі. Усе яны цесна ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены.

### Некаторыя высновы

1. Маральныя нормы — гэта агульныя правілы паводзін. Яны фарміраваліся і змяняліся на працягу ўсёй гісторыі грамадства. 2. Дзейнічаць згодна з маральнымі нормамі людзей заахвочвае не толькі грамадская думка, але і ўнутраны голас сумлення. 3. Маральныя нормы, якасці, прынцыпы, ідэалы,

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

дзейнічаючы сумесна, складаюць сістэму маралі таго ці іншага грамадства. 4. Кіруючыся маральнымі нормамі, прынцыпамі, ідэаламі, чалавек рэгулюе свае паводзіны і самаўдасканальваецца, а грамадства ў цэлым можа паспяхова рухацца па шляху маральнага прагрэсу.

***Пытанні і заданні***

1. Што разумеюць пад маральнымі нормамі? У чым значэнне маральных нормаў для чалавека і для грамадства?
2. Ці ёсць такія нормы маралі, якія вам не падабаюцца? Што было б, калі б іх удалося скасаваць?
3. Ці заўсёды, на ваш погляд, справядлівая грамадская думка пра маральнасць чалавека? Ці заўсёды мы прыслухоўваемся да яе? Чаму?
4. Часам на ўсе павучанні хочацца адказаць: «Я нікому нічога не павінен». Ці правільна гэта?
5. Навошта выконваць маральныя правілы? Чаму часам нам хочацца ад гэтага ўхіліцца?
6. Ці ёсць у вас маральны ідэал? Што вы разумееце пад маральным ідэалам?
7. Чалавек з цвёрдымі прынцыпамі, прынцыповы чалавек — гэта добра ці дрэнна? Чаму?

## § 23. Маральныя адносіны

**Стаўленне да іншых людзей і да самога сябе.** У выніку стасункаў паміж людзьмі складваюцца маральныя адносіны, пра якія мы і пагаворым.

Напэўна, кожны заўважаў, што адны людзі выклікаюць у нас сімпатыю, іншыя — антыпатыю. Адны ставяцца да ўсіх добразычліва, другія — насцярожана, трэція ахвотна сустракаюцца толькі з тымі, хто ім «выгадны», чацвёртыя імкнуцца навязаць навакольным свае погляды.

Стаўленне чалавека да людзей характарызуецца такімі якасцямі, як высакароднасць, велікадушнасць, давер, спачуванне, цярпімасць, патрабавальнасць, чуласць ці, наадварот, нізкасць, чэрствасць, падазронасць, нецярпімасць, патуранне і г. д.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Пра *высакароднасць* мы кажам у тым выпадку, калі стаўленне чалавека да людзей накіроўваецца ўзвышанымі матывамі. Яна звязана з самаадданасцю, мужнасцю, вернасцю высокім ідэалам. Супрацьлегласць высакароднасці — нізкасць, зайздрасць і г. д.

*Велікадушным* называюць таго, хто здольны паблажліва ставіцца да нязначных праступкаў і хібаў іншых, гатовы бескарысліва ахвяраваць сваімі інтарэсамі дзеля навакольных. Велікадушны чалавек надае асаблівае значэнне чалавечай годнасці людзей, з якімі ён падтрымлівае зносіны.

*Патрабавальнасць* чалавека да іншых людзей і да самога сябе маральна апраўданая ў тым выпадку, калі яна дыктуецца справядлівасцю і пачуццём доўгу. У іншым выпадку яна можа перарадзіцца ў *прыдзірлівасць*.

*Чуласць* — гэта такое стаўленне да людзей, якое прадугледжвае клопат пра іх патрэбы, уважлівае стаўленне да іх патрэбнасцей і інтарэсаў, думак і пачуццяў. Чулым называюць таго, хто тактоўны, здольны да суперажывання, не дапускае грубасці і фанабэрыстасці.

Вялікае маральнае значэнне мае *сяброўства*, для якога характэрна павага да іншага чалавека, бескарыслівасць і самаадданасць, а таксама агульнасць інтарэсаў і ўзаемная прыхільнасць.

Усё багацце маральных зносін убіраюць у сябе *любоў* і *каханне*. Чалавек, які сапраўды любіць людзей, жыве духоўна багатым, натхнёным жыццём. Імкненне выклікаць любоў у адказ абуджае ў ім самаахвярнасць, велікадушнасць, адданасць, мужнасць і іншыя найлепшыя якасці, абвастрае пачуццё адказнасці за свае дзеянні, за шчасце і гонар дарагіх яму людзей. Такая народжаная ўнутранай патрэбнасцю адказнасць незаўважна ўтрымлівае нас ад многіх эгаістычных учынкаў, дапамагае пры неабходнасці адмовіцца ад шэрага забаў і выгод, каб стаць больш мэтанакіраванымі.

Сапраўдная любоў заўсёды дзейсная. Яна прымушае таго, хто любіць, патрабавальна глядзець на сябе вачамі другога, нараджае вялікае жаданне ўдасканальвацца: стаць

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

больш разумным, прыгожым, дужым, добрым, стрыманым, культурным. І ў гэтай актывізацыі душэўнай дзейнасці заключаецца яе вялікая маральная каштоўнасць. Моцная любоў змяняе чалавека, робіць яго чысцейшым, лепшым, мудрэйшым, дужэйшым. Яна можа перавярнуць усё яго жыццё. «Любоў настолькі ўсемагутная, што перараджае нас саміх», — пісаў Ф. М. Дастаеўскі.

Стаўленне чалавека да самога сябе можа выражацца ў такіх якасцях, як сціпласць, годнасць альбо, наадварот, пыхлівасць, самалюбства і інш. *Годнасцю* называюць такое маральнае стаўленне да самога сябе, якое зыходзіць з прызнання каштоўнасці кожнага індывіда як маральнай асобы. Нельга дазваляць сабе таго, што было б ніжэйшае за нашу годнасць. Сапраўдная годнасць не залежыць ад грамадскага становішча ці характару дзейнасці. Яна звязана з павагай чалавека да самога сябе як да асобы і вызначаецца здольнасцю на справе выконваць патрабаванні маралі.

З чалавечай годнасцю цесна звязана паняцце пра *гонар*. Праўда, паміж імі ёсць і розніца. Уяўленне пра годнасць асобы грунтуецца на прызнанні роўнасці ўсіх людзей у маральным плане. Паняцце пра гонар — на неаднолькавай ацэнцы людзей у залежнасці ад іх рэпутацыі ці ад меркавання пра маральнае аблічча таго ці іншага індывіда, якое сфарміравала грамадская думка. Чалавек павінен апраўдваць станоўчую рэпутацыю, інакш яму пагражае ганьба, знявага гонару.

Ацэньваючы сябе, можна як завышаць, так і заніжаць ацэнку, тым самым фарміруючы ў сябе або ганарлівасць (самаўзвышэнне), або комплекс непаўнацэннасці. Толькі адэкватная, г. зн. адпаведная рэчаіснасці, ацэнка спрыяе развіццю станоўчых індывідуальных якасцей, самаразвіццю і самаўдасканаленню ў цэлым.

Старажытнагрэчаскі філосаф Платон (427—347 г. да н. э.) расказаў такі міф: душы людзей пасля смерці атрымліваюць новае ўвасабленне ў адпаведнасці з тымі якасцямі, якія яны дэманстравалі пры жыцці. Тыя, хто быў схільны да абжорства, распуснасці і п’янства, ператвараюцца ў аслоў і свіней. Тыя, хто аддаваў перавагу несправядлівасці,

Адукацыя і выхаванне
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

уладалюбству і драпежніцтву, ператвараюцца ў валкоў, ястрабаў і каршуноў. А які ж будзе лёс людзей маральных — разважлівых і справядлівых? Яны, верагодней за ўсё, зноў стануць людзьмі. У любым выпадку яны апынуцца ў мірным і таварыскім акружэнні.

**Стаўленне да Радзімы.** Асаблівае месца ў сістэме адносін займае стаўленне чалавека да Радзімы. Часцей за ўсё яно грунтуецца на прынцыпах патрыятызму і касмапалітызму.

*Патрыятызм* — гэта любоў да Радзімы.



І. В. Ахрэмчык. *Абаронцы Брэсцкай крэпасці* (1957—1958)

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

З пачуццём патрыятызму можна ставіцца як да «вялікай радзімы» — сваёй дзяржавы, народа, так і да «малой радзімы» — да тых мясцін, дзе ты нарадзіўся і вырас.

У чым жа праяўляецца патрыятызм? У гучных словах і палкіх запэўненнях аб любові да Бацькаўшчыны? Ці ў канкрэтных справах на карысць Радзімы?

Патрыятызм мае перадумовай перш за ўсё клопат пра шчасце Радзімы. Людзі, абыякавыя да лёсу Бацькаўшчыны, гатовыя ў любы момант змяніць яе на іншыя краі, ніяк не могуць лічыцца патрыётамі.

З клопатам звязана адказнасць. Бясспрэчна, большасць грамадзян наўрад ці могуць у поўнай ступені адказваць за тыя падзеі, якія адбываюцца ў дзяржаве. Непасрэдную адказнасць нясуць органы ўлады — але ж яны ў нас выбарныя, і кожны грамадзянін самастойна робіць свой выбар. Клопат пра шчасце Радзімы і адказнасць за яе прадугледжваюць працу, стараннасць і дбанне не толькі дзеля ўласнага дабрабыту, але і дзеля росквіту сваёй краіны. Патрыятызм патрабуе таксама ведання Радзімы і павагі да яе.

Веданне Радзімы — гэта веданне яе гісторыі і культуры, мовы, адметных асаблівасцей жыцця. Павага да Радзімы — гэта разуменне яе такой, якая яна ёсць, імкненне дапамагчы ёй стаць лепшай. Кажуць: «Радзіму не выбіраюць». Так, мы жывём у пэўных умовах, характэрных для краіны, у якой нарадзіліся, і ад усіх нас, грамадзян Рэспублікі Беларусь, залежыць наша агульная будучыня. Наш лёс і лёс нашай Радзімы — у нашых руках.

*Касмапалітызм* — гэта ідэалогія, якая заклікае чалавека ўсвядоміць сябе «грамадзя́нінам свету», а не канкрэтнай краіны.

Пад гэтым часам хаваецца абыякавасць, раўнадушша да сваёй Бацькаўшчыны, яе традыцый і культуры. Адрываючыся ад сваіх каранёў, пакідаючы па ўласным жаданні Радзіму, чалавек звычайна спадзяецца на шчаслівае ўладкаванне на іншым месцы. Аднак ён часта становіцца

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

чужынцам, лішнім і для той краіны, куды з'ехаў. Нават дасягнуўшы поспеху на чужой зямлі, ён можа раптам адчуць сябе бяздомным валацугам.

Нярэдка сустракаецца і нацыяналізм, ці нацыянальны эгаізм.

*Нацыяналізм* — супрацьпастаўленне сваёй Радзімы ўсім іншым краінам і народам, абсалютызацыя інтарэсаў сваёй краіны ці нацыі.

Нацыяналіст — гэта, як правіла, чалавек, які імкнецца самасцвердзіцца за кошт сваёй прыналежнасці да пэўнага народа ці краіны. І тут не трэба быць ні разумным, ні працавітым, ні добрым. Дастаткова проста нарадзіцца на Беларусі ці быць амерыканцам, каб адчуваць сваю спрадвечную перавагу над іншымі. Нацыяналізм вядзе ў тупік, ён не нараджае нічога, акрамя разладу.

**Гуманізацыя грамадскіх зносін.** Мы ўжо адзначалі, што ў працэсе маральнай дзейнасці паміж людзьмі складваюцца разнастайныя адносіны, у тым ліку — узаемадапамогі ці канкурэнцыі, даверу ці варожасці, сяброўства ці нянавісці. Важнай умовай гуманізацыі грамадскіх зносін была і застаецца *мараль*.

*Задача маралі* заключаецца ў тым, каб даць людзям веданне і разуменне ідэалаў гуманнасці (чалавекалюбства), якія вызначаюць нормы маралі.

Быць гуманным у рэальных паводзінах нялёгка. Для гэтага патрэбны не толькі пазітыўны погляд на свет, але і ўстойлівыя маральныя звычкі, уменне валодаць сабой, рэгуляваць свае ўчынкі. Не ўсім дадзены ад прыроды такія якасці, як дабрыня, міласэрнасць, ветлівасць, прыстойнасць. Шмат што выводзіць нас з раўнавагі, і тады мы часам «зрываемся», бываем рэзкімі, з'едлівымі, бязлітаснымі, кажам грубасці, з-за якіх потым шкадуем. *Практычны гуманізм* — не проста якасць асобы, а перш за ўсё важная грамадская мэта, рух да якой прынясе і кожнаму з нас, і грамадству ў цэлым рэальныя дасягненні.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Прызначэнне маралі* заключаецца ў наладжванні адносін паміж людзьмі, у дасягненні згоды, у ліквідацыі ці недапушчэнні варожасці і неразумення, у сцвярджэнні гармоніі чалавечых стасункаў. Усё гэта — умовы сапраўднага гуманізму, які адлюстроўвае правы людзей на годнае і шчаслівае жыццё.

Гуманістычнае абнаўленне свету на маральных прынцыпах выступае ў якасці мэты, а рух да яе служыць крыніцай усіх іншых мэт, вартых чалавека.

## Некаторыя высновы

1. Маральную асобу ў стасунках з іншымі людзьмі характарызуюць такія якасці, як высакароднасць, велікадушнасць, давер, спагадлівасць, цярпімасць, патрабавальнасць, чуласць, пачуццё ўласнай годнасці і разам з тым сціпласць, аб'ектыўная самаацэнка.
2. Патрыятызм уключае не толькі любоў да Радзімы, але і веданне яе гісторыі і культуры, павагу да яе, клопат пра яе і адказнасць за яе будучыню.
3. Сапраўднай мэтай грамадскага развіцця з'яўляецца гуманістычнае абнаўленне свету.

### ?! *Пытанні і заданні*

1. Якія маральныя якасці характарызуюць стаўленне чалавека да іншых людзей?
2. У чым падабенства і розніца чалавечай годнасці і гонару? Пацвердзіце свае развагі прыкладамі.
3. У чым, на ваш погляд, заключаецца патрыятызм?
4. На падставе гістарычных матэрыялаў і літаратурных твораў падрыхтуйце паведамленне пра патрыятызм беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
5. Якая ваша маральная ацэнка нацыяналізму? Абгрунтуйце свой пункт гледжання.
6. Як вы разумееце словы Эпікура: «З усяго, што дае мудрасць для шчасця ўсяго жыцця, найвялікшае — гэта знаходжанне сяброўства»? Якія маральныя якасці асобы спрыяюць наладжванню сяброўскіх адносін?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

7. Супярэчлівасць маральнай свядомасці была заўважана яшчэ старажытнакітайскімі мысліцелямі. Так, Лаа-цзы сцвярджаў: «Добры чалавек — настаўнік нядобрага чалавека»; «О няшчасце! Яно з’яўляецца апорай шчасця. О шчасце! У ім прытаілася няшчасце». Растлумачце, як вы разумееце гэтыя выказванні.

## § 24. Маральныя паводзіны

**Маральны ўчынак і яго матывы.** Пра ўзровень культуры чалавека судзяць па яго паводзінах. А паводзіны складаюцца з асобных учынкаў, якія можна ацаніць з пазіцый маралі.

*Паводзіны чалавека* — гэта рэалізацыя яго стаўлення да іншых людзей, да грамадства і самога сябе.

*Маральныя паводзіны* абапіраюцца на маральную свядомасць і з’яўляюцца вынікам свабоднага выбару асобы. Паводзіны чалавека залежаць ад маральных нормаў, якасцей і прынцыпаў, што ў яго сфарміраваны. Калі чалавек трымаецца маральных нормаў, прынятых у грамадстве (паважае старых, не крыўдзіць слабых, не хлусіць, не бярэ чужога і г. д.), такія паводзіны лічацца нармальнымі, г. зн. правільнымі. Сустракаючыся з людзьмі працавітымі, самаадданымі, якія гатовы прыйсці на дапамогу не толькі блізкім, але і незнаёмцам, якія не крывяць душой, не зайздросцяць чужому поспеху, мы кажам: «Гэта добрыя, дабрачынныя людзі». Сутыкаючыся з чалавекам, які імкнецца нажыцца за чужы кошт, жадае гультайскага, распуснага жыцця, які можа падмануць, украсці, мы ацэньваем яго як разбэшчанага, сапсаванага, амаральнага.

Структуру маральных паводзін можна паказаць на схеме, змешчанай на с. 184.

Цэнтральным элементам маральных паводзін з’яўляецца *ўчынак*, які характарызуе здольнасць чалавека да свядомай пастаноўкі мэты, выбару адпаведных сродкаў і самастойнага дзеяння. Прычым мэта можа быць адна,

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"




*Схема 5.* Структура маральных паводзін

а вось сродкі яе дасягнення — розныя. Напрыклад, каб здаць экзамен на станоўчую адзнаку, трэба засвоіць пэўны аб'ём ведаў па прадмеце, але хтосьці вырашыць (пры вядомай спрытнасці) выкарыстаць шпаргалку. І нават калі мэта будзе дасягнута, гэтыя ўчынкі атрымаюць розныя ацэнкі як з боку навакольных, так і самога вучня.

Немагчыма быць дабрачынным у душы, але хлуслівым і цынічным у паводзінах. Нашы ўчынкі паказваюць, якія мы насамрэч. Любы ўчынак павінен разглядацца ў сукупнасці з яго матывамі, а таксама вынікамі.

Учынку папярэднічае *матывацыя*, якая адыгрывае ролю імпульсу, пабуджальніка да дзеяння. Матыў апярэджвае ўчынак і працягвае сваё дзеянне ў час яго здзяйснення. Гэта вельмі моцны рэгулятар чалавечых паводзін, не меней важны, чым сам учынак. Напрыклад, дзеля пакарэння горнай вяршыні спартсмены-альпіністы здольны пераадолець велізарныя цяжкасці, нават рызыкаваць жыццём.

Матывы і ўчынкі могуць не супадаць ці не адпавядаць адзін аднаму з пункту гледжання іх маральнай асновы.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



Джон Джорж Браун. *Падкідыш* (1907)

Не заўсёды «добрыя намеры» (матывы) прыводзяць да правільных учынкаў, і наадварот: часам людзі хаваюць ад блізкіх (бацькоў, мужа ці жонкі) свае несамавітыя ўчынкі, кіруючыся матывам, што яны робяць гэта дзеля іх шчасця, каб тыя не расхваляваліся. Але рана ці позна, даведаўшыся пра хлусню, нашы блізкія засмуцяцца яшчэ больш, таму што перастануць нам верыць. Тым не менш бываюць сітуацыі, калі падман з'яўляецца не проста дапушчальным, але нават адзіна правільным дзеяннем. Подзвігам і доблесцю на вайне лічыцца ашукаць ворага, зблытаць яго разлікі, дэзарыентаваць, каб выйграць бітву.

Такім чынам, сувязь паміж матывам і ўчынкам неадназначная. Адзін і той жа матыў падштурхоўвае людзей да розных учынкаў; адна і тая ж лінія паводзін можа быць прадыктавана рознымі матывамі.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Маральная ацэнка.** Ацэнка маральнага ўзроўню асобы залежыць не толькі ад вынікаў, але і ад матываў, якія рухаюць яе дзеянні. Чаму, дзеля чаго я раблю так, а не іначай? Чаго я хачу дабіцца? Нашто мне гэта патрэбна? За гэтымі пытаннямі стаіць не проста цікавасць да прычын паводзін асобы, але імкненне зразумець яе сутнасць.

Вялікую ролю ў маральнай рэгуляцыі паводзін адыгрывае *маральная ацэнка*, якая прадугледжвае асуджэнне ці адабрэнне ўчынку чалавека, яго паводзін, ладу думак ці жыцця на падставе патрабаванняў маралі.

Кожны чалавек хоча ўхвалення, імкнецца да станоўчай ацэнкі сваіх дзеянняў. Для гэтага ён здзяйсняе добрыя ўчынкі і ўстрымліваецца ад кепскіх дзеянняў ці, здараецца, хавае свае промахі. Грамадская думка ацэньвае паводзіны, г. зн. учынкі чалавека, з пункту гледжання іх адпаведнасці маральным патрабаванням, прынятым у грамадстве. Калі юнак у размове з пажылым чалавекам дапускае грубасць, калі прадавец свядома прадае няякасны тавар, калі навучэнец хлусіць педагогу ці сваім таварышам, грамадская думка іх асуджае, таму што іх паводзіны супярэчаць маральным нормам, прынятым у грамадстве. Але знешняя ацэнка (грамадская думка) можа не супадаць з унутранай (сумленнем). Шмат хто з вас, напэўна, памятае апавяданне «Сумленне», у якім дзяўчынка вырашыла прагуляць заняткі. Сустрэўшы першакласніка, яна строга спытала: «Ты чаму прагульваеш урокі?» І калі хлопчык растлумачыў, што баіцца прайсці міма сабакі, яе ахапіў сорам не столькі за прагул, колькі за тое, што ў вачах малыша яна паўстала сумленнай і строгай школьніцай. Самы строгі суддзя — сумленне, а *маральная ацэнка* характарызуе адпаведнасць таго, што чалавек здзейсніў (існага), таму, як трэба рабіць (належнаму).

Магчыма ацэнка і будучых дзеянняў, напрыклад, пры выбары рашэнняў. У гэтым выпадку ацэнка выступае як здольнасць прадбачыць вынікі ўчынку і ў такой якасці можа адначасова служыць яго матывацыяй.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Сваю ацэнку людзі паказваюць у выглядзе пахвалы ці ганьбавання, згоды ці крытыкі, сімпатыі ці антыпатыі.

**«Залатое правіла» маральнасці.** Гэта фундаментальнае правіла, якое часта атаясамліваюць з самой мараллю. Яно абвяшчае:

*«Абыходзься з іншымі так, як бы ты хацеў, каб іншыя абыходзіліся з табой».*

Гэта правіла ўпершыню было дакладна сфармулявана яшчэ ў сярэдзіне I тыс. да н. э., прычым адначасова і незалежна ў розных культурах — старажытнакітайскай, старажытнаіндыйскай, старажытнагрэчаскай — і мела пры гэтым надзіва падобныя фармулёўкі. Часцей за ўсё яно асэнсоўвалася як асноватворная маральная ісціна, найважнейшая практычная мудрасць.

«Залатое правіла» маральнасці патрабуе ад чалавека ў стасунках з іншымі кіравацца такімі нормамі, якімі б ён хацеў, каб кіраваліся ўсе людзі. Для гэтага яму неабходна ў думках паставіць сябе на месца іншага (іншых), а іх паставіць на сваё месца. Ці хацелі б вы, каб вам манілі? Значыць, не маніце іншым. Ці хацелі б вы, каб у цяжкую хвіліну вам дапамаглі навакольныя? Значыць, і самі працягніце руку дапамогі тым, каму яна патрэбна. Таму правільна будзе сказаць: «Не жадай іншым таго, чаго не хочаш, каб яны жадалі табе». Гэта правіла можна сфармуляваць і так: «Стаўся да іншых так, як хочаш, каб яны ставіліся да цябе».

«Залатое правіла» маральнасці ёсць правіла ўзаемнасці. Для самой асобы яно ёсць маральны закон, патрабаванне пэўных паводзін. Для іншых яно фармулюецца намі ў выглядзе пажадання: «Дзейнічай так, як бы ты хацеў, каб дзейнічалі іншыя».

Такім чынам, маральная асоба ўстанаўлівае маральны закон не толькі для таго, каб прад'явіць патрабаванні іншым людзям, а найперш для таго, каб самой няўхільна выконваць яго як норму паводзін.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Некаторыя высновы

1. Паводзіны чалавека выяўляюць яго стаўленне да іншых людзей, грамадства і самога сябе. 2. Цэнтральным элементам маральных паводзін з'яўляецца ўчынак, якому папярэднічае матывацыя, пастаноўка мэты, прыняцце рашэння. 3. Учынак ацэньваецца не толькі па выніках, але і па матывах, якія накіроўваюць дзеянні чалавека. 4. Маральная ацэнка прадугледжвае асуджэнне ці ўхваленне ўчынку, паводзін чалавека на падставе законаў маралі. 5. «Залатое правіла» маральнасці патрабуе ад чалавека ў яго стасунках з людзьмі кіравацца такімі нормамі, якія прыдатныя для ўсіх і ўтрымліваюць агульнае патрабаванне чалавечнасці.

### ?! *Пытанні і заданні*

1. Якая структура маральнага ўчынку?
2. І. В. Гётэ пісаў: «Паводзіны — гэта люстэрка, у якім кожны паказвае свой твар». Як вы гэта разумееце?
3. Што такое маральная ацэнка?
4. Чаму, на ваш погляд, знешняя ацэнка ўчынкаў (у грамадскай думцы) не заўсёды супадае з унутранай самаацэнкай?
5. Як фармулюецца «залатое правіла» маральнасці?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Практыкум

1. Ці павінен быць ва ўсіх людзей толькі адзін сэнс жыцця або ў кожнага чалавека — уласны? Давайце дадзім слова абаронцам розных пунктаў гледжання, якіх звычайна называюць апанентамі.

*Першы пункт гледжання.* Ва ўсіх людзей сэнс жыцця павінен быць нейкі адзін, бо ўсе ж людзі па сваёй прыродзе аднолькавыя. І сэнс жыцця — гэта якраз тое, што іх аб'ядноўвае і адрознівае ад жывёл. Акрамя таго, калі б жыцці розных людзей мелі неаднолькавы сэнс, то кожны з іх цягнуў бы толькі ў свой бок і яны ніколі не маглі б зразумець адно аднаго і дзейнічаць супольна.

*Другі пункт гледжання.* Тое, што ва ўсіх людзей ёсць агульныя ці радавыя ўласцівасці, ніяк не выключае іх адрозненняў. Кожны чалавек — гэта непаўторная істота, таму і сэнс жыцця ў кожнага павінен быць свой. Зразумець жа іншага можна нават не падзяляючы яго поглядаў. А дзейнічаць супольна людзей прымушае зусім не агульны сэнс жыцця, а ўзаемная выгада.

*Трэці пункт гледжання.* Усё гэта правільна, але толькі часткова, таму што сэнс жыцця ў розных людзей з'яўляецца і агульным, і адрозным. Прыналежнасць кожнага асобнага чалавека да людскога роду, пэўнага грамадства, нацыі ці класа абумоўлівае тое, што ў кожнага чалавека ёсць нешта агульнае з іншымі людзьмі, у тым ліку і сэнс жыцця. У той жа час, паколькі кожны чалавек чымсьці адрозніваецца ад іншых, гэта яго адрозненне таксама можа праявіцца ў разуменні ім сэнсу жыцця. Тое, што мы называем сэнсам жыцця, у кожанага чалавека ў чымсьці супадае, а ў чымсьці не супадае з сэнсам жыцця іншых людзей.

Які з прыведзеных пунктаў гледжання падаецца вам больш правільным? Абгрунтуйце сваё меркаванне. Уявіце сябе ўдзельнікам дыскусіі пра сэнс жыцця. У чым ён заключаецца для вас?

2. Пазнаёмцеся з гісторыяй, якую расказаў нам старажытнагрэчаскі гісторык Герадот (485(?)—425 гг. да н. э.).

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Многія не раз чулі фразу «багаты як Крэз». Справа ў тым, што цар Лідзіі Крэз лічыўся ў старажытным свеце найбагацейшым з людзей, таму яго імя з часам стала знакам багацця. Дык вось, Крэз пасля заваёвы Лідзіі персідскім царом Кірам II патрапіў у палон. Перад пакараннем смерцю Крэз усклікнуў: «О, Салон, Салон!» Кір зацікавіўся і спытаў, што ён жадаў сказаць гэтым. Крэз адказаў: «Меў рацыю Салон! Пакуль чалавек не памёр, рана казаць, быў ён шчаслівы ці не». Чаму ж Крэз у сваю апошнюю хвіліну ўспомніў раптам грэчаскага мудраца Салона?

...У адным з раскошных палацаў Сардаў — сталіцы Лідзіі, якая ў тыя далёкія часы знаходзілася на тэрыторыі цяперашняй Турцыі, лідзійскі цар Крэз прымаў шляхетнага госця — Салона, аднаго з самых мудрых афінскіх заканадаўцаў. Крэз паказаў госцю з Грэцыі свае скарбы, палацы, стайні, а потым, упэўнены загадзя ў адказе, задаў яму пытанне: каго Салон лічыць самым шчаслівым чалавекам з усіх, каго ён ведаў у сваім жыцці?

Задумаўшыся, Салон праз некаторы час адказаў:

— Я лічу самым шчаслівым з людзей афіняніна Талеса.

— Чаму ж? — спытаў з дрэнна прыхаваным расчараваннем здзіўлены Крэз.

І Салон растлумачыў: па-першае, таму, што Талес жыў у гады росквіту Афін і, такім чынам, вакол сябе ён бачыў шмат шчаслівых грамадзян; па-другое, ён выгадаваў са сваіх сыноў і дочак добрых людзей, ажаніў іх і выдаў замуж, і яны стварылі добрыя сем'і і далі Талесу годных нашчадкаў; па-трэцяе, Талес жыў не ведаючы гора і нястачы; па-чацвёртае, ён адважна ваяваў за свабоду Афін — свайго роднага горада і загінуў у баі як герой; нарэшце, па-пятае, удзячныя афіняне з ушанаваннямі пахавалі яго як героя.

— А ці магу я лічыць сябе шчаслівым? — усё ж вырашыў спытаць цар.

— Чалавек жыве ў сярэднім каля 70 гадоў. Гэта каля 26 тысяч дзён, кожны з якіх не падобны на іншы. Я не магу сказаць, што ты шчаслівы, пакуль не пачую аб тваім шчаслівым канцы, — адказаў Салон.

Як разумеў сутнасць шчасця, сэнс жыцця Салон? У чым заключаецца, на ваш погляд, мудрасць і павучальнасць гэтай гісторыі?

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

3. Вялікія людзі ўсіх часоў і народаў звярталіся да тэмы жыццёвага шляху чалавека, тых правіл і законаў, якімі ён павінен кіравацца. Пазнаёмцеся з некаторымі з іх:

*У жыцці, прыслухоўваючыся да сэрца, кіравацца розумам.*

«Перад чалавекам да розуму тры шляхі: шлях разважання — гэта самы высакародны; шлях пераймання — гэта самы лёгкі; шлях асабістага досведу — гэта самы цяжкі» (Канфуцый).

*Верыць у свае сілы.*

«У свеце няма нічога, чаго бы не мог ахапіць адораны пачуццём і розумам чалавек» (Я. А. Коменскі).

*Тварыць дабро.*

«Калі б людзі зрабілі агульным здабыткам тое, што карысна, усё, што прыносіць шчасце, свет стаў бы раем» (Т. Кампанела).

*Быць патрабавальным да сябе.*

«Чым меней чалавек задаволены сабой, тым патрэбнейшы ён для іншых людзей і тым больш бывае карысны ім» (Л. М. Талстой).

*Пастаянна працаваць.*

«Нішто лепш, чым праца, не зробіць чалавека высакародным. Без працы не можа чалавек захаваць сваю чалавечую годнасць» (Л. М. Талстой).

«Гультайства і бяздзейнасць не толькі нараджаюць невуцтва, яны ў той жа час з'яўляюцца прычынай хваробы» (Ібн Сіна).

*Любіць Радзіму.*

Пакуль свабодаю гарым,
Пакуль у сэрцах ёсць сумленне,
Мой друг, айчыне аддадзім,
Душы прыгожыя імкненні! (А. С. Пушкін; пераклаў П. Глебка.)

*Імкнуцца да самаўдасканалення.*

«Чалавек — цэлы свет, была б толькі асноўная схільнасць у ім высакародная» (Ф. М. Дастаеўскі).

«Трэба быць ясным разумова, чыстым маральна і ахайным фізічна» (А. П. Чэхаў).

«Выхаванне, атрыманае чалавекам, скончана, дасягнула сваёй мэты, калі чалавек настолькі пасталеў, што

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

валодае сілай і воляй самога сябе адукоўваць на працягу далейшага жыцця і ведае спосаб і сродкі, як ён гэта можа ажыццявіць» (Ф. А. Дыстэрвег).

*Служыць людзям, быць ім неабходным.*

«Прырода ўклала ў чалавека патрэбнасць клапаціцца аб усіх людзях» (Марк Аўрэлій).

«Толькі той адчувае радасць, хто можа блізкаму дапамагчы» (І. В. Гётэ).

*Жыць сумленна.*

«Для чалавека думка — вянец усяго жывога,
А чысціня душы ёсць быцця аснова» (Энверы).

«Сумленне — тысяча сведак» (Квінтыліян).

*Разумець людзей, выбіраць у сябры самых лепшых з іх.*

«Пазбягай людзей, якія, бачачы твае заганы і недахопы, апраўдваюць іх або нават ухваляюць» (Р. Скаварада).

*Берагчы вынікі сваёй і чужой працы.*

«Чалавек шануе толькі тое, у што ён уклаў часцінку сваёй душы, свайго сэрца» (В. А. Сухамлінскі).

Падумайце, якая з гэтых парад падыходзіць вам ужо сёння. Аргументуйце свой адказ.

4. Пазнаёмцеся з кароткім пераказам пралога п’есы «Дзівак» турэцкага пісьменніка Назыма Хікмета.

Ноч. Па беразе мора цягнецца сцяжынка. Пасярод дарогі, амаль закрываючы яе, ляжыць камень...

На дарозе паказваецца чалавек. Нягледзячы на цемру ночы, ён заўважыў камень. Абышоўшы яго, ён спыніўся, паставіў нагу на камень — так зручней — і, зашнураваўшы на чаравіках шнуркі, што развязаліся, пайшоў далей. Услед за ім па дарозе ідзе яшчэ адзін позні вандроўца. На няшчасце, ён не ўбачыў каменя, спатыкнуўся, паваліўся, выцяўся. Яму баліць; крэкчучы і лаючы тых, хто выпадкова або знарок пакінуў камень на сцяжынцы, паднімаецца ён з зямлі і працягвае свой шлях. Трэці, праходзячы па дарозе, своечасова спыніўся. Ён перанёс камень на абочыну, каб зрабіць дарожку бяспечнай для каханай, якая вось-вось павінна прайсці тут. Праз некаторы час па гэтай дарожцы рушыў

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

чацвёрты вандроўца. Яго погляд заўважыў велізарны камень на абочыне. У галаву закралася заганная думка: «А што, калі паставіць камень пасярод сцяжынкі? Ану, хто не заўважыць і натыкнецца на камень, зваліцца...» І не паленаваўся — са зларадаснасцю паднімае ён цяжкую глыбу, ставіць яе на дарогу. Яшчэ адзін чалавек ідзе ўслед за ім па дарозе. Ён своечасова ўбачыў камень, абышоў яго. Але праз некалькі крокаў ён спыніўся ў роздуме: «Там, на сцяжынцы, застаўся камень, а наперадзе яшчэ цэлая ноч. Можа здарыцца, што які-небудзь чалавек, праходзячы па дарозе, не заўважыць камень у цемры...» І, занепакоены небяспекай для іншых, ён вяртаецца назад і адцягвае камень з дарогі...

І ноч, і дарога, і камень — гэта сімвалы. «Ноч» азначае невядомасць, «дарога» — наш жыццёвы шлях, а «камень» увасабляе ўсё, што перашкаджае людзям быць шчаслівымі: галечу, хваробы, чэрствасць, злачынствы...

Што ж мы можам сказаць пра людзей, прадстаўленых Назымам Хікметам у пралогу «Дзівака»? Як мы вызначым меру маральнай каштоўнасці кожнага з іх?

5. Падрыхтуйце вуснае паведамленне на адну з наступных тэм:

а) «Роля маралі ў жыцці чалавека і грамадства»;
б) «Супярэчнасці (парадоксы) дабра і зла»;
в) «Шчасце ў жыцці чалавека»;
г) «Залатое правіла маральнасці».

6. Выкажыце пісьмова свае погляды на адно з наступных пытанняў:

а) Маральныя паводзіны сучаснага школьніка: здавацца ці быць?
б) Сумленне як рэгулятар маіх паводзін.
в) Навошта мне патрэбна мараль?

7. Практыкаванне «Самае добрае і самае дрэннае».

а) Запішыце ў сшытку ў слупок 5 самых прыемных падзей вашага жыцця. Пасля гэтага ў кожным пункце адзначце, дзякуючы каму (чаму) адбылася кожная з іх.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

б) Запішыце ў слупок 5 непрыемных падзей вашага жыцця. Пасля кожнага пункта адзначце, з-за каго (чаго) адбылася кожная з іх.

в) Зрабіце падлік:

— агульная колькасць падзей — $A$;

— падзеі, якія адбыліся дзякуючы мне, — $x$.

Знайдзіце адносіну $\frac{x}{A} \cdot 100\,\%$.

Атрыманая лічба — гэта ступень залежнасці вашага жыцця ад вашых жаданняў, ад вас саміх.

г) Якія падзеі ўспамінаць лягчэй? Чаму? З-за чаго (каго) адбылося больш падзей (прыемных і непрыемных)?

Ці згодныя вы з тым, што чым больш свабоды ў чалавека, тым больш адказнасці? Чаму?

8. Пазнаёмцеся з выказваннямі пра патрыятызм.

«Патрыёт — той, хто ў самыя цяжкія для радзімы хвіліны бярэцца за самыя цяжкія яе справы» (П. А. Паўленка).

«Ідэя, якая саграбае патрыятызм, — гэта ідэя агульнага дабра...» (М. Я. Салтыкоў-Шчадрын).

«Калі я не рушу на ворага, а размова ідзе пра выратаванне маёй радзімы, я не грамадзянін, а абывацель» (Д. Дзідро).

«Сапраўдным грамадзянінам, стойкім байцом за высокія ідэалы становіцца толькі чалавек, які ў гады дзяцінства і малалецтва авалодаў высокім мастацтвам людскасці, — навучыўся быць адданым сынам, адданай дачкой сваіх бацькоў» (В. А. Сухамлінскі).

«Кожны, хто ўнёс сваю лепту ў справу росквіту краіны фізічнай або духоўнай працай, з’яўляецца высакародным і карысным грамадзянінам» (Я. Чачот).

З чаго пачынаецца патрыятызм? І ў чым ён выяўляецца? Якое з прыведзеных выказванняў сугучнае вашым думкам?

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Урок абагульнення

1. Што складае сутнасць маралі?

2. Абапіраючыся на матэрыялы гісторыі, прасачыце змяненні маральных нормаў падчас гістарычнага развіцця.

3. У чым заключаецца ўзаемасувязь маральных нормаў, якасцей, прынцыпаў, ідэалаў? Прывядзіце прыклады з літаратуры.

4. Як уплывае ўяўленне пра шчасце на выбар чалавекам мэт свайго жыцця?

5. Прывядзіце прыклады альтруізму і эгаізму, калектывізму і індывідуалізму, патрыятызму і касмапалітызму ў сучасным грамадстве. Дайце ім маральную ацэнку.

6. У чым заключаецца небяспека групавога эгаізму? Якія маральныя ўстаноўкі можна яму супрацьпаставіць?

7. Падрыхтуйце паведамленні пра асобу, у жыцці і дзейнасці якой, на ваш погляд, найбольш ярка выявіліся патрыятычныя пачуцці да нашай Радзімы.

8. У чым вы бачыце праяву патрыятычных пачуццяў чалавека ў паўсядзённым жыцці?

9. Праслухайце паланез М. К. Агінскага «Развітанне з Радзімай». Якія пачуцці і думкі навеяў гэты твор? Што вы ведаеце пра аўтара і яго лёс?

10. Як вы разумееце словы В. А. Сухамлінскага: «Сэнс жыцця чалавека заключаецца ў тым, каб садзейнічаць сваім жыццём росквіту і развіццю чалавецтва». Ці можна на практыцы рэалізаваць такое ўяўленне пра сэнс жыцця? Што для гэтага неабходна зрабіць?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Заключэнне

Завяршаючы вывучэнне першай часткі курса грамадазнаўства, якая называецца «Чалавек і грамадства», карысна зноў вярнуцца да пытанняў пра тое, што такое чалавек, якія яго адносіны і сувязі з іншымі людзьмі ў грамадстве, якімі правіламі ён павінен кіравацца ў жыцці.

Прапануем вам правесці дыскусію на тэму «У чым заключаецца сутнасць і прызванне чалавека?».

Перш за ўсё давайце абмяркуем, што прадвызначае сутнасць чалавека.

Мы ўжо высветлілі, што асоба — гэта сацыяльная якасць чалавека. Паспрабуем вызначыць больш разгорнута, *што азначае быць асобай*.

Гісторыя — вынік дзейнасці мільёнаў людзей. *Ці можа канкрэтная асоба самастойна перавярнуць, кардынальна змяніць ход гісторыі?* Ці заўсёды рэальны ўплыў асобы на жыццё грамадства адпавядае яе задумам? Калі не, то чаму?

Чалавек становіцца асобаю ўключаючыся ў культуру, асвойваючы яе каштоўнасці і нормы. *А што такое культура? Якую ролю адыгрывае яна ў жыцці чалавека і грамадства?*

Культура ўключае ў сябе спадчыну мінулага; разам з тым яна скіравана ў будучыню. Як звязаны паміж сабой гэтыя бакі культуры? *Як адбываецца культуратворчасць?* Як можа ўплываць асобны чалавек на культуру свайго народа, сваёй гістарычнай эпохі?

Асобасныя якасці чалавека праяўляюцца перш за ўсё ў стасунках з іншымі людзьмі. *Якія асноўныя праблемы ўзнікаюць перад намі ў гэтых стасунках?* Як можна дасягнуць удалага ўрэгулявання міжасабовых канфліктаў? Як для гэтага трэба будаваць свае паводзіны?

Калі мы гутарым, сустракаемся з людзьмі, здзяйсняем учынкі, выконваем розныя дзеянні, мы выяўляем свае маральныя якасці. Нашы стасункі рэгулююцца правіламі і нормамі маралі. У сувязі з гэтым давайце вызначым, *якую ролю ў жыцці чалавека і грамадства адыгрывае мараль? Якога чалавека мы з поўным правам можам назваць маральнай асобай?*

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Духоўная аснова чалавечай асобы — гэта яе светапогляд. А *як фарміруецца светапогляд? Што такое духоўнасць і якую ролю яна адыгрывае ў жыцці людзей?*

Вырашаючы гэтыя і іншыя праблемы, вы не толькі спасцігаеце жыццё чалавека і грамадства, але і ажыццяўляеце самапазнанне. У чым, на ваш погляд, карысць ад развaг пра каштоўнасці і сэнс чалавечага жыцця, пра доўг чалавека перад грамадствам і самім сабой?

Шлях самапазнання нялёгкі і адказны. Мы жадаем вам годна прайсці па гэтым шляху, адказна рабіць свой жыццёвы выбар і стаць свядомымі будаўнікамі нашага агульнага дома — дома, у якім жыць і нам, і наступным пакаленням суайчыннікаў, грамадзян Рэспублікі Беларусь.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Слоўнік

**Альтруізм** — добраахвотная дапамога іншым людзям, гатоўнасць ахвяраваць для іх асабістымі інтарэсамі.

**Артэфакты** — вынікі чалавечай дзейнасці; штучна створаныя чалавекам прадметы і з’явы; сродкі і спосабы дзеянняў, якія ён адкрыў і выкарыстоўвае.

**Асоба** — чалавек як свядомы і адказны суб’ект дзейнасці і зносін з людзьмі.

**Вандалізм** — разбурэнне культурных каштоўнасцей.

**Гістарычны працэс** — паслядоўнасць падзей у жыцці грамадства, якая стала вынікам дзейнасці многіх пакаленняў людзей.

**Грамадства** — сукупнасць адносін паміж людзьмі, якія складваюцца ў працэсе іх сумеснай жыццядзейнасці і развіваюцца з цягам часу.

**Гуманізм** — прызнанне чалавека найвышэйшай каштоўнасцю і сцвярджэнне яго права на развіццё і выкарыстанне сваіх здольнасцей, на свабоду і шчасце.

**Дабро** — тое, што карысна людзям і спрыяе самараскрыццю і самарэалізацыі чалавека.

**Дамінуючая культура** — сукупнасць каштоўнасцей, вераванняў, традыцый і звычаяў, якімі кіруецца большасць членаў грамадства.

**Дзейнасць** — характэрнае для чалавека актыўнае, мэтанакіраванае стаўленне да навакольнага свету і да самога сябе.

**Духоўнасць** — абагульненая характарыстыка каштоўнасных арыенціраў чалавека і грамадства.

**Еўропацэнтрызм** — уяўленні пра тое, што еўрапейская культура з’яўляецца ўзорам для астатняга свету.

**Звычай** — традыцыйны сталы лад паводзін, які забяспечвае культурную і сацыяльную стабільнасць грамадства.

**Зносіны (адносіны, стасункі)** — працэс узаемадзеяння людзей, падчас якога яны абменьваюцца інфармацыяй, выяўляюць сваё стаўленне адно да аднаго.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Ідэалогія беларускай дзяржавы** — сукупнасць ідэй і ідэалаў, якія адлюстроўваюць нацыянальна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, характарызуюць асноўныя мэты сучаснага развіцця беларускага грамадства.

**Індывід** — чалавек як асобны, адзінкавы прадстаўнік чалавечага роду.

**Індывідуальнасць** — адметныя біялагічныя, псіхалагічныя і сацыяльныя ўласцівасці чалавека.

**Інтарэс** — рэальная прычына, якая ўсведамляецца намі і накіроўвае пазнавальную і практычную дзейнасць.

**Калектывізм** — згода з пазіцыяй групы ў выніку ўсвядомленага супадзення памкненняў асобы з мэтамі калектыву.

**Калектывіст** — чалавек, які ўспрымае інтарэсы сацыяльнай групы, у якую ён уключаны, як самыя каштоўныя і значныя для сябе, хвалюецца за іх.

**Калектыў** — аб'яднанне людзей, якое мае органы самакіравання, прызначана для выканання грамадска карысных задач, характарызуецца атмасферай узаемнай адказнасці і спрыяльнымі для сумеснай дзейнасці ўмовамі.

**Канфармізм** — змена паводзін людзей у выніку рэальнага або ўяўнага ціску групы.

**Канфлікт** — сутыкненне людзей, якія маюць узаемавыключальныя мэты і рэалізуюць іх на шкоду іншым.

**Касмапалітызм** — усведамленне сябе «грамадзянінам свету», а не канкрэтнай краіны.

**Каштоўнасць** — значнасць прадмета ці з'явы для чалавека.

**Контркультура** — адмаўленне прынятых у грамадстве каштоўнасцей, нормаў і правіл.

**Ксенафобія** — непрыязнасць або нянавісць да чужых поглядаў і звычаяў, боязь чужога.

**Культура** — спецыфічна чалавечы спосаб жыцця, які ўключае працэс і вынікі чалавечай дзейнасці, сістэму

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

нормаў і каштоўнасцей, знакаў і ідэалаў, разгледжаных у кантэксце гістарычнай эпохі.

**Малая група** — аб'яднанне людзей для зносін і сумеснай дзейнасці, у склад якога ўваходзіць ад 2 да 30—40 чалавек.

**Мараль** — законы чалавечых паводзін, якія выражаюць найвышэйшыя каштоўнасці чалавека як разумнай і адказнай істоты.

**Маральная ацэнка** — асуджэнне ці ўхваленне паводзін ці ўчынку, складу думак ці спосабу жыцця чалавека на аснове патрабаванняў маралі.

**Маральны ідэал** — цэласны ўзор маральных паводзін, да якога людзі імкнуцца, лічачы яго найбольш разумным, карысным, прыгожым.

**Маральны прынцып** — стратэгічная ўстаноўка чалавека ў яго стасунках з людзьмі.

**Маральныя нормы** — сфарміраваныя на працягу ўсёй гісторыі чалавечага грамадства ўяўленні пра належнае стаўленне чалавека да грамадства, іншых людзей, самога сябе.

**Маральныя паводзіны** — вынік свабоднага выбару асобы з апорай на маральную свядомасць, засвоеныя маральныя нормы і прынцыпы, сфарміраваныя якасці.

**Масавая культура** — культура, арыентаваная на патрэбнасці большасці людзей у іх паўсядзённым жыцці, свабодная ад далікатнага густу, даступная і зразумелая ўсім незалежна ад узроўню адукацыі, узросту і нацыянальнасці.

**Менталітэт** — нацыянальны характар; уклад думак асобнага чалавека або групы людзей.

**Мова** — універсальны сродак афармлення, захавання, перадачы і стварэння новых культурных каштоўнасцей.

**Навука** — спецыфічная сфера дзейнасці, мэтай якой з'яўляецца вытворчасць новых ведаў аб прыродзе і грамадстве.

**Нацыяналізм** — нацыянальны эгаізм, супрацьпастаўленне сваёй радзімы іншым краінам і народам.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Паводзіны** — рэалізацыя стаўлення чалавека да іншых людзей, грамадства і самога сябе.

**Палітыка** — сфера адносін паміж людзьмі і грамадскімі групамі, звязаных з заваёўваннем, утрыманнем і выкарыстаннем дзяржаўнай улады.

**Патрыятызм** — любоў да Радзімы (сваёй дзяржавы, народа, да тых мясцін, дзе чалавек нарадзіўся і вырас).

**Патрэбнасць** — неабходнасць у чым-небудзь, адсутнасць чаго-небудзь важнага, патрэбнага для жыцця.

**Перакананне** — цвёрдая ўпэўненасць асобы ў чым-небудзь, якая стымулюе яе дзейнічаць у адпаведнасці са сваімі поглядамі, суджэннямі пра важнае і няважнае, годнае і ганебнае.

**Практычны гуманізм** — накіраванасць на рэальныя дасягненні ў інтарэсах асобнага чалавека, канкрэтных людзей і грамадства ў цэлым.

**Праца** — усвядомленая мэтанакіраваная дзейнасць чалавека, у працэсе якой ён стварае даброты, патрэбныя для жыцця.

**Рэвалюцыя** — рэзкі, скачкападобны пераход да новага якаснага стану грамадства.

**Самаацэнка** — ацэнка асобай сваіх якасцей, здольнасцей, учынкаў.

**Сацыяльная інфармацыя** — думкі і ўяўленні, увасобленыя ў знакавых сістэмах, якія захоўваюць набытак культуры.

**Сацыяльная роля** — нарматыўна ўхвалены ўзор паводзін, які навакольныя чакаюць ад кожнага, хто займае гэту сацыяльную пазіцыю.

**Сацыяльны рытуал** — форма паводзін людзей, якая склалася гістарычна, парадкуе іх дзеянні і мае сімвалічны характар.

**Светапогляд** — абагульненае разуменне чалавекам самога сябе, навакольнага свету і сваёй сувязі са светам, якое складаецца з яго найважнейшых перакананняў.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Свядомасць** — уласцівая чалавеку здольнасць успрымаць рэчаіснасць у думках і вобразах, разумець падзеі і асэнсавана, мэтанакіравана дзейнічаць.

**Скіраванасць маралі** — сукупнасць устойлівых матываў, якія арыентуюць дзейнасць і паводзіны асобы.

**Субкультура** — падсістэма культуры, якая характарызуе лад жыцця і каштоўнасці асобнай групы.

**Сям'я** — малая сацыяльная група, члены якой звязаны шлюбнымі ці сваяцкімі адносінамі, агульнасцю побыту, узаемнай дапамогай і маральнай адказнасцю.

**Творчасць** — чалавечая дзейнасць па стварэнні прынцыпова новых матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

**Традыцыя** — культурная спадчына, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне.

**Тэмперамент** — сукупнасць індывідуальных асаблівасцей, якія надаюць адметнасць паводзінам і дзейнасці чалавека, характарызуюць ступень яго жыццёвай актыўнасці.

**Тэхніка** — сукупнасць прылад, зробленых чалавекам для змянення прыроднага асяроддзя і стварэння іншых прадметаў культуры.

**Устаноўка** — стан гатоўнасці чалавека здзейсніць што-небудзь, схільнасць да актыўных дзеянняў у пэўнай сітуацыі.

**Характар чалавека** — сукупнасць адносна ўстойлівых уласцівасцей чалавека, якія праяўляюцца ў дзейнасці і ўчынках.

**Харызма** — выключная адоранасць.

**Школа** — спецыяльна арганізаванае адукацыйнае асяроддзе, якое ўключае настаўнікаў, вучняў і сродкі навучання; установа, прызначаная для навучання і выхавання маладога пакалення.

**Шлюб** — гістарычна зменлівая форма зносін паміж мужчынам і жанчынай, праз якую грамадства парадкуе палавое жыццё і вызначае іх правы і абавязкі як мужа, жонкі, бацькі і маці.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Шчасце** — стан чалавека, звязаны з пачуццём глыбокай маральнай задаволенасці і адчуваннем паўнаты быцця.

**Эвалюцыя** — паступовыя і разам з тым істотныя змяненні ў грамадскім жыцці.

**Эгаізм** — рыса асобы, якая заключаецца ў сябелюбнасці, засяроджанасці на сваім Я, раўнадушшы да іншых людзей.

**Эканоміка** — асаблівая сфера грамадскага жыцця, якая ўключае вытворчую і звязаныя з ёй іншыя віды гаспадарчай дзейнасці, а таксама адносіны паміж людзьмі, неабходныя для яе ажыццяўлення.

**Элітарная культура** — субкультура прывілеяваных груп грамадства.

**Этнацэнтрызм** — суджэнне пра іншыя культуры з пазіцыі перавагі культуры свайго народа.

**Этыкет** — сукупнасць правіл знешняга праяўлення стаўлення да людзей.

**«Я-канцэпцыя»** — адносна ўстойлівая сістэма ўяўленняў чалавека пра самога сябе.

Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Літаратура для дадатковага чытання

## Тэма 1. Грамадская сутнасць чалавека

1. *Божанов, В. А.* Конституция Республики Беларусь и права человека / В. А. Божанов. — Минск, 2000.

2. *Наумова, С. А.* Что надо знать о политике : пособие для учащихся средних школ / С. А. Наумова. — Минск, 1997.

3. *Прашчыцкая, Л. М.* Маё прафесійнае будучае / Л. М. Прашчыцкая. — Мінск, 2007.

4. *Сизанов, А. Н.* Проблемы семьи и брака : школьный практикум / А. Н. Сизанов. — Минск, 1993.

5. *Яковец, Ю. В.* История цивилизаций / Ю. В. Яковец. — М., 1995.

## Тэма 2. Культура чалавека і грамадства

1. Белорусы : сб. ст. — М., 1998.

2. Западные молодежные субкультуры 80-х годов. — М., 1990

3. *Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. — Мінск, 2000.

4. Мировая культура: традиции и современность. — М., 1992.

5. *Петров, А. Н.* Запад — Восток. Из истории идей и вещей / А. Н. Петров. — М., 1996.

6. Чалавек і грамадства : энцыклапедычны даведнік. — Мінск, 1998.

7. *Эфенмсон, В. П.* Загадка гениальности / В. П. Эфенмсон. — М., 1991

## Тэма 3. Міжасабовыя зносіны

1. *Дерябо, С. Д.* Гроссмейстер общения / С. Д. Дерябко, В. А. Ясвин. —М., 1996.

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

2. *Ліцьвінка, В. Д.* Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. — Мінск, 1998.

3. *Лозка, А. Ю.* Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. — Мінск, 2002.

4. *Платонов, К. К.* Занимательная психология / К. К. Платонов. — СПб., 1997.

5. *Рогов, Е. И.* Как стать взрослым / Е. И. Рогов. — М., 2003.

## Тэма 4. Чалавек і маральнасць

1. *Зеленкова, И. Л.* Этика. / И. Л. Зеленкова, Е. В. Беляева. — Минск, 2001.

2. Словарь по этике. — М., 1981.

3. Этика / под ред. Т. В. Мишаткиной. — Минск, 1997.

4. *Фукс, Э.* Иллюстрированная история нравов : в 3 т. / Э. Фукс — М., 1997.

5. *Швейцер, А.* Культура и этика / А. Швейцер. — М., 1997.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Змест

**Уводзіны** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**Тэма 1. Грамадская сутнасць чалавека** . . . . . . . . . . . . . . . . 8

§ 1. Чалавек як асоба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
§ 2. Характар і тэмперамент чалавека. . . . . . . . . . . 15
§ 3. Скіраванасць асобы. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
§ 4. Духоўны свет чалавека. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
§ 5. Узаемасувязь чалавека і грамадства. . . . . . . . . 36
§ 6. Чалавек і гісторыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
§ 7. Рэальны гуманізм . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51

Практыкум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59

Урок абагульнення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63

**Тэма 2. Культура чалавека і грамадства** . . . . . . . . . . . . . . 65

§ 8. Роля культуры ў жыцці грамадства. . . . . . . . . 65
§ 9. Грані культуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
§ 10. Пераемнасць у развіцці культуры . . . . . . . . . . 79
§ 11. Творчы характар культуры . . . . . . . . . . . . . . . . 85
§ 12. Дыялог культур. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
§ 13. Асваенне чалавекам культуры . . . . . . . . . . . . 102

Практыкум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109

Урок абагульнення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114

**Тэма 3. Міжасабовыя зносіны** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115

§ 14. Роля зносін у жыцці людзей. . . . . . . . . . . . . . 115
§ 15. Узаемадзеянне з навакольнымі людзьмі . . . . 121
§ 16. Зносіны ў малых групах . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
§ 17. Сацыяльная арыентацыя асобы . . . . . . . . . . . 133
§ 18. Канфліктныя і бесканфліктныя паводзіны . . 138
§ 19. Культура зносін. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Практыкум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151

Урок абагульнення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155

**Тэма 4. Чалавек і маральнасць** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157

§ 20. Асноўныя паняцці маралі . . . . . . . . . . . . . . . . 157
§ 21. Маральныя каштоўнасці . . . . . . . . . . . . . . . . . 164
§ 22. Маральныя нормы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 171
§ 23. Маральныя адносіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 176
§ 24. Маральныя паводзіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183

Практыкум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189

Урок абагульнення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 195

**Заключэнне** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196

**Слоўнік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 198

**Літаратура для дадатковага чытання** . . . . . . . . . . . . . . . 204

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

(Назва і нумар школы)

| Наву-чаль-ны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атры-манні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Вішнеўскі** Міхаіл Іванавіч
**Гірына** Валянціна Мікалаеўна
**Данілевіч** Сяргей Аляксандравіч і інш.

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

Вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй М. І. Вішнеўскага

Рэдактар *М. В. Супрунчук*
Мастак вокладкі *В. К. Жалудкова*
Мастацкія рэдактары *В. А. Праходская, К. К. Шастоўскі*
Тэхнічныя рэдактары *Т. К. Слаута, Н. М. Хаманеева*
Камп’ютэрны набор *М. В. Супрунчук, Н. М. Хаманеева*
Камп’ютэрная вёрстка *Н. М. Хаманеева*
Карэктар *Т. К. Слаута*

Падпісана ў друк 22.06.2009. Фармат 60×90 1/16.
Папера афсетная № 1. Гарнітура школьная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13. Ул.-выд. арк. 9,2. Тыраж 28680. Заказ .

РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
ЛВ № 02330/0131935 ад 10.04.2007. Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Надрукавана ў Вытворчым рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.


АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"